МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Кафедра «Філасофскіх вучэнняў»

# Філасофія і метадалогія навукі

дапаможнік
для студэнтаў, слухачоў, якія асвойваюць змест адукацыйнай
праграмы вышэйшай адукацыі II ступені
ўсіх спецыяльнасцяў

**М і н с к 2.0.1.8.**

УДК 539.3(075.8)

**А у т а р ы :**
А.І. Лойка

**Р э ц э н з е н т ы :**
С.В. Маслінчанка загагадчык кафедры філасофіі і ідэялагічнай працы Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, кандыдат культуралогіі, дацэнт.

У дапаможніку выкладзены тэарэтычны і практычны матэрыял па філасофіі і метадалогіі навукі, неабходны для падрыхтоўкі да экзамену, прыведзены спіс дадатковай літаратуры для самастойнай навукова – даследчай працы студэнтаў.

Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт
пр-т Незалежнасці, 65, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь
Тел.(017)292-77-52 факс (017)292-91-37
E-mail: bntu@bntu.by

© Лойка А.І., 2018
© БНТУ, 2018

## ЗМЕСТ

**Уводзіны** ........ 4
**1. Тэарэтычны раздзел. Філасофія і каштоўнасці сучаснай цывілізацыі** ........ 4
1.1. Філасофія ў вытокаў духоўнай традыцыі Беларусі ........ 4
1.2. Дыялагічна-палемічны характар філасофіі Беларусі Адраджэння і Рэфармацыі ........ 12
1.3. Другая схаластыка на Беларусі ........ 21
1.4. Тэалагічная філасофія Беларусі XVIII - першай паловы XIX стагоддзяў ........ 25
1.5. Нямецкая класічная філасофія ў інтэлектуальнай прасторы Беларусі ........ 29
1.6. Тэалагічная філасофія Беларусі на пераломе гістарычных эпохаў ........ 32
1.7. Дыскурс рускай рэлігійнай філасофіі ........ 34
**2. Практычны раздзел. Метадалогія крэатыўнай дзейнасці і творчасці** ........ 38
2.1. Дыялог філасофіі і архітэктуры ў культурнай традыцыі Беларусі ........ 39
2.2. Філасофія і беларуская літаратура ........ 61
2.3. Філасофія і дыскурс універсітэцкай навукі ........ 73
2.4. Даследчая накіраванасць акадэмічнай філасофіі ........ 82
**3. Практычны раздзел. Філасофія і сацыяльная інжынерыя** 84
3.1. Філасофія ў структуры юрыдычнага дыскурсу ........ 84
3.2. Філасофія і дыскурс эканамічных навук ........ 92
3.3. Філасофія кіравання і эканамічны дыскурс менеджменту, маркетынгу, лагістыкі ........ 95
3.4. Філасофія і камунікатыўная кампанента грамадства ........ 100
3.5. Філасофія ў функцыі метадалагічнага забеспячэння інжынернай дзейнасці ........ 104
3.6. Філасофія гуманізму і сацыяльныя тэхналогіі гістарычнай памяці ........ 113
3.7. Філасофія чалавечай цялеснасці: метадалогія фізічнага выхавання і спартыўна-тэхнічнай дзейнасці ........ 115
3.8 Філасофія і метадалогія кагнітыўных навук ........ 119
3.9 Філасофія бяспекі і ўстойлівае развіцце грамадства: рызыкі сучаснай інжынерыі ........ 129
**Заключэнне** ........ 133
**Спіс літаратуры** ........ 134

# Уводзіны

Студэнты і магістранты вывучаюць агульнаадукацыйныя прадметы пад назвай «Філасофія» і «Філасофія і метадалогія навукі». У дапаможніку даецца матэрыял, які на прыкладзе беларускай культуры, навукі, інжынернай, эканамічнай, юрыдычнай дзейнасці, журналістыкі дэманструе практыкаарыентаваную накіраванасць філасофіі і метадалогіі навукі. Разглядаюцца пытанні, звязаныя з сацыяльнай функцыяй філасофіі ў сучасным грамадстве і культуры. Тэма актуальная ва ўмовах аднаўлення ролі духоунасці, вяртання да традыцыяў хрысціянскай веры, барацьбы за каштоўнасці маралі, прававой бяспекі. Беларуская дзяржава вядзе актыўны дыялог з праваслаўнай царквой і каталіцкім касцелам па пытаннях сацыяльнай працы, духоўнасці. Атрымаўшы дыплом магістра выпускнікі навучальных устаноў атрымліваюць доступ да кіраўнічых пасадаў, дзе сучасны тэхнакратызм цесна звязаны з сацыяльнымі і духоўнымі пытаннямі ў прыняцці рашэнняў. Гэтыя пытанні праламляюцца цераз адметнасці нацыянальнай ментальнасці і традыцыі. Філасофія і метадалогія навукі фарміруе культуру сістэмнага ўліку розных фактараў пад час прыняцця рашэнняў. Важная роля ў сучасным грамадстве адводзіцца эфектыўнаму выкарыстанню метадалогіі даследчай і канструктарскай дзейнасці. Асаблівасці інавацыйнай дзейнасці разглядаюцца ва ўмовах рынкавай эканомікі Беларусі. Адкрытасць эканомікі патрабуе веданне тэндэнцый навукова-тэхнічнага прагрэсу ў форме прамысловых рэвалюцый, мадэрнізацыі і суправаджаючых іх канцэпцый, канвергенцыі інжынерна-тэхнічных накірункау даследча-канструктарскай дзейнасці на прыкладзе беларускіх навуковых школау.

## 1. Тэарэтычны раздзел. Філасофія і каштоўнасці сучаснай цывілізацыі

### *1.1. Філасофія ў вытокаў духоўнай традыцыі Беларусі*

Духоўнасць і культура зфарміравалі сукупнасць рэлігійных і нацыянальных традыцый чалавецтва, у тым ліку і Беларусі. Глабальныя працэсы аддаюць перавагу мадэрнізацыі грамадства, эканомікі, вобразу жыцця сучаснага чалавека, яго светапогляду. Хуткія перамены пагражаюць парушыць раунавагу паміж традыцыяй і сучаснасцю, паміж гістарычнай памяццю і трансфармацыямі вобразу

жыцця пад уплывам сучасных тэхналогіяў. Актуальна ведаць эвалюцыю грамадства ва ўмовах духоуных і культурных фактараў. Беларусь пасля прыняцця хрысціянства накапіла ўнікальны вопыт узаемадзеяння духоўнасці і культуры.

Айчынная філасофія ўзнікла на выснове тэматыкі Біблії. Кніга ў дадзеным выпадку не мела друкаванай мадыфікацыі, паколькі тэхналогіі друкавання тэкстаў былі распрацаваны пад час позняга Сярэднявечча. Распаўсюджаннем кніг займаліся перапісчыкі. У якім бы выглядзе ня быў тэкст ен заставаўся кнігай. Біблія стала высновай філасофскага дыскурсу на Беларусі па той прычыне, што краіна стала часткай хрысціянскага свету.

К моманту прыняцця хрысціянства насельніцтва Беларусі актыўна карысталася пісьменнасцю. Даволі высокі ўзровень адукаванасці быў абумоўлены актыунымі гандлевымі шляхамі. што пралягалі па тэрыторыі краіны. Гандлевы шлях з варагаў у грэкі патрабаваў ведання пісьмовай мовы, паколькі заключаліся гандлевыя і ваенна-палітычныя пагадненні. Граматнасць была неабходна насельнцтву ў паўсядзенных справах, аб чым сведчаць берасцяныя граматы, надпісы на камянях уздоўж гандлевых рачных шляхоў. З прыняццем хрысціянства беларусы атрымалі магчымасць чытаць тэкст Біблії, а таксама тэксты візантыйскага і балгарскага паходжання. Аўтары гэтых тэкстаў пастаянна спасылаліся на аўтарытэт антычных мысляроў, у першую чаргу, на творы Арыстоцеля. Менавіта філасофія гэтага мысляра аказалася ў фундаменце аднаго з першых дыскурсаў філасофскай традыцыі Беларусі. Маецца на ўвазе інстытуцыянальная мова тэалагічнага дыскурсу. Прычынай успрыняцця арыстоцелізму стаў вельмі блізкі беларускаму адукаванаму грамадству схаластычны рацыяналізм. Яго адметнасць заключаецца ў тым, што ен аказаўся прымальным для розных гістарычных эпох на тэрыторыі Беларусі.

На традыцыі грэка-праваслаунай мадыфікацыі арыстоцелізму адбылося станаўленне К. Смалятыча, К. Тураўскага, Е. Полацкай. Напісаныя імі тэксты адпавядаюць жанру тэалагічнага дыскурсу. Гэты дыскурс быў распрацаваны на выснове мовы грэкаў у Александрыі. Тут адбыўся сінтэз яўрэйскай і хрысціянскай традыцыі з антычнай філасофіяй. У Александрыі была, значная па колькасці, абшчына яўрэяў, была багатая нтэлектуальная традыцыя перакладаў твораў на мову грэкаў. Паколькі хрысціянства абапіралася на аўтарытэт тэкстаў, то вынікам стала Біблія, а таксама разу-

менне таго, што тэалогія і філасофія павінны быць звязаны. Хрысціянства пазіцыяніравалася як рэлігія адукаванага грамадства.

Філасофія Арыстоцеля найбольш адпавядала гэтаму тэзісу. Яе прыняццю папярэднічала падрыхтоўчая праца, звязаная з сінтэзам тэалагічнага і філасофскага антычнага дыскурсаў. Гэты сінтэз адбыўся ў межах Рымскай імперыі. У заходняй яе частцы пераважала лацінская мова. Цэнтр фарміравання тэалагічнага дыскурсу на лацінскай мове знаходзіўся ў паўночнай Афрыцы ў Карфагене. Спачатку мысляры прытрымліваліся падыходу, фактычна выключаўшага філасофскую рацыянальную кампаненту. Перамены ў разуменні зместу тэалагічнага дыскурсу ўнес А.М.С. Баэцый. Ен абгрунтаваў тэалагічны дыскурс, заснаваны на адукацыйным рацыяналізме. З гэтай мэтай ен зрабіў шмат перакладаў твораў антычных аутараў на лацінскую мову. Асаблівую вагу ен надаваў творам Арыстоцеля. Ім была абгрунтавана ідэя, згодна якой пазнанне вольных навук спрыяе разуменню Святога пісання. У першую групу вольных навук увайшлі граматыка, рыторыка, дыялектыка (trivium). У другую групу вольных навук увайшлі арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка (quadrivium). Яны мелі большае дачыненне да навук аб прыродзе. Менавіта гэтая класіфікацыя легла ў выснову сістэмы адукацыі Цывілізацыі Сярэдневяковага Захаду.

Ва ўсходняй частцы Рымскай імперыі тэалагічны дыскурс распрацоўваўся на выснове мовы грэкау. Выключную ролю адыгралі творы Д. Арэапагіта. Яны былі прадстаўлены ў 532 годзе на Канстанцінопальскім царкоўным саборы. У іх пераважаюць канцэпты Бога, веры, Хрыста, Троіцы, Адзінага, прадвызначанасці, нябеснай іерархіі, царкоунай іерархіі, боскага імя, містычнай тэалогіі, богапазнання, эманацыі. У іх выкладзена метафізіка Сусвету. Яна пабудавана на прынцыпе іерархіі пачуццевай і звышпачуццевай існасці, нязменна прабываючай у вечнасці. І. Дамаскін у творах «Святыя паралелі», «Аб прыродзе чалавека», «Тры словы супраць адмаўляючых іконы», «Крыніца ведаў» ажыццявіў дэталізацыю метафізікі Сусвету. У яго інтэрпрэтацыі тэалогіі аднолькава прадстаулены спасылкі на фласофію Платона і Арыстоцеля. Ім абгрунтавана эстэтычная тэорыя візуальнага ўспрыняцця хрысціянскага культу на выснове жывапісу, мастацкіх выяў, якія існуюць для адлюстравання сутнаснага боку тэалагічных пасылак.

М. Псел у структуры тэалогіі перавагу аддаў адукаванаму рацыяналізму. Ен меркавау, што пазнанне сутнасці і звышсутнасці

можа абапірацца на матэматычныя і лагічныя доказы. Тэалогія, на яго думку, павінна мець статус дакладных ведаў. Гэтая думка праводзіцца ў творах «Хранаграфія», «Аб усялякай навуцы». Творчасць М. Псела мела месца ў XI стагоддзі. Гэта важная абставіна з пункту гледжання на працэсы станаулення тэалагчнага дыскурсу на Беларусі. Яна сведчыць аб тым, што на ўзроуні царкоўнай патрыстыкі гэтага перыяду ў межах Беларусі ўзнікла атмасфера дыялогу грэкаў і беларусаў на высновах тэалогіі адукаванага рацыяналізму, блізкага арыстоцелізму. Гэты рацыяналзм аказаўся ўспрынятым адукаваным беларускім грамадствам і атрымаў распаусюджанне. Адным з першых твораў, прысвечаных філасофіі Арыстоцеля, напісаным на царкоўнаславянскай мове стаў «Шасцідзен» І.Э. Балгарскага. У ім даецца агляд даследаванняў Арыстоцеля па астраноміі, батаніцы, геаграфіі, анатоміі, заалогіі. Падрабязныя звесткі аб фізіцы Арыстоцеля ўтрымліваюцца ў творах І. Дамаскіна. Згодна гэтай фізікі Зямля круглая. Вакол яе рухаюцца планеты, Сонца, Месяц. Прырода ў выснове сфармавана чатырма элементамі – вадой, зямлей, паветрам, агнем.

Высокі ўзровень граматнасці насельніцтва Беларусі абумовіў арытоцелеускі падыход айчынных мысляроў да феномену Бібліі. Тэкставыя рэсурсы яе разглядаліся ў шырокім кантэксце глыбінных зместау, якія трэба было знайсці дзякуючы Бібліі. Па гэтай прычыне важная роля надавалася інтэрпрэтацыі тэкстаў Бібліі ў жанрах алегорыі, прытчы, малітвы, павучання. Падобныя формы стваралі магчымасць для пашырэння тэкставай прасторы арыстоцелізму. Пры гэтым прагматыка дзейнасці мысляроў заключалася ў мэце паказаць хрысціянства як рэлігію адукаванага рацыяналізму, захоўваючую традыцыі адукаванага грамадства. Найбольш яскрава з гэтай задачай справіуся К. Смалятыч, які прадставіў хрысціянства як аутэнтычную традыцыю Беларусі. Ен прадстаўляў царкоўную плынь, якая лічыла, што хрысціянства набыло на Беларусі самастойны статус.

К. Смалятыч стаў адным з першых айчынных мысляроў і стваральнікаў тэалагічнай культуры адукаванага рацыяналізму, меушага грэка-візантыйскую выснову. З беларускіх даследчыкаў аналіз яго творчасці ажыццявіў А.А. Козял.

К. Смалятыч нарадзіўся ва Ўсходняй Беларусі. Жыу на мяжы XI-XII стагоддзяў. Займаў пасаду мітрапаліта Кіеўскага (1147-1155 гады). Да нашага часу дайшло только некалькі твораў К. Смалятыча.

У выснову філасофскіх разважанняў мысляра пакладзена тэма адносіны да тэкстаў антычнай філасофіі і ветхазапаветнай традыцыі. Асноўная ўвага надаецца тэксту Бібліі. Асаблівы акцэнт робіцца на выяўленне схаванага ў ей глыбіннага зместу, які непасрэдна не чытаецца. Містычна-тэалагічны акцэнт звязаны з разглядам прынцыпа прадвызначанасці і яго ролі ў рашэнні праблемы грахоўнасці і ратунку. Даследуецца этычная тэматыка, акцэнтаваная на асуджэнні злоужывання матэрыяльнымі інтарэсамі. Багацце не павінна дамінаваць як мэта жыцця. Пры гэтым багацце ня трэба змешваць са славай. Веруючы мае на яе права. Гэтае разважанне было арыентавана на адукаваную частку грамадства, якой трэба было зразумець суадносіну паміж сціпласцю і сацыяльнай актыўнасцю.

К. Смалятыч лічыць магчымым пад час хрысцінскага разважання звяртанне да антычнай мудрасці, паколькі там можна знайсці змест прымальны для хрысціянства. Гэтаму абгрунтаванню спрыяў прынцып боскай прадвызаначанасці. З яго вынікала, што ўсе існуючае ў свеце мэтазгодна, у тым ліку антычная мудрасць.

К. Смалятыч выпрацаваў канцэпцыю біблеістыкі, згодна якой перавагу пры працы з тэкстамі Святога пісання трэба аддаваць вобразна-сімвалічнаму метаду. Гэты метад дазваляе выкарыстоуваць біблейскія сюжэты ў мэтах выяўлення схаваных у іх сэнсаў. Тэкст трэба не толькі ўмець чытаць, але і выкарыстоўваць для абагачэння ўласнага духоунага свету. У такіх умовах розум атрымлівае магчымасць для інтэлектуальнай працы. Этычныя аспекты жыцця чалавека звязваюцца з верай, любоўю, цярпеннем, міластыняй. Чалавек не павінен ахвяраваць целам. Аскеза павінна спалучацца з фізічным існаваннем асобы ў сацыяльнай прасторы. У сваіх разважаннях К. Смалятыч спасылаецца на творы Арыстоцеля і Платона. Перавага аддаецца Арыстоцелю. Найбольш значны з боку філасофскага разгляду твор К. Смалятыча пад назвай «Пасланне прасвітару Тамашу». Ключавы канцэпт твора – «Бог», паколькі ўсе ў свеце ўладкоўваецца і падтрымліваецца боскай сілай. Божа ўсе бачыць, мудра кіруе людзьмі, накіроўвае іх і дае гарантыю паратунку пры адпаведных паводзінах. Веруючы, як паказвае гэта К. Смалятыч, можа пазнаваць сутнасці найвышэйшай глыбіні Пісання цераз метафарычныя параўнанні аповяды. К. Смалятыч сцвярджае, што ен сам пры пазнанні Пісання выклаў шаснаццаць аповядаў, якіх непасрэна няма ў Пісанні, але якія дазваляюць больш глыбока зразумець яго. Разумовыя здольнасці адыгрываюць вялікую ролю ва ўмацаванні

веры. Развіваць іх трэба пазнаючы створаны Богам свет. Цераз вынікі боскіх стваральных спраў пазнаецца сам Божа. Пачуцці маюць дачыненне да веры, іх задача не пазнавальная. Дзякуючы розуму, пазнаючаму навакольны свет, існасць чалавека авалодвае тапанімікай быцця на Зямлі. У гэтай тапаніміцы схавана сутнасць жыцця. Праведным веруючым яна бачна і яны яе прытрымліваюцца. Некаторым яна бачная, але яны няздольны яе прытрымлівацца. Праблема закладзена ў іх здольнасці не толькі разумець сутнасць і прысутнасць Бога, але і карыстацца дадзенай ім Богам свабодай. Хрыстос даў людзям магчымасць выбраць Благадаць цераз разуменне жыццевага шляху на Зямлі. Такім чынам, тэкст, напісаны ў аутарскай рэдакцыі К. Смалятыча факусіруецца на прагматыцы чалавека. Тэалагічны дыскурс выводзіцца ў прастору антрапалагічнай тэматыкі. Веруючы, дзякуючы гэтаму, ведае для чаго яму патрэбна вера і якая прагматыка суправаджае духоўнае жыцце. Эпістэмалогія становіца важнай перадумовай сацыялізацыі асобы.

Адначасова з дзейнасцю К. Смалятыча мела месца дзейнасць К. Тураўскага (1130-1193). Ен нарадзіўся ў Тураве, які быў цэнтрам княства. Адпаведна статусу была развітая эканоміка, адукацыя, інфраструктура манастыроў. Мелі месца інтэнсіўныя адносіны з Візантыяй. Кірыла паходзіў з заможнай сям’і. Але перавагу ен аддаў духоўнай дзейнасці. Ен займаў высокія пасады і падобна К. Смалятычу з’яўляецца прадстаўніком патрыстыкі. Яго творчасць лепш даследавана, паколькі гэтаму спрыяе абставіна, звязаная з тым, што да нашага часу дайшлі яго шматлікія творы. Іх крыніцай з яўляецца Біблія. Аўтарскім працягам яе сталі казанні, прытчы, пасланні, малітвы, каноны. Творы добра захаваліся дзякуючы таму, што іх уключалі ў свае выданні вядомыя айчынныя друкары. Напрыканцы XIX стагоддзя біскупам Тураўскім быў выдадзены поўны збор твораў К. Тураўскага. Творчасць мысляра стала прадметам даследавання ў жанрах розных дыскурсаў. Мы разглядаем творы К. Тураўскага ў межах тэалагічна-тэкставага дыскурсу. Адпаведна гэтаму дыскурсу ў творах мысляра дамінуюць канцэпты Бога, Тройцы, Хрыста, Святога Пісання, веры.

К. Тураўскі пісаў творы ў жанры чалавека, веўшага пастаянны дыялог з апанентамі. Гэта тэкст, арыентаваны не на жанр маналогу, а дыялогу, у якім уступнае слова вырашае поспех камунікацыі. Акцэнт робіцца на лінгвістычныя аспекты ўзмацнення тэксту стылістыкай слова. Гэтая методыка, на думку К. Тураўскага, больш

паспяховая чым лагічныя довады і абгрунтаванні. Зыходзячы з поглядаў І. Златавуста, В. Вялікага, Я. Сірына, М. Споведніка. К. Тураўскі перавагу аддаваў містычнай кампаненце тэалогіі ў разуменні Бога. Ен лічыць, што Бог не пазнавальны ў катэгоркатэгорыях рацыянальнага разумення. Ен пазнавальны цераз створаны ім навакольны свет. Так, назіранне за веснавым абуджэннем прыроды азначае назіранне за светам створаным Богам. Моц боскай задумы можа дэманстраваць творца тэкста. У ім павінна дамінаваць сіла слова. Сімвалічнае тлумачэнне Бібліі ў форме прытчаў дае магчымасць распавесці змест канцэптаў веры, цела, душы, духа, пазнання, чалавека. Пааасобнага зместу ў іх няшмат. Разгортнутая сутнасць узнікае як толькі вернік дасягае разумення розніцы паміж дабром і злом. Ен пачынае разумець розніцу паміж сітуацыяй граху, не заснаванага на веданні і грахоўным дзеяннем, дапушчаным ва ўмовах ведання мяжы паміж праведным і няправедным учынкам.

К. Тураўскі дае вернікам параду якія кнігі ім чытаць для таго каб умацаваць свой унутраны духоўны свет. Ен карыстаецца дыялектыкай матэрыяльнага і духоўнага, цялеснага і свядомага. Цела дадзена чалавеку як тэст. Калі ен з гэтым тэстам не спрауляецца, то трапляе ў пастку грахоўнай асалоды. Дапамагчы ў гэтым тэсце могуць малітвы, якія ствараюць атмасферу дыялога з Богам і перманентнай прысутнасці яго ў хранатопе паусядзеннасці. Прытчы даюць верніку карціну сусветнай дымікі, у якую ўключана жыцце асобы. Яны маюць павучальны характар. Так, «Прытча пра чалавечую душу і цела, альбо пра сляпца і храмца» паказвае, што ўсе элементы Сусвету маюць па задумцы Бога сінэргію. Без яе, паасобку, яны дэманструюць сітуацыі праблемных паводзін людзей з элементамі вялікага граху ў выглядзе крадзяжу і забойства. Недасканаласць чалавечых паводзін не азначае адсутнасці надзеі на дасягненне вернікамі боскай благадаці. Важную ролю адыгрывае паўсядзенная тлумачальная праца і жаданне вернікаў мець дачыненне да малітваў і царкоўных святаў. Менавіта па гэтай прычыне казанні К. Тураўскага маюць прадметам велікодны цыкл нядзельных і святочных дзён. Кожнае з іх пераследуе дакладную выхаваўчую мэту. На яго думку, нельга змешваць бытавое і сапраўднае хрысціянства, ідучае ад патрыстыкі. Адначасова трэба цярпіма адносіцца да стаўшага ў беларускай тапаніміцы аутэнтычным хрысціянства. К. Тураўскі ўлічвау фактар сінтазу розных культурных традыцый. У гэтым сінтазу мела месца народная традыцыя і інтэлектуальная традыцыя

антычных грэкау. Памяркоунасць стала важнай адметнасцю мысляра. Яна легла ў выснову інтэлектуальнай культуры Беларусі.

Адукаваныя людзі абавязаныя навучаць тых, хто побач. Галоўнае не трапіць у пастку ганарлівасці. Тых, хто трапіў у гэтую пастку Божа пазбаўляе інтэлектуальных здольнасцей. Як прадстаўнік патрыстыкі К. Тураўскі важную ролю адводзіу святарам, іх адукаванасці, каб яны адпавядалі адукаванаму грамадству, бо нават уладары, паводле яго слоў, імкнуцца да ведаў. Адукаванасць прадугледжвае валоданне словам, даступным пісьмом, ясным розумам. Галоўнае пазбавіцца ад грубасці мовы, путанасці розуму. Дыялогу з людзьмі спрыяе сціпласць і пакаянне. Духоўная праца і добрыя справы вынікаюць з духоўнага вобразу жыцця. Галоўнае ўпэуніць вернікаў адмовіцца ад грахоўных учынкаў і непрыстойных паводзін у выглядзе п'янства, пераядання, пералюбства, гняўлівасці, зайздрасці, паклёпніцтва, ліхвярства. Правядны вобраз жыцця патрабу стрыманасці, міласэрнасці, шанавання людзей, трымання пастоў, спагадлівасці, чуллівасці. Мысляр асобна пералічыў канцэпцы, якія складаюць змест граха: паклёп, абразы, асуджэнне, гняўлівасць, сваркі, бойкі, зайздрасць, варажнечу, злыя задумы, запоі, крадзёж, рабаванне, разбой, душагубства, чарадзействы, пералюбствы.

Альтэрнатыва злу прадстаулена ў выглядзе добрых нораваў, намераў, павагі, клопату пра сірат. Блізкая па сутнасці патрыстыцы схаластыка знайшла ўвасабленне на Беларусі дзякуючы Е. Полацкай. Яна нарадзілася ў 1101 годзе ў Полацку. Паходзіла з княскай сям’і. Пад уплывам біяграфіі Е. Александрыйскай адмовілася ад свецкага жыцця і аддала перавагу духоўнаму жыццю. У дванаццаць гадоў прыняла манаскі пастрыг. У манастырах Полацка было шмат рукапісаў твораў, у асноуным на грэчаскай мове. Е. Полацкая прытрымлівалася тэалагічна-тэкставага дыскурсу. У напісаных ей тэкстах пераважаюць такія канцэпты, як Бог, Пісанне, Хрыстос, вера, любоў, адукацыя. У яе практычнай дзейнасці адчуваецца вялікі ўплыу арыстоцелізму. Яна пісала павучэнні, малітвы. Рабіла пераклады. Мэта гэтай дзейнасці заключалася ў хрысціянскім гуманізме. Ей хацелася каб вернікі мелі добрае сэрца, пазбягалі зайдрасці, раздораў, злых страсцей, каб іх мэтай было дабро.

Хрысціянскі гуманізм магчымы быу толькі на выснове адукаванасці. З гэтай мэтай Е. Полацкая заснавала жаночы і мужчынскі манастыры са скрыпторыямі. З іх распаўсюджваліся пісаныя кнігі, на

выснове якіх распаусюджвалася пісьменнасць. У царкоўных школах дзеці розных саслоўяў вучыліся на царкоўнаславянскай і грэчаскай мовах. У якасці прадметау былі рыторыка, медыцына, гісторыя, паэтыка. Е. Полацкая спрыяла росквіту полацкай архітэктурнай школы. Пры яе мецэнацкім удзеле Іаан пабудаваў храм, які стаў называцца ў яе гонар. Пры яе арганізацыйным удзеле Л. Богша зга-таваў крыж, які стау нацыянальнай рэліквіяй Беларусі.

Яна імкнулася трапіць у Святыя месцы. Дзеля гэтага напрыканцы свайго жыцця ажыццявіла хаджэнне на Блізкі Ўсход, у Ерусалім. Аб гэтым распявядае «Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і Найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў горадзе Полацку. Багаславі, Ойча!». Е. Полацкая стала першай жанчынай кананізаванай праваслаўнай царквой. Гэтая падзея адбылася ў 1547 годзе.

Татара-мангольскае нашэсце разбурыла гістарычныя сувязі праваслаўнай Беларусі з Візантыяй і ідучым цераз яе антычным наследаваннем. Спецыфіка філасофскай культуры перыяду першай схаластыкі заключалася ў тым, што яе прадстаўляла невялікая колькасць багасловаў, займаўшых высокія царкоўныя пасады. Не паспеў сфарміравацца рэпрадуктыўны механізм інтэлектуальнай дзейнасці на выснове грэка-візантыйскай схаластыкі. Захоп туркамі-сельджукамі Візантыі вымусіў праваслаўныя абшчыны Беларусі засяродзіцца на ўласных задачах адаптацыі да цывілізацыйных выклікаў. Каштоўнасці адукацыі віталіся, але магчымасці былі абмежаванымі. Ва ўмовах абмежаваных магчымасцяў функцыянавалі толькі брацкія школы пачатковай адукацыі.

### *1.2. Дыялагічна-палемічны характар філасофіі Беларусі Адраджэння і Рэфармацыі*

Татара-мангольскае нашэсце вымусіла беларускія княствы шукаць больш цеснай сувязі з суседнімі літоўскімі пляменамі. У выніку дасягнутага кансэнсусу палітычных інтарэсаў узнікла Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае. Князь Міндаўг каранаваўся на караля з благаславення папы рымскага. Ен гэта зрабіў па чыста палітычным прычынам, абумоўленым пагрозай нападзення Тэўтонскага ордэну. Але гэты палітычны крок не паўплываў на рыцараў, якія не хацелі прызнаваць дзяржаву беларусау і літоўцаў як цывілізаваную. Нягледзячы на палітычныя цяжкасці Беларусь

інтэгравалася ў еўрапейскую гаспадарку і характэрны для яе падзел працы.

Гандлевыя сувязі забяспечвала Ганза. Купецкія абшчыны каталікоў з явіліся ў Полацкай зямлі ўжо ў XIII стагоддзі. Дзякуючы гандлевым адносінам з Ганзой склалася практыка заключэння пагадненняў нямецкіх купцоў з гарадскімі ўладамі Полацка, Віцебска, Смаленска. Тэксты гэтых пагадненняў утрымліваюць тыповыя адметнасці старабеларускай мовы. Гарады з яуляліся цэнтрамі княстваў. Пры ўваходзе ў склад ВКЛ яны захавалі сваю аўтаномію і гандлевыя прывілеі. Складваліся перадумовы для асобага статусу гарадоў у дзяржаве. Па прыкладу еурапейскіх дзяржаў беларускія гарады замацавалі свой інстытуцыянальны статус на выснове Магдэбургскага права.

Як толькі ВКЛ заключыла з каралеўствам Польскім Крэўскую дзяржаўную ўнію Ягайла стаў актыўна спрыяць таму, каб падуладнае яму Княства як мага хутчэй інтэгравалася ў каталіцкі Захад. Этнічныя літоуцы, якія былі паганцамі, прынялі каталіцкую веру. У мэтах інтэграцыі ў еурапейскую культурную прастору актыўна выкарысоўваўся тэзіс аб рымскіх каранях літоўска-беларускай палітычнай эліты. Паэты ВКЛ асвоілі жанр новалацінскай паэзіі. Цераз агульнаеурапейскую лацінскую мову яны даводзілі інфармацыю пра ВКЛ еўрапейскім чытачам. Палітычная эліта разумела патрэбу ў стварэнні сістэмы адукацыі, адпавядаючай практыкам сярэневекавога Захаду. Асноўную патранажную ролю ў сістэме адукацыі адыгрывала рымская курыя.

У 1364 годзе польскі кароль Казімір III з благаслаўлення папы рымскага, прыняў рашэнне аб адкрыцці ў Кракаве ўніверсітэта. У яго структуры былі адкрыты кафедры права, медыцынскіх навук і вольных мастацтваў. Аднак фактычна да 1400 года ўніверсітэт не функцыянаваў. Пачаў працу з прыходам на каралеўскі трон Ягайлы. Адсюль яго назва «Ягелонскі ўніверсітэт». Гэта быў адзіны ва Ўсходняй Еуропе ўніверсітэт да 1544 года. Пры ўніверсітэце быў адкрыты інтэрнат для выхадцаў з Беларусі і Літвы.

Універсітэт дазваляў юнакам працягваць адукацыю ва ўніверсітэтах Італіі. Для гэтага яны асвойвалі лацінскую мову. Аўтарытэтам карыстаўся Падуанскі ўніверсітэт. Менавіта ў ім атрымаў адукацыю Ф. Скарына. У Кракаўскім універсітэце на факультэце вольных мастацтваў выкладаў ураджэнец Беларусі Я. Вісліцкі, яго ж выпускнік. Ен стаў адным з заснавальнікаў нова-

лацінскай паэзіі. Ен чытаў курсы па філасофіі Арыстоцеля, матэматыцы Яўкліда, рыторыцы Цыцэрона. Адчуваўся кантэкст гуманізму, характэрны для эпохі Адраджэння. Пад яго ўплывам аказауся Ф. Скарына і М. Гусоўскі.

Studia humanitatis (гуманізм) не з'яўляліся ўніверсітэцкай сістэмай адукацыі. Гэта была адукацыя, заснаваная на самастойнай працы над рукапісамі антычных аўтараў, напісаных на лацінскай і грэчаскай мовах. Гэта была філалагічная адукацыя, у межах якой асобая роля адводзілася валоданню лацінскай мовай і адпаведна напісанымі на ей тэкстамі антычных аўтараў. Паколькі гэтай мовай валодала вузкае кола саміх гуманістаў і звязаных з імі тэалагічных і гарадскіх колаў грамадства, то гуманісты сутыкнуліся з неабходнасцю дыялогу з асноўнай часткай насельніцтва, карыстаўшайся мовай volgare.

Рух гуманістаў атрымаў распаўсюджанне ў Італіі. Пад час атрымання адукацыі ў Італіі выхадцы з Беларусі праходзілі фактычную падрыхтоўку на выснове дзвух сістэм. Гэта бачна па дзейнасці Ф. Скарыны і М. Гусоўскага. Аб агульнаеурапейскім распаўсюджанні гэтага мадэлю адукацыі сведчыць дзейнасць на тэрыторыі Беларусі С. Буднага, А. Волана, М. Сматрыцкага, В. Цяпінскага, С. Собаля, М. Федарава, П. Мсціслаўца. Яны імкнуліся высокі гуманізм лацінскай, грэчаскай моваў трансфарміраваць цераз тэалагічны дыскурс Бібліі ў беларускамоўныя тэксты, зразумелыя для асноўнай часткі насельніцтва. Паколькі studia humanitatis не абмяжоўваліся толькі філалогіяй, а ўключалі праблематыку права і палітыкі, то ва ўмовах ВКЛ атрымалі развіцце практыкі канвергенцыі права і палітыкі. Яны былі рэалізаваны ў Статуце ВКЛ. Вялікую ролю адыграў Л. Сапега.

Studia humanitatis фарміравалі не толькі навыкі самастойнай працы пры працы з тэкстамі. Яны фарміравалі практыку індывідуальнага падыходу да самога тэксту і самастойны статус таго, хто з тэкстам працаваў. Пры гэтым прадстаўнікі Адраджэння не імкнуліся выйсці за межы тэалагічнага дыскурсу, паколькі тэксты Бібліі былі аўтарытэтнымі выданнямі для асноўнай часткі насельніцтва. У выніку Біблія стала прасторай аўтарскіх інтэрпрэтацый гуманістаў. Каб наблізіць тэксты Бібліі да чытачоў айчынныя гуманісты выдавалі іх на старабеларускай мове.

Ф. Скарына ўвеў практыку прамоў, у якіх ен абгрунтаваў тэзіс аб філасофіі ідэнтычнасці. Гэтая філасофія ўключае любоў да родных

мясцін, асэнсаванне ўласнай гісторыі, культурных традыцый, каштоунасці адукацыі, маралі.

Адначасова з гуманізмам Адраджэння ў XVI стагоддзі на Беларусі атрымаў распаусюджанне рух Рэфармацыі. Ен прыйшоў з Чэхіі і Прусіі. У першую чаргу гэта быў рух лютэранскай царквы. Ф. Скарына сустракауся з М. Лютэрам, які прапанаваў яму супрацоуніцтва ў выданні Бібліі, але беларускі першадрукар не прыняў прапанову. Тым не менш лютэранскі рух атрымау на Беларусі распаусюджанне. Прыхільнікамі яго былі нямецкія купцы, якія жылі ў Вільне, а таксама на тэрыторыі Польшчы.

Лютэране абапіраліся на сістэму адукацыі, якая ўключала ўніверсітэты. Шмат юнакоў з Беларусі і Літвы атрымлівала адукацыю ў нямецкіх універсітэтах. Бліжэйшым універсітэтам на мяжы ВКЛ быў універсітэт у Кенігсбергу. Ен быў адкрыты ў 1544 годзе. Адным з першых прапаведнікаў лютэранства ў ВКЛ быў С. Рафаловіч.

Лютэранства не атрымала шырокага распаусюджання. Большы інтарэс беларуская эліта праявіла да кальвінізму. Рэфармацыі на Беларусі спрыяў суб’ектыуны фактар, абумоулены прыхільнасцю да руху караля Рэчы Паспалітай, вялікага князя ВКЛ Сігізмунда II Аўгуста. Уладар перапісваўся з Кальвінам, які прысвяціў яму тлумачэнне на пасланне Паўла габрэям. Не застаўся ўладар без увагі Лютэра. Той прысвяціў яму зроблены ім пераклад Біблії.

Лютэранская царква інстытуцыяналізавалася ў ВКЛ пад назвай Аўгсбургскай царквы. Ей кіраваў рыжскі архіепіскап. Прыхільнікаў лютэранства было няшмат, у асноўным немцы. Большым поспехам карыстаўся кальвінізм. Ен прываблівaў магнатаў тым, што фактычна рабіў іх кіраўнікамі кальвінскіх збораў у межах падуладных ім земляў. Ролю адыграу і асабісты фактар. Ж. Кальвін веў перапіску з М. Радзівілам Чорным. Менавіта гэты чалавек адыграў выключную ролю ў шырокім распаусюджанні кальвінізму на Беларусі. Будаваліся кальвінскія малельні. Яны функцыянавалі ў Заслауі, Клецку, Нясвіжы, Воршы, Іўі, Брэсці. Была створана сістэма адукацыі, якая вызначалася высокім узроунем. Былі адкрыты друкарні. У іх выдавалася Біблія на беларускай і польскай мовах. Адукацыйнай дзейнасцю займаліся С. Будны, М. Чаховіц. Вядомасць набыў А. Волан.

Прыхільнікамі кальвінізму сталі магнацкія семь’і Сапегаў, Кішкаў, Хадкевічаў, Тышкевічаў.

У 1557 годзе адбыўся працэс інстыцуалізацыі кальвінізму на Беларусі. Быў створаны Сінод прадстаунікоу евангельскай царквы ВКЛ. Дзейнасцю збораў кіраваў суперінтэндант. Кіраўнікам быў абраны С. Зацыус. Тэрытарыяльна ВКЛ было падзелена на шэсць дыстрыктаў. Кальвінскія зборы дамінавалі на тэрыторыі ВКЛ. Яны прываблівалі насельніцтва высокім узроўнем адукацыі. Акрамя тэалогіі выкладаліся гісторыя, матэматыка, рыторыка, антычная паэзія. Асабліва вылучаліся школы ў Вільні, Іўі, Клецку, Слуцку, Любчы, Лоску, Нясвіжы. Віленская школа фактычна адпавядала ўзроуню ўніверсітэта. Такі ж высокі ўзровень адукацыі дэманстравала школа ў Іўі.

У 1565 годзе кальвіністы ВКЛ атрымалі роўныя правы з каталікамі і праваслаунымі князтва. У атмасферы прававой роўнасці у філасофскай культуры Беларусі ўзнікла ўнікальная сітуацыя дыялага-палемічнага тэалагічнага дыскурсу. Перамога ў палеміцы мела наступствы, звязаныя з умацаваннем пазіцый альбо пратэстантаў, альбо каталікоў, альбо праваслаўных. Параза прыводзіла да страты існуючых пазіцый. Але гэтая сітуацыя не мяняла юрыдычнай роўнасці прадстаунікоў хрысціянскіх канфесій. Яны маглі займаць дзяржаўныя пасады. Склаліся ўнікальныя механізмы межкафесійнай хрысціянскай талерантнасці. Было прызнана права выбару рэлігіі. Пратэстанты Рэчы Паспалітай дамовіліся дапускаць у малельныя дамы прадстаунікоу іншых збораў. На Варшаўскай канфедэрацыі ў 1573 годзе пратэстанты дабіліся прыняцця ў выглядзе закону права на выбар рэлігіі. Адпаведны артыкул быў актуалізаваны Статутам ВКЛ у 1588 годзе.

Адным з першых правам выбару рэлігіі скарыстау Л. Сапега. Ен за жыцце быў праваслауным, кальвіністам, каталіком. Гээтым правам скарысталі беларускія магнаты і шляхта на пачатку XVII стагоддзя калі меў месца масавы пераход эліты ў каталіцкую веру.

Паленіныя дыскусіі рэдка выходзілі за межы тэалагічнага дыскурсу. У межах яго пазіцыяніраваліся розныя тлумачэнні тэалагічных дагматаў. Для абгрунтавання права на гэтыя тлумачэнні выкарыстоўваліся аргументы філасофіі, блізкія аргументам натуральнага права. У ліку аргументау браліся канцэпты свабоды, талерантнасці, грамадзянскай адказнасці. Складаную эвалюцыю ў межах тэалагічнага дыскурсу прайшоу С. Будны. Ен атрымау адукацыю ў Базельскім універсітэце на факультэце тэалогіі. Пазнаеміўся з працамі Ж. Кальвіна і стау прыхільнікам кальвінізму. На Беларусі

карыстаўся падтрымкай М. Радзівіла Чорнага. Яго духоўная дзейнасць была звязана з Вільняй, Клецкам, Нясвіжам. Яна уключала выдавецкую дзейнасць. С. Будны веў актыуную пісьмовую палеміку са старцам Арцеміям з Расіі.

Духоўныя пошукі прывялі С. Буднага да антытрынітарыяў. Яму сталі блізкімі погляды Ф. Соцына. У Лоску, куды пераехау С. Будны пасля разрыву з кальвінізмам, ен займаўся актыунай выдавецкай дзейнасцю. Тэалогія ў працах мысляра спалучаецца з эпістэмалогіяй, згодна якой рацыянальная дзейнасць чалавека адыгрывае важную ролю ў межах пэўных інстытуцыянальных традыцый. Выснову гэтых традыцый фарміруе права і закон.

Напісаны С. Будным твор «Аб найгалоўнейшых тэзах хрысціянскай веры» стварыў выснову для пісьмовай палемікі з ім Пятра з Гонендза, Я. Вісьнеўскага, І. Занхіўса, С. Фарноўскага, М. Чэхаўца, П. Скаргі, Я. Віланда. Палеміка працягвалася некалькі дзесяцігоддзяў. Удзельнікі палемікі пісалі ўласныя творы і сталі вядомымі палемічнымі аутарамі. Да іх ліку далучыліся С. Астроўскі і М. Сміглецкі, прадстаўляушыя каталіцкую канфесію.

У межах пратэстанцкага збору С. Будны актыуна падтрымліваў матывацыю тэалагічнай палемікі. Гэтаму спрыяла яго чарговая кніга «Апраўяржэнне Чахоуца, які лічыць, што хрысціяніну нельга займаць дзяржаўную пасаду». На гэтае выданне адрэагавалі Якуб з Калінаўкі, Петр з Гонендза, Я. Немаеўскі, Павел з Візны. У 1581 годзе ў Лоску на пратэстанцкім сінодзе вярбальная палеміка заняла некалькі гадзін. Працяг быў у 1582 годзе ў Любчы. Палеміка працягвалася некалькі дзен. На працягу жыцця С. Будны садзейнічаў станаўленню выдатных палемістаў.

Сярод іх быў А. Валовіч. З праваслаўя ен перайшоў у пратэстантызм. Ен займаў пасаду канцлера ВКЛ. Удзельнічаў у распрацоуцы Статута ВКЛ 1566 года. На яго сродкі выдаваліся кнігі С. Буднага і Г. Буллінгера. Кальвінізм разглядаўся ім як нацыянальная адметнасць ВКЛ. Ен веў палеміку з прыхільнікамі Люлінскай уніі.

Адукаваны прыхільнік кальвінізму Я. Абрамовіч займаў высокія дзяржауныя пасады. Адстойваў правы праваслаўных брацтваў. У тым ліку і па той прычыне, што яго жонка была праваслаўнай. Вёў палеміку з іезуітамі. Пісаў працы блізкія тэматыцы эканамічнай ідэнтычнасці. Адна з прац называлася «Думкі ліцьвіна аб танным набыцці зерня і дарагім яго продажы»(1595). Падштурхнуў

Я. Радвана напісаць паэму «Радзівіліада». Падтрымліваў выдавецкую дзейнасць С. Судроўскага.

Я. Глябовіч выконваючы абавязкі мінскага кашталяна спрыяў равіццю горада. Па яго прапанове былі пабудаваныя Траецкае і Замкавае прадмесці. У горадзе ўзнік буйны па колькасці прыхажан кальвінскі збор з храмам. Пры яго ўдзеле ў Заслауі быў пабудаваны кальвінскі храм і адкрыта тыпаграфія. У ей працавалі Д. Лянчыцкі і С. Будны. Ен адыграў важную ролю ў прыняцці Статута ВКЛ 1588 года.

Я.Л. Намыслоўскі адыграў важную ролю ў станауленні арыянскіх школаў у Іўі, Навагрудку. Ен спрыяў дзейнасці С. Буднага. Вядомасць яму прынесла палеміка з М. Сміглецкім, буйнейшым прадстаўніком другой схаластыкі на Беларусі. Дыскусія адбылася ў 1594 годзе. У выніку Я.Л. Намыслоускі схіліуся да разумення веры ў катэгорыях індывідуальнага разумення яе чалавекам цераз каштоўнасці адукацыі, маралі, талерантнасці. Нідэрландскі тэолаг Ф. Юніус прыняў палемічны выклік па выніках азнаямлення з кнігамі Я.Л. Намыслоўскага. Сярод кніг была «Анатомія і гарманічнасць хрысціянскага чалавека» (1596), «Дапаможнік для авалодання вучэннем Арыстоцеля» (1586).

Петр з Ганендза атрымау выдатную адукацыю ва ўніверсітэтах Кракава і Падуі. Быў прафесарам сафістыкі ў Падуанскім універсітэце. Прыняу пратэстантызм пад уплывам казанняу М. Сервета і чэшскіх братоў. У межах Рэчы Паспалітай стаў заснавальнікам збору польскіх братоў, якія прытрымліваліся арыянства і сацыянства. Вёў актыуную палеміку з С. Будным. Блізкім па поглядах і дзейнасці Пятру з Ганендза быў Павел з Візны. Сумесна з Якубам з Каліноукі ен палемізавау з С. Будным. Разыходзіліся ўдзельнікі дыскусіі ў сацыяльных пытаннях адносна становішча сялянства. Прычыны беднасці сялян на іх думку хаваліся ў іх бяспраўі.

М. Чаховіц атрымаў адукацыю ва ўніверсітэце Лейпцыга. Выкладаў у Віленскай кальвінскай школе. Веу актыўныя дыскусіі з С. Будным і Ф. Соцынам. Дыскусіі абмяжоўваліся тэалагічным дыскурсам, але ў межах яго закраналі пытанні неабходнасці сацыяльных рэформаў, дэмакратызацыі дзяржавы, адмены прыгнету сялян, адмаўлення ад уласнасці.

С. Заціўс атрымаў адукацыю ва ўніверсітэце Кракава. Прыняў кальвінізм. Стаў вядомы дзякуючы выдавецкай дзейнасці ў Брэсці.

Ен надрукаваў вядомую брэсцкую Біблію. Без яго палемічнай увагі не засталіся працы С. Буднага. Пасля смерці М. Радзівіла Чорнага друкарня ў Брэсце перайшла да К. Базыліка. Ен валодаў featureнабаковым талентам пісьменніка і кампазітара, перакладчыка. З Беларуссю звязау свой жыццевы лес італьянскі тэолаг Дж. Бландрата. Ен прыняу пратэстантызм у 1553 годзе. Адукацыю атрымау ва ўніверсітэце Балоны. Актыуна пісаў палемічную літаратуру ў межах тэалагічнага дыскурсу.

М. Кавечынскі атрымаў адукацыю ва ўніверсітэце ў Віттэнбергу. Прыняу кальвінізм. Адгукнуўся на прапанову М. Радзівіла Чорнага і сумесна з С. Будным і Л. Кшышкоўскім адкрыў у Нясвіжы друкарню і наладзіў выраб паперы. Прыняў актыўны ўдзел у выданні сумесна з С. Будным на беларускай мове «Катэхізіса».

Высокую культуру палемікі дэманстравау прыхільнік кальвінізму А. Волан. Ен быу сакратаром такіх каралёў Рэчы Паспалітай, як Сігізмунд Аугуст, С. Баторый, С. Ваза. Ен веу палеміку з прадстаўнікамі каталіцкай канфесіі А. Пасевіна і П. Скаргай. А. Воланам напісаны творы па пытаннях палітыкі, права, тэалогіі. Найбольшую ўвагу ен надавау прававой тэматыцы, паколькі меў непасрэднае дачыненне да дзяржаўнага кіравання. Блізкай палемічнай тэматыкі прытрымліваўся дыпламат М. Літвін. Па выніках дыпламатычных назіранняў ен напісаў твор «Аб норавах татар, літоўцаў і маскавіцян».

Міжкультурны аспект тэалагічнага дыскурсу фарміраваўся міждзяржаўнымі фактарамі, вымушанай міграцый. Прыкладам стал палеміка паміж А. Курбскім, знайшоушым палітычнае сховішча ў ВКЛ, і І. Грозным. Яна мела пісьмовую форму і сукупна стала самастойным творам, у якім прадстаулены розныя мадэлі тэалагічнага дыскурсу. А. Курбскі прадстаўляе тэалагічны дыскурс арыстоцелеускага тыпу. Ен карыстаецца ў палеміцы доказамі розуму, мовай рацыяльнага абгрунтавання і разважання. Маскоўскі ўладар аргументуе ўласным харызматычным статусам ад імя Бога. Ен лічыць, што Богам яму дадзена права караць людзей. А. Курбскі не прымае такой аргументацыі.

Беларуская шляхта і магнаты не змаглі прыняць такі мадэль адносін у межах дзяржавы. Адсюль іх імкненне да еурапейскага мадэлю ўлады і грамадства. Гэты мадэль абумоўліваў цесныя сувязі з Польшчай, паколькіў межах Рэчы Паспалітай сфарміраваўся агульны таварны рынак з выхадам у Данцыгу. Туды вывозілася прадук-

цыя і там яна скупалася нідэрландскімі купцамі. Яны занялі усходнееўрапейскі рынак пасля распаду Ганзы. Перамяшчэнне перавалачных цэнтраў гандлю за межы ВКЛ негатыўна сказалася на стане і магчымасцях беларускіх гарадоў. Як вядома еўрапейскі пратэстантызм меў у гарадах асноуную сацыяльную базу.

Цяжкі эканамічны стан ВКЛ паглыбілі ваенныя дзеянні пад час Лівонскай вайны. У гэтай вайне стала відавочнай вядучая роля ў межах Рэчы Паспалітай Каралеўства Польскага. Гэта паказалі паспяховыя дзеянні войска С. Баторыя ў раене Полацка. Аграрны характар Польшчы спрыяў умацаванню каталіцкай царквы. Раўнавага паміж хрысціянскімі канфесіямі ўступіла месца каталіцкай экспансіі ў межах ВКЛ. Пратэстанты страцілі ўплыў у грамадстве. Яны вымушаны былі пакінуць межы Рэчы Паспалітай. Уіх ліку былі вельмі адукаваныя людзі. Сярод іх аказаліся К. Семяновіч, І. Капіевіч. Сваю дзейнасць яны прадоўжылі ў Нідэрландах. К. Семяновіч меў інтарэсы ў вобласці артылерыі. Напісау выдатную працу «Вялікае мастацтва артылерыі», выдадзеную ў большасці краін Еўропы. Абапіраўся на творы Арыстоцеля, Сенекі, Эукліда, Архімеда, Апалоха з Пергама. Карыстаўся выданнямі па медыцыне, прыродазнаўству, земляробству, хіміі, гісторыі.

Капіевіч прысвячау свой час выдавецкай дзейнасці. У Нідэрландах ен пазнаеміўся з Пятром І пад час яго прабывання ў краіне і за матэрыяльную ўзнагароду перакладаў і выдаваў кнігі па марской справе. Сам іх адвозіў у Расію.

Пасля зыходу з сацыльнай прасторы пратэстантау палемічны кантэкст тэалагічнага дыскурсу на Беларусі перамясціуся на дыялог каталікоу і праваслауных. Наступальную стратэгію прапаведавала каталіцкая царква. Рымская курыя хацела падпарадкаваць праваслаўную царкву ВКЛ свайму ўплыву цераз механізм уніі. Гэта ей удалося зрабіць у 1595 годзе.

На Беларусі ўзнікла новая сітуацыя для дылага-палемічнай філасофіі. Пераход праваслаунай царквы Беларусі пад патранаж рымскай курыі разглядаўся з пазіцый філасофіі ідэнтычнасці. Браты Зізаніі, А. Філіповіч, Х. Філалет, А. Мужалоускі, В. Астрожскі, М. Сматрыцкі, С. Полацкі вялі актыўную палеміку з прыхільнікамі ўніяцтва. Аднак пераламіць ход палемікі на сваю карысць не змаглі. У выніку перамогі ўніятаў прыхільнікі традыцыйнага праваслаўя сталі арыентавацца на маскоўскую патрыярхію. Некаторыя пакінулі межы ВКЛ. Сярод іх быў С. Полацкі.

У выніку закончыўся вельмі арыгінальны перыяд развіцця беларускай філасофскай культуры ў межах тэалагічнага дыскурсу.

### *1.3. Другая схаластыка на Беларусі*

Першая схаластыка на Беларусі была грэка-візантыйскай. Яна абгрунтавала каштоунасць царкоунай адукацыі і стварыла інфраструктуру царкоўна-прыхадскіх школаў. На Беларусі традыцыі першай схаластыкі захоўвалі праваслаўныя брацтвы. У каталікоў першая схаластыка таксама ўключала кампаненту адукацыі. У гэтых мэтах былі адкрыты ўніверсітэты, якія сталі цэнтрамі інтэлектуальнай дзейнасці ў межах тэалагічнага дыскурсу. Вялікая вага надавалася схаластычным дыспутам. Пры манастырах былі створаны бібліятэкі. Тэарэтыкам каталіцкай схаластыкі стаў Т. Аквінскі. Ен абгрунтаваў суадносіну веры і розуму, тэалогіі і філасофіі.

У межах каталіцкай схаластыкі мелі месца два асноуныя падыходы ў галіне дыялектыкі. Т. Аквінскі адстойваў пазіцыю рэалізму. Прадстаўнікі брытанскіх універсітэтаў прытрымліваліся наміналізму. Пасля выхаду Брытаніі, Нідэрландаў, Скандынавіі, Германіі з пад уплыву рымскай курыі цэнтр схаластыкі перамясціўся на поўдзень Еуропы і ў Польшчу. Гэта тлумачылася тым, што ў спрыяльных для сябе ўмовах каталіцкая царква хацела выпрацаваць стратэгію не толькі аднаулення, але і пашырэння сваіх пазіцый у Еуропе. Гаворка ішла не столькі аб ваеннай экспансіі, колькі геапалітычнай, заснаванай на выкарыстанні сродкау палемічнага, інтэлектуальнага ўплыву цераз сістэму адукацыі, адміністратыуныя магчымасці каралеўскай улады.

Адным з інтэлектуальных цэнтраў другой схаластыкі ў Еўропе стаў Іберыйскі паўвостраў, дзе пазіцыі каталіцкай царквы былі моцнымі. К моманту пачатку Контрэфармацыі каталіцкая царква мела інтэлектуальныя цэнтры ў Каімбры, Саламанцы, Грыгарыянскім універсітэце (Рымскай калегіі). Персаналістыка другой схаластыкі прадстаўлена інтэлектуальным асяроддзем саламанкскай школы, асабіста, Ф. Суарэсам (1528-1617). Менавіта яго вучнем быў адзін з самых вядомых прадстаўнікоу другой схаластыкі ў ВКЛ М. Смігліцкі.

Духоўную экспансію рымская курыя спадзявалася ажыццявіць з дапамогай створаных ею ордэнаў. Яна карысталася гэтым інстытутам з часоў крыжовых паходаў. У перыяд другой схаластыкі ваенная місія ордэнаў была заменена на адукацыйную і культурную

місіі. Гэта былі важныя аргументы езуітаў у барацьбе з пратэстантамі і праваслаунымі канфесіямі за вернікаў.

На тэрыторыю ВКЛ езуітаў у колькасці 13 чалавек запрасіў каталіцкі япіскап Вільні В. Пратасевіч у 1569 годзе. Гэта быў адзін з самых багатых людзей ВКЛ. Ен быў прыхільнікам саюзу з Каралеўствам Польскім.

Пры фінансавай і адміністратыунай падтрымцы В. Пратасевіча езуіты стварылі ў ВКЛ сістэму адукацыі вельмі высокага ўзроўню. У купленым для гэтых мэт у Вільні будынку, яны ў 1570 годзе адкрылі езуіцкі калегіўм. За імі быу замацаваны храм. А таксама некалькі будынкау для паўсядзеннага жыцця. Пасля смерці М. Радзівіла Чорнага В. Пратасевіч здолеў пераканаць Радзівіллаў у пераходзе ў каталіцкую веру. В. Пратасевіч ствараў пастаянныя перашкоды пратэстантам у іх адукацыйнай дзейнасці. Ен угаварыу С. Баторыя надаць Віленскаму калегіўму статус універсітэта. А. Волан напісаў палемічны трактат на дзейнасць В. Пратасевіча. Але ен не змог паўплываць на развіцце падзей на карысць каталіцкай царквы. Бок царквы трымаў С. Баторый.

Езуіты скарысталі падтрымкай. Яны разгарнулі ў ВКЛ рознабаковую дзейнасць, звязаную з адукацыяй, медыцынай, будаўніцтвам. У мэтах іх дзейнасці ўлады ВКЛ перадалі ім пасля заключэння вуніі будынкі пратэстанцкіх і праваслаўных храмаў. Справе ўмацавання пазіцый езуітаў садзейнічалі таленавітыя палемісты. Адным з іх быў П. Скарга. Адукацыю атрымаў у Кракаўскім універсітэце і ў Рыме, дзе ўступіў у ордэн езуітаў. З 1571 года ў межах ВКЛ. Быў заснавальнікам і першым рэктарам Віленскай езуіцкай акадэміі. Вёў актыўную палеміку з пратэстантамі. Валодаў унікальным аратарскім талентам, які спалучаў з эрудыцыяй. Адкрыў езуіцкі калегіўм у Полацку ў 1582 годзе і быў яго рэктарам на працягу дзесяці гадоў.

Яшчэ адной яркай персонай палемічнай накіраванасці быў М. Сміглецкі. У 1581 годзе пад час навучання ў Рыме ен уступіў у ордэн езуітаў. Адным з яго настаунікаў быў Ф. Суарэс. З 1586 года ў Вільні. Працаваў ва ўніверсітэце. Выкладу філасофію, тэалогію. Асаблівую ўвагу надаваў логіцы. Па выніках прачытаных лекцый выдаў двутомны дапаможнік па логіцы, які шырока выкарыстоўваўся ва ўніверсітэтах Еўропы, у тым ліку ў пратэстанцкім асяроддзі брытанскіх універсітэтаў. Дапаможнік тройчы выдаваўся ў 1634, 1638, 1658 гадах у Оксфардзе. Логіка ў ім разглядаецца з пазіцыі

арыстоцелеўскай традыцыі тэалагічнага дыскурсу. За выснову інтэрпрэтацыі быў узяты тамізм.

М. Сміглецкі пісаў працы па эканамічнай тэматыцы. Прадметам разгляду сталі фінансавыя пытанні, гандаль, сельская гаспадарка. М. Сміглецкі паказаў сябе выдатным палемістам. У 1594 годзе ен ўдзельнічаў у дыспуце з Я. Намыслоўскім і Ю. Даманеўскім. Яго довады на карысць каталіцкай тэалогіі аказаліся настолькі зразумелымі, што значная колькасць прысутных на дыспуце прадстаунікоў шляхты перайшла ў каталіцызм. Паразу пратэстантау прызнау і Ф. Соцын.

Езуіты дзейнічалі ў межах ВКЛ побач з іншымі каталіцкімі ордэнамі. Сярод іх былі дамініканцы, піяры, францызканцы. Але іх сістэма арганізацыі была найбольш дасканалай. Важную ролю адагрывала дысцыпліна. Кзяндзы адкрывалі школы, шпіталі, займаліся дабрачыннасцю. Была створана добра прадуманая сістэма адукацыі пачынаючы ад школаў, калегіумаў і заканчваючы ўніверсітэтамі і акадэміямі. У межах Беларусі калегіўмы былі адкрыты ў Воршы, Нясвіжы, Віцебску, Гродне, Пінску, Магілеве, Навагрудку, Полацку, Слуцку.

У калегіўмах атрымлівалі адукацыю дзеці як з каталіцкіх, так і пратэстанцкіх і праваслаўных сем'яў. Грошай за адукацыю не бралі. Акрамя тэалогіі выкладаліся мовы, рыторыка, этыка, логіка, матэматыка, фізіка, гісторыя, геаграфія, механіка, філасофія. Забяспечвалі навучальны працэс друкарні.

Каб замацаваць свае пазіцыі ў Вялікім Княстве Літоўскім каталікі адкрылі пры актыўным удзеле езуітаў універсітэт у Вільні ў 1579 годзе. Намаганнямі езуітаў была адкрыта таксама Полацкая езуіцкая акадэмія. У межах гістарычнага перыяду другой схаластыкі на Беларусі ўзніклі дзве арыстоцелеўскія школы акадэмічнай філасофіі ў межах тэалагічнага дыскурсу. Выкладанне логікі адыгрывала важную ролю ў іх дзейнасці.

У Віленскім універсітэце першапачаткова навучанне было на двух факультэтах – філасофскім і тэалагічным. Да іх пасля дабавіліся прававы і медыцынскі факультэты. Сістэма адукацыі знаходзілася ў падпарадкаванні рымскай курыі. Акрамя М. Сміглецкага (1563-1618) ва ўніверсітэце выкладаў прафесар матэматыкі О. Кругер (1598-1655). Яго прыклад звязаны з тым, што ен знаеміў студэнтаў з сістэмай Каперніка паказвае, што другая схаластыка ў ВКЛ мела больш прагматычную накіраванасць у пы-

таннях навукі. О. Кругер быў вядомым спецыялістам па ваеннай механіцы, оптыцы, метралогіі, астраноміі. Пад яго кіраўніцтвам аднаўляўся Нясвіжскі палац пасля пажару. Па загаду караля Рэчы Паспалітай ен быў адказным за ўмацаванне Гродзенскага замку.

У Віленскім універсітэце працаваў В. Каяловіч (1609-1677), які надрукаваў сістэмазаваны двутомны дапаможнік па гісторыі ВКЛ. Развівалася юрыдычная навука. У гэтых мэтах К. Сапега перадаў універсітэту бібліятэку. Ен дапамог адкрыць юрыдычны факультэт у 1641 годзе. Ен выдзяляў фінансавыя сродкі на ўтрыманне прафесараў прававедаў. У XVIII стагоддзі пры ўніверсітэце была адкрыта астранамічная абскерваторыя на ахвяраванні Мсціслаўскай мяшчанкі.

Езуіты афіцыйна дзейнічалі ў межах Беларусі да пачатку XIX стагоддзя нават пасля таго як папа рымскі ў 1773 годзе ордэн афіцыйна распусціў. Але расійскія ўлады пасля далучэння тэрыторыі Беларусі дазволілі ордэну функцыянаваць і займацца адукацыйнай дзейнасцю. У ліку навучальных устаноў, якую езуіты курыравалі была Полацкая езуіцкая акадэмія.

Паралельна з каталіцкімі навучальнымі ўстановамі і друкарнямі працягвалі функцыянаваць адукацыйныя сістэмы пратэстантаў і праваслаўных. У пратэстанцкіх друкарнях выдавалася антычная літаратура, а таксама палемічная літаратура А. Волана, Б. Буднага. У некаторых выданнях былі прыклады выхаду за межы тэалагічнага дыскурсу. Але гэтыя сітуацыі не перараслі ў ВКЛ у распаусюджаны ў паудневай Еўропе інстытут інквізіцыі. Выключэннем стаў трагічны лес К. Лышчынскага. Ен атрымаў адукацыю ў езуіцкім калегіўме. Пад час самастойных разважанняў напісаў твор пад назвай «Аб не існаванні Бога». У выніку даносу быў прыцягнуты да адказанасці езуітамі і пакараны смерцю ў Варшаве ў 1689 годзе.

К сярэдзіне XVII стагоддзя каталіцкая царква заняла дамінуючую пазіцыю ў ВКЛ. Контрэфармацыя перамагла пратэстантаў і заставіла большую частку праваслаўных ВКЛ падпарадкавацца юрысдыкцыі рымскай курыі. Польская і лацінская мовы сталі дамінуючымі. Беларуская мова практычна была выцеснена з ужытку ва адмістрацыйных установах. Асноўнымі яе носьбітамі заставаліся сяляне.

Праваслаўная тэалогія мела моцную інстытуцыянальную інфраструктуру на Украіне на базе Кіева-Магілянскай і Астрожскай акадэмій. Апошняя праіснавала нядоўга. Яны мелі ўніверсітэцкі ўзро-

вень адукацыі. Абапіраліся на аўтарытэт Арыстоцеля. На тэрыторыю Беларусі прыязджала шмат прадстаўнікоў гэтых адукацыйных цэнтраў. У іх ліку быў Р. Каніскі (1717-1795). Да прыезду ў Магілеў ен чытаў курс лекцый па філасофіі ў Кіева-Магілянскай духоўнай акадэміі. Ен прыхільнік Арыстоцеля. З гэтай пазіцыі крытыкаваў погляды Фалеса, Анаксімена, Геракліта. Адначасова прымаў вучэнне Дэкарта аб матэрыі. Аднак вядучую ролю адводзіў форме. У Магілеве Р. Каніскі адкрыў вучылішча і духоўную семінарыю. Быў япіскапам Магілеўскім.

Нягледзячы на намаганні праваслаунай царквы каталіцкая філасофія стала дамінуючай у адукацыйнай прасторы ВКЛ. Яе распрацоўкай займаліся М. Сарбеўскі (1595-1640), Н. Лянчыцкі (1574-1653), С. Лаўксмін (1596-1670), А. Алізароўскі (1618-1659), Л. Залускі (1604-1676), А. Краснадэмскі (1645-1702), А. Каяловіч (1609-1677), М. Карскі (1662-1717), В. Тылкоўскі (1624-1695), К. Вярбіцк (1704-1755), А. Кярсніцкі (1678-1733), Я. Панакоўскі (1684-1754). Гэта была акадэмічная, меўшая ўніверсітэцкую базу, філасофія і тэалогія. Пасля перадачы сістэмы адукацыі свецкім уладам Рэчы Паспалітай адбылася трансфармацыя статусу каталіцкай філасофіі.

Расійскія ўлады не забаранілі дзейнасць езуітау на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай. Езуіты сканцэнтравалі сваю адукацыйную актыунасць на базе Полацкай езуіцкай акадэміі. Яна пачала функцыянаваць у 1812 годзе на выснове езуіцкага калегіўма. Тым не менш эпоха другой схаластыкі ў межах Беларусі заканчвалася. Гэта было абумоўлена яе плаўным пераходам у інтэлектуальную рэчаіснасць, звязаную з інтэнсіўным развіццем навукі, узросшым уплывам нямецкай філасофіі.

### *1.4. Тэалагічная філасофія Беларусі XVIII - першай паловы XIX стагоддзяў*

У другой палове XVIII стагоддзя адукацыйны тэалагічны дыскурс у межах ВКЛ трансфармаваўся з улікам узрошшага ўплыву класічнай філасофіі Новага часу і Асветы. У лекцыях акрамя арытоцелізму і тамізму сталі прысутнічаць інтэрпрэтацыі філасофскіх сістэмау французскага, брытанскага рацыяналізму і сэнсуалізму. Рос уплыу на адукацыйную сістэму класічнай нямецкай філасофіі. Цэнтраміэвалюцыі філасофіі сталі акадэміі ў Вільне і ў Полацку. Пернасалістыка выкладчыкаў прадстаўлена яркімі мыслярамі.

А. Скарульскі (1715-1780) атрымаў адукацыю ў Віленскай езуіцкай акадэміі. Займаў пасады рэктара езуіцкіх калегіўмаў, а таксама Віленскай акадэміі. Напісаў дапаможнік «Каментарыі па філасофіі і логіцы, гэта значыць па метафізіцы і спецыяльнай фізіцы» (1755). У дапаможніку разглядаюцца погляды Дэмакрыта, Эпікура, Гасендзі, Каперніка, Бруна. Сутнасць эклектычнай філасофіі ім тлумачыцца наступным чынам. Есць тэалогія і філасофія ў якой спасылацца на тэалогію пры разглядзе праблем метафізікі і пазнання не абавязкова.

С. Шадурскі (1727-1789) атрымау адукацыю ў Віленскай езуіцкай акадэміі. Пасля прадоўжыў адукацыю ў Парыжы. Вярнуўся ў Беларусь. Быў прафесарам філасофіі ў Навагрудскім езуіцкім калегіўме. Па выніках лекцый напісаў наступныя творы «Пачаткі развужанняў у дыялогах і практыкаваннях па логіцы, этыцы і метафізіцы», «Філасофскія азначэнні агульнай фізікі, выказаныя публічна аўтарам», «Фізіка і філасофія прыроды».

С. Шадурскі асцярожны ў ацэнцы поглядаў Ньютана, Дэкарта, Локка, Лейбніца. Ен піша, што прыме іх калі аўтары прадставяць доказы. Пры гэтым асабіста прытрымліваецца тэалогіі.

Б. Дабшэвіч (1722-1794) атрымаў адукацыю ў Навагрудскім езуіцкім калегіўме. У ім жа выкладаў філасофію, матэматыку, тэалогію. Выкладаў у Віленскай акадэміі. Па выніках лекцый выдаў дапаможнік «Погляды новых філосафаў» (1760). Прадметам разгляду сталі погляды Дэкарта, Лейбніца, Вольфа, Галілея, Гассендзі. Асноўную увагу надаваў выкладанню логікі. Выдаў дапаможнік «Лекцыі па логіцы, напісаныя на выснове адабральных думак старажытных і больш новых мысляроў для выкарыстання слухачамі філасофіі» (1761).

На яго думку філасофія можа быць дакладнай навукай толькі пры ўмове, што яна будзе прытрымлівацца цеснай сувязі з матэматыкай. Прыродазнаўства мае рацыю толькі тады, калі прызнае першавыснову Бога, як стваральніка прыроды.

К. Нарбут (1738-1807) атрымаў адукацыю ў піярскіх школах і у Віленскім калеўгіуме, а таксама ў і Італіі. Пасля вяртання ў ВКЛ выкладаў у Вільні. Выдаў школьны дапаможнік пад назвай «Логіка, альбо навука развужання і меркавання аб прадметах» (1769).

К. Нарбут лічыу, што філасофія і тэалогія маюць уласныя прадметы. Пры гэты тэалогія прысутнічае ў прадметным полі філасофіі. Філасофія можа разглядаць метафізічныя сістэмы новаеўра-

пейскай традыцыі. Асаблівую вагу ен надаваў творам Дэкарта і натуральнаму праву.

К. Нарбут супрацоунічау з Адукацыйнай камісіяй Рэчы Паспалітай пад час пераходу сістэмы адукацыі ў яе склад пасля роспуску ордэна езуітаў. Акадэмічная філасофія у XVIII стагоддзі распрацоўвалася І. Быкоўскім (1750-1810), І. Страйноўскім (1752-1815), К. Вырвічам (1717-1793), М. Карыцкім (1714-1781), К. Рагоўскім (1728-1810), Ф. Богуш (1746-1820), Ф. Галянскі (1753-1824).

Каталіцкі епіскап А. Нарушэвіч (1733-1796) спалучаў тэалогію з гісторыяй. Перакладаў Гарацыя, Тацыта. Больш відавочнай становіцца тэндэнцыя пашырэння ў тэкстах ролі новаеўрапейскай філасофіі. Гэта бачна па творчасці А. Доўгірда (1776-1835). Ен дае аналіз прац Юма, Локка, Канта, Кандыльяка. Пры гэтым ен трымаўся акадэмічнай традыцыі ў адукацыі. Акцэнт рабіў на выкладанне логікі.

Культура Асветы прынесла ў межы ВКЛ не толькі праявы прамысловай рэвалюцыі, але і інтэлектуальнае напружанне, абумоўленае пошукам адаказау на пытанні эканомікі, адукацыі. Гэтымі пытаннямі займалася эліта ВКЛ прадстаўленая А. Тызенгаўзам (1733-1785), А. Агінскім (1765-1833), А. Чартарыйскім (1770-1861). Важную ролю адыгрываў І. Храптовіч. Ен валодаў у Шчорсах адной з самых багатых па зборы бібліятэк. Яе паслугамі карысталіся І. Ляљевель, Ф. Малеускі, Я. Снядэцкі, А. Снядэцкі.

Мелі месца актыўныя пошукі рашэнняў у эканоміцы на выснове схаластычнай эканамічнай думкі М. Сарбеўскага, Л. Залускага, А. Алізаровіча, Т. Білевіча, М. Якубовіча, Я. Зноскі, Я. Вашкевіча, Ст. Буднага, С. Аскеркі.

Тэалагічны дыскурс вымушаны быў эвалюцыянаваць у накірунку канвергенцыі з дыскурсам натуразнаучых навук. Прыклад падобнай дзейнасці паказаў М. Пачобут (1728-1810). Ен актыўна займаўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі даследаваннямі ў галіне астраноміі. Для гэтага была пабудавана абсерваторыя. Яшчэ адзін прыклад падобнай дзейнасці даў Г. Форстэр. Французскі даследчык Ж.Э. Жылібер (1741-1814) пры фінансавай падтрымцы А. Тызенгаўза адкрыў у Гродне у 1775 годзе лячэбную акадэмію. У горадзе ен адкрыў акушэрскую ветэрынарную школу, клінічны шпіталь, батанічны сад. Кароткая па часе дзейнасць даследчыка прынесла вынікі ў выглядзе матэрыялаў аб прыродзе Беларусі. Навучальная ўстанова была пераведзена ў Вільню ў статусе факультэта

ўніверсітэта. Створаная кафедра натуразнауства стала высновай для навуковай школы. Паслядоўнікамі французскага даследчыка былі немец І.Г.А. Форстэр (1754-1794) і С. Юндзіл (1761-1847). Кафедра адыграла выдатную ролю ў станаўленні святова вядомай беларускай школы натуразнаучых даследчыкаў. У іх ліку І. Дамейка, І. Чэрскі.

Паслядоўнік М. Пачобута Ю. Міцкевіч (1744-1817) выкладаў у Віленскай галоунай школе фізіку на выснове механікі І. Ньютона. Ен спрыяў увядзенню механікі ў лік школьных прадметаў. Узніклі навучальныя ўстановы раместву і прамысловасці (Слонім, Слуцк).

Акрамя Вільні цэнтрамі адукацыі былі Гродна і Полацк. У Гродне знойдзены рукапісы філасофскіх і натуразнаучых трактатаў перыяду XVIII стагоддзя. Яны сведчаць аб суіснаванні тэалогіі і натуразнаўчых навук.

Буйным цэнтрам другой схаластыкі з 1812 года стаў Полацк. Пасля роспуску папай рымскім ордэна езуітау дзейнасць прадстанікоў ордэну з дазволу Кацярыны II сканцэнтравалася ў межах Расійскай імперыі. Цэнтрам сваей дзейнасці яны зрабілі Полацк па той прычыне, што тут былі багатыя традыцыі іх прысутнасці ў галіне адукацыі. З дазволу імперыятрыцы яны ў 1777 годзе адкрылі езуіцкі навіцыят. У 1782 годзе генеральным вікарыям яны абралі рэктара Полацкага калегіўма С. Чарневіча. Яго пераймальнікам на гэтай пасадзе быў Г. Лянькевіч. Яго змяніу Ф. Карэ, які даручэннем Папы рымскага стаў называцца генералам ордэна езуітаў. Пад такой назвай пасада перайшла да Г. Грубера, а пасля да Ф. Бжазоўскага, пасля смерці якога ў 1820 годзе дзейнасць ордэна на тэрыторыі Расійскай імперыі была забаронена.

Указам Аляксандра I у 1812 годзе Полацкі калегіўм быў надзелены статусам езуіцкай акадэміі. У акадэмію ўваходзіла бібліятэка, друкарня, музей, астранамічная зала, фізічныя і хімічныя кабінеты з унікальным абсталяваннем і экспанатамі, інтэрнат, тры факультэты. Выкладчыкі акадэміі арыентаваліся на патрэбы адукацыйнага рынку Расійскай імперыі. Гэтая адметнасць была важнай для расійскіх улад ва ўмовах паланізатарскага кансерватызму Віленскага ўніверсітэта, стаушага сацыяльнай базай пратэстнага руху за аднаўленне Рэчы Паспалітай. Менавіта гэты рух стаў прычынай закрыцця вышэйшых навучальных устаноу на тэрыторыі былога ВКЛ.

На філасофскім факультэце Полацкай езуіцкай акадэміі выкладаліся логіка, метафізіка, дыялектыка, этыка, палітычная эканомія, матэматыка, натуразнаучыя дысцыпліны, натуральнае права, усеагульная гісторыя. Працавалі выкладчыкі з Аустрыі, Прусіі, Італіі, Францыі, Швейцарыі. Выкладчыкаў з Беларусі прадстаўлялі В. Бучынскі, К. Глазко, С. Пятровіч, С. Рагоза.

Полацкая езуіцкая акадэмія, адкрытая ў 1812 годзе, вяла пастянную інтэлектуальную палеміку з калегамі з Віленскага ўніверсітэта, адкрытага расійскімі ўладамі ў 1803 годзе. Повад даў артыкул выкладчыка Полацкай езуіцкай акадэміі Н. Мусніцкага (1765-1805) пад назвай «Палтава».

На старонках «Віленскага дзенніка» разгарнулася палеміка, якая адлюстроувала пазіцыі дзвух навучальных устаноў. З віленскаіга боку быў Я. Стычынскі. Бок полацкай навучальні прадстаўляў В. Бучынскі (1783-1853). Ен меў выдатную адукацыю, атрыманую ў навучальных установах Аўстрыі, Бельгіі. Менавіта ў Аўстрыі па выніках чытання лекцый у Полацкай езуіцкай акадэміі В. Бучынскі выдаў трохтомную працу пад назвай «Філасофскія разважанні». Да палемікі Я. Стычынскага і В. Бучынскага далучыуся Д. Рышардо, які прадстаўляў Полацкую езуіцкую акадэмію. Артыкулы друкаваліся ўчасопісе «Полацкі штомесячнік».

Тэматыка дыскусій была вельмі шырокай. Яна была заснавана на аутарытэце тэалагічнага дыскурсу. У межах гэтага дыскурсу сістэму філасофіі прадставіў Ю. Анжыяліні (1747-1814) пад назвай «Філасофскія настаўленні». Крытычнаму разгляду падвергліся творы Спінозы, Канта, Вальтэра, Руссо. Увага крытыкі Полацкіх выкладчыкаў прыйшлася і на працы Я. Снядэцкага, прадстаўляўшага Віленскі ўніверсітэт. Той вымушаны быў даць крытычны адказ. Полацкая езуіцкая акадэмія была закрыта ў 1820 годзе загадам расійскага імператара. Прадстаўнікам ордэну было прадпісана пакінуць межы імперыі.

### *1.5. Нямецкая класічная філасофія ў інтэлектуальнай прасторы Беларусі*

Уплыу класічнай нямецкай філасофіі на тэалагічны дыскурс філасофіі ВКЛ меў пачатак у працэсе атрымання выхадцамі з Беларусі і Літвы адукацыі ва ўніверсітэтах Нямеччыны. У асноуным яны атрымлівалі юрыдычную адукацыю. Цеснае ўзаемадзеянне філасофіі ВКЛ з філасофскай традыцыяй Нямеччыны было абу-

моўлена геаграфічным суседствам, шматгаловай дзейнасцю Ганзы ў межах ВКЛ, рэфармацыйным рухам. Як выдома М. Лютэр і Ф. Скарына мелі асабістую сустрэчу наконт пытанняу супрацоуніцтва ў выдавецкай дзейнасці. Побач з межамі ВКЛ у Кенігсбергу з 1544 года працаваў універсітэт, у якім атрымлівалі адукацыю выхадцы з Беларусі і Літвы. Лютэранства атрымала распаўсюджанне ў ВКЛ, што спрыяла больш цесным духоуным кантактам суседніх народаў.

У ВКЛ практычна адразу рэагавалі на філасофскія распрацоукі мысляроў Нямеччыны. Сярод іх былі працы Лейбніца і Вольфа. У цэлым яны не пярэчылі канонам тэалагічнага дыскурсу дзякуючы ідэялістычнай сутнасці. Больш пытанняў выклікала філасофія Канта. Яна трапіла ў ВКЛ цераз паслядойнікаў нямецкага філосафа беларускага паходжання. Адным з іх быу С. Майман, які пакінуў межы Беларусі і стаў у Нямеччыне адным з лепшых крытыкаў філасофіі Канта.

Непасрэдна распаусюджаннем філасофіі Канта ў межах Беларусі і Літвы займаўся І. Быхавец. Ен слухаў лекцыі Канта ў Кенігсбергскім універсітэце. У Віленскім універсітэце прыхільнікамі Канта былі прафесар хіміі А. Снядэцкі, рэктары А. Чартарыйскі і І. Страйноўскі. Яны запрасілі ва ўніверсітэт паслядоўніка Канта прафесара філасофіі Эрлангенскага універсітэта І. Абіхта (1762-1816). Ен к гэтаму часу адзначыўся працай на тэму «Прагрэс метафізікі ад Лейбніца да Вольфа». На працягу дванаццаці гадоў пачынаючы з 1804 года прафесар выкладаў логіку, метафізіку, этыку, псіхалогію, уводзіны ў філасофію.

Паслядоунікамі І. Абіхта сталі Я. Баброўскі (1777-1823) і К. Шырма (1791-1866). Крытычнаму разгляду філасофію Канта падверг Я. Снядэцкі. На яго думку філасофія Канта ўтрымлівае чатыры памылкі. Першая памылка заключаецца ў тым, што адмаўляецца роля ў пазнанні пачуццяў. Другая памылка вынікае з таго, што рацыянальныя формы пазнання адрываюцца ад пачуццевых. Трэцяя памылка заключаецца ў апрыярызме. Чацвертая памылка абумоўлена складанай філасофскай тэрміналогіяй.

Яшчэ адным крытыкам філасофіі Канта быў А. Доугірд. У 1814 годзе ен напісаў трактат пад назвай «Філасофія Канта, альбо беспрыдзірлівае даследаванне яго сістэмы». Крытыка вядзецца з пазіцыі філасофіі сэнсуалізму. Нягледзячы на крытычны аналіз філасофіі Канта А. Доўгірд выкладаў яго падыходы да чалавека і культуры студэнтам Віленскага ўніверсітэта. Адным з яго студэнтаў

быў знакаміты паэт А. Міцкевіч. 4 лютага 1819 года ен выступіу з аналізам філасофіі Канта. Пазіцый нямецкага філосафа прытрымліваўся О. Яжоўскі, які ўзначаліў студэнцкае грамадскае аб яднанне філаматаў. Канціянскія акцэнты заключаліся ў арыентацыі студэнтаў на прыярытэт праблем чалавека і культуры. Яны былі засяроджаны на пытаннях этыкі, літаратурнага рамантызму, патрыятызму.

Крытыцы падвяргауся механіцызм і празмернае захапленне натуразнауствам. Патрыятызм звязвауся з захаваннем традыцый, з якімі асацыявалася Вялікае Княства Літоускае. Філаматам прадпісвалася вывучаць філасофскія трактаты Платона, Вальтэра, Русо, Маблі, Гельвецыя, Юма. Чытаць творы гісторыкаў, эканамістаў, палітычных дзеячоў, антычных аўтараў. Мэта была ў тым каб пазнаць сябе і мэты свайго існавання. Яны былі прыхільнікамі натуральнага права. У 1820 годзе філаматы стварылі яшчэ адно студэнцкае адгалінаванне, акцэнтаванае на захаванні традыцый. Пасля яго забароны было створана адгалінаванне філарэтаў. У 1823 годзе яно было забаронена. 108 студэнтаў было арыштавана. 20 з іх былі высланы загадам расійскага імператара за межы былога ВКЛ. Сярод іх былі А. Міцкевіч, Т. Зан, І. Дамейка, Я. Чачот.

Цераз кантаускую філасофію інтэлектуальнае асяроддзе Беларусі прыйшло да асэнсавання пытанняу гісторыі с пазіцый традыцыяналізму. Так лічыу М. Лавіцкі, Л. Трынкоускі. Пад уплывам твораў Гердэра І. Быхавец зрабіў спробу сістэматычнага разгляду сусветнай гісторыі. Падобныя меркаванні характэрны для твораў Ф. Бохвіца (1799-1856). З пазіцый тэалагічнага дыскурсу ен вядзе расповяд пра змены у грамадстве і пра выхаванне.

Акцэнты на гісторыю ў спалучэнні з патрыятычным рамантызмам далі вынік у выглядзе літаратурных твораў А. Міцкевіча. У іх тэалагічны дыскурс фарміруе светапогляд на Айчыну, на малую радзіму. Ен актуалізуе катэгорыі гонару, саслоунага этыкету, пашаны да прыроды і заведзенага часам вобразу жыцця. Новае ўспрымаецца ў прасторы культуры як штосці штучнае, не маючае аргументаў у параунанні з ужо існуючым вобразам жыцця.

Пасля Канта адчувальны уплыу на грамадскае асяроддзе былога ВКЛ зрабілі філасофскія сістэмы Шэлінга і Гегеля. Ю. Галухоўскі (1797-1858) знаходзіуся пад уражаннем філасофіі Шэлінга. Філасофія Гегеля стала прадметам крытычнага разгляду І. Галавінь-

скага (1807-1855). Метафізіка нямецкага філосафа была ў выснове прац па філасофіі гісторыі А. Марцінкоўскага і Э. Жэлігоўскага.

Ад Гегеля ўзяў пачатак марксізм пад уплывам якога Беларусь знаходзіцца да цяперашняга часу. У выніку нямецкая філасофія стала доўгатэрміновым інтэлектуальным фактарам эвалюцыі айчыннай філасофскай традыцыі.

### *1.6. Тэалагічная філасофія Беларусі на пераломе гістарычных эпохаў*

Па выніках паўстання 1831 года Віленскі ўніверсітэт быў закрыты. Працягвалі працаваць каталіцкая духоўная семінарыя і створаная на выснове факультэта маральных і палітычных навук, паколькі ў яго склад уваходзілі тэалагічныя кафедры, духоўная акадэмія. Яна рыхтавала ксяндзоў для прыходаў каталіцкага насельніцтва Расійскай імперыі. Выкладаліся мовы, Біблія, дагматыка, гісторыя Расіі. У 1842 годзе акадэмія была пераведзена ў Санкт-Пецярбург. З 1844 года пасля таго як яе наведаў Мікалай I акадэмія стала імператарскай.

У Санкт-Пецярбурзе паступова сабраліся прыхільнікі каталіцкага тэалагічнага дыскурсу. У іх ліку былі М. Маркіяновіч і І. Лабыжэўскі. Яны крытыкавалі мадэрнізм культуры. Узнік пецярбургскі кружок у які ўваходзілі І. Галавіньскі, М. Грабоўскі, І. Пржэцлаўскі, Г. Ржавускі, І. Штырмер. Творчая інтылігенцыя сабралася вакол «Пецярбургскага штотыдневіка» і часопіса «Рубон». Тэарэтыкам быў Г. Ржавускі (1791-1866), які абапіраўся на творы Луі дэ Бональда і Жозэфа дэ Местра. За аснову бралася тэалогія тамізму. Рэктар каталіцкай акадэміі ў Санкт-Пецярбурзе і магілеўскі мітрапаліт І. Галавіньскі трымауся пазіцый тамізму. Ен выступаў супраць філасофіі Гегеля. Такога ж падыходу прытрымліваўся выкладчык Свіслацкай гімназіі а пасля і прафесар Маскоўскага ўніверсітэта М. Якубовіч (1785-1853).

Палеміку з імі вялі прыхільнікі гегельянства, што гуртаваліся вакол часопіса «Атэнеўм», выдаваўшагася ў Вільні ў 1841-1851 гадах. Сярод аўтараў былі Ю. Крашэўскі, Э. Жэлігоўскі, Т. Шчанеўскі. Асабліва актыўна адстойваў і прагандаваў філасофію Гегеля Т. Данеўскі (1808-1880).

Калі адна частка каталіцкага грамадства Беларусі прытрымлівалася настальгіі па спрыяльных умовах што мелі месца ў ВКЛ, то другая частка грамадства ўзяла курс на канвергенцыю тэалагічнага

дыскурсу з філасофіяй нацыянальнай беларускай ідэнтычнасці. Падзеей стаў выдадзены ў 1850 годзе А. Аскерка буквар на беларускай мове. Важнасць гэтай падзеі адзначыў А. Станкевіч, паколькі пасля пачатковых беларусамоўных школау дзеці і юнакі працягвалі адукацыю ў той жа Санкт-Пецярбургскай рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі. Сярод прыхільнікаў беларусамоўнай адукацыі і службы ў касцелах у акадэміі вучыліся М. Пятроўскі, А. Цікота, А. Неманцэвіч, К. Лупіновіч. Намаганні былі накіраваны на тое каб тэалагічны дыскурс стаў беларусамоўным. Асаблівая роля ў гэтай дзейнасці належала ксяндзу А. Станкевічу (1891-1949). Яна стала прадметам даследавання В.М. Конана. Важнай крыніцай для разумення гісторыі станаўлення беларускага касцела стала праца А. Станкевіча пад назвай «Беларускі хрысціянскі рух».

На ўзроуні філасофскай тэалагічнай рэфлексіі Беларусі на пачатку XX стагоддзя гаворка ідзе аб пераходзе на пазіцыі неатамізму. Гэты пераход бачны ў творах Ф. Абрантовіча, Л. Гарошкі, Ч. Сіповіча, Я. Тарасевіча. У іх разважаннях адчувальны ўплыў Ж. Марытэна. Неатамізм засяроджваецца на экзыстэнцыі чалавека ва ўмовах татальнага нігілізму амаль ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

Умовы для тэалагічнага дыскурсу Беларусі ў XX стагоддзі былі складанымі, паколькі краіна была падзелена Рыжскай дамовай. Усходняя частка тэрыторыі знаходзілася пад уладай атэістычнай ідэялогіі марксізму-ленінізму. Ахвярай гэтага палітычнага рэжыму стаў дарэчы А. Станкевіч. Заходняя частка краіны была ў складзе Польшчы, адноўленай намаганнямі Пілсудскага. Паланізацыя беларускага грамадства не спрыяла філасофскай рэфлексіі ў жанры тэалагічнага дыскурсу.

Пасля 1939 года тэрыторыя Беларусі поўнасцю знаходзілася ў СССР з характэрнай для яго ідэялогіяй атэізму. Беларуская каталіцкая міграцыя на Захадзе змагла стварыць інфраструктуру беларускай культуры, дзякуючы такім энтузіястам як А. Надсан. Пасля распаду СССР беларускі касцел стаў аднауляць сваю дзейнасць, што запатрабавала часу. Найбольш яскрава погляд касцела на грамадскія праблемы сучаснага грамадства выказвае Т. Кандрусевіч. Крытыка прыходзіцца на пастмадэрнізм, які разбурае фундаментальныя каштоўнасці грамадства.

### *1.7. Дыскурс рускай рэлігійнай філасофіі*

Праваслаўнае насельніцтва Беларусі інстытуцыянальна адносіцца да рускай праваслаўнай царквы. Філасофская традыцыя гэтай царквы была актуалізавана ў XIX стагоддзі М. Федаравым пад назвай рускага касмізму, а таксама У. Салаўевым, імкнуушымся стварыць завершаную сістэму ментальнага катэгарыяльнага светапогляду рускага чалавека на фундаментальныя атрыбуты быцця, існасці. Гэтыя людзі лічылі сябе праваслаўнымі веруючымі. Яны непасрэдна не служылі. Пазней сярод прадстаунікоў рускай рэлігійнай філасофіі былі прадстаўлены святары. У іх ліку былі айцец С. Булгакаў і айцец П. Фларэнскі.

З ураджэнцаў Беларусі найбольшых вышыняў у распрацоўцы праблематыкі рускай рэлігійнай філасофіі дасягнуў М. Лоскі (1870-1965). Ен нарадзіўся ў Віцебскай губерніі. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Віцебску. Па прычыне атэістычных позіркаў пакінуў горад і выехаў у Швейцарыю дзе слухаў лекцыі на філасофскім факультэце Бернскага ўніверсітэта. З-за матэрыяльных цяжкасцяў служыў у французскім замежным легіене. У 1889 годзе вярнуўся ў Расію. Працягвау адукацыю ў Санкт-Пецярбурзе. Пасля заканчэння мясцовага ўніверсітэта атрымаў запрашэнне на працу ў навучальнай установе. Атрымаў ступень магістра і доктара філасофіі. Прыняў падыходы, характэрныя для рускай рэлігійнай філасофіі. Пасля рэвалюцыі 1917 года быў пазбаўлены кафедры за хрысціянскі светапогляд. У 1922 годзе быў высланы за межы Расіі. Жыў і працаваў у Чэхіі, ЗША, Францыі. Чытаў лекцыйныя курсы, актыуна выдаваў напісаныя творы.

М. Лоскі абапіраецца на хрысціянскі светапогляд пры разглядзе філасофскай тэматыкі. Перавагу ен аддае інтывітуізму, згодна якому сусвет мае адзіную арганічную выснову цэласнасці ў форме асобы, створанай, як і Сусвет Богам. Яго ўласная інтэрпрэтацыя філасофіі інтуітывізму апісанаа ім у творы пад назвай «Свет як арганічнае цэлае». Традыцыя ідзе ад Платона, які разглядаў эйдасы як асаблівы свет сутнасцей, не даступных пачуццеваму ўспрыняццю. Гэтая пазіцыя сугучна інтуітывізму А. Бергсона.

М. Лоскага займала канцэпцыя араганічнага светаразумення. Ен быў супраціўнікам атамізму. Для яго важную ролю адыгрывала цэласнасць, гарманічная сувязь і эвалюцыя. Паасобку не існуе сутнасцей, таму чалавеку як асобе неабходна быць пастаянна ўключаным у цэласнасць існуючага Свету. Мяняецца разуменне часу. Ця-

перашняе суіснуе з мінулым і будучым. Прыроднае і сацыяльнае дэманструюць цэласнасць у выглядзе космасу. У выніку катэгорыі этыкі і эстэтыкі атрымліваюць анталагічны сэнс. Дабро і прыгажосць інтэграваны ў царства Духа. Філасофія разглядаецца як храм у якім боскасць зыходзіць да чалавека і падзяляе яго радасць і цярпенні. Так рэалізуецца дасканалае Дабро і Прыгажосць. Адлюстраванне дае логіка, этыка, эстэтыка.

М. Лоскі напісаў дапаможнік па гісторыі рускай філасофіі, які доугія гады актыуна выкарыстоўваўся ў еўрапейскіх універсітэтах. Прадметам яго даследаванняў была філасофія Ф. Дастаеўскага. У ей гучала перасцярога па пытаннях, звязаных з распаусюджаннем нігілізму ў культуры. Хрысціянскія акцэнты былі важнымі на фоне феномену філасофіі Ф. Ніцшэ. Як вядома завочны спор Ф. Дастаеўскага і Ф. Ніцшэ стварыў цэлы накірунак палемічнай літаратуры. Ен меў працяг на Беларусі ў творах М. Бахціна, біяграфія якога звязана з Віцебскам.

У межах Беларусі напрыканцы XIX-пачатку XX стагоддзяў тэматыка рускай рэлігійнай філасофіі была цесна звязана з пытаннем дэмаркацыі цывілізацыйных плыняў у формах мадэрнізму і праваслаунага традыцыяналізму. Менавіта на гэтай тэматыцы быў засяроджаны Я. Окунь (Акунеў). Ен адвяргаў матэрыялізм. Ен лічыў, што толькі рэлігія здольная забяспечыць захаванне культурных традыцый. Яго творчасці спрыяла журналісцкая дзейнасць у газеце «Паўночна-Заходні край».

На яго думку тэалагічны дыскурс павінен быць больш сучасным. Яго трэба дапоуніць сацыяльнай філасофіяй. У падобным кантэксце напісаны творы выкладчыка Мінскай духоўнай семінарыі Д. Скрынчанкі. У 1908 годзе ў Санкт-Пецярбурзе ен выдаў твор пад назвай «Каштоунасць жыцця згодна сучаснаму філасофскаму і хрысціянскаму вучэнню». На яго думку толькі ў межах рэлігійнага вопыту магчымы пазітыуны адказ на пытанне аб сэнсе жыцця чалавека. Падобны адказ не дае філасофія М. Гартмана, Ф. Ніцшэ, Л. Таўстога, А. Шапенгаўэра. Маральныя каштоўнасці павінны разглядацца ў цеснай сувязі з рэлігійным вопытам.

Разглядаючы каштоўнасці жыцця Д. Скрынчанка звязвае іх з пэуным псіхалагічным станам асобы. Прычынай песімізму акрамя сацыяльных прычынаў з яуляецца страта сувязі сучаснай асобы з Богам. Аптымізм мае не жыццевую, а ідэялагічную выснову сацыяльнай веры. Такую веру дэманстравалі Ф. Ніцшэ і Л. Таўсты.

Сярэдні стан дэманструе меліярызм. Ен матывую чалавека катэгорыямі маралі. Але без Бога матывацыя не дае неабходнай высновы асобе. Д. Скрынчанка крытыкуе Я. Дзюрынга за атэізм і матэрыялізм. Крытыка прыходзіцца і на Д. Селлі, які робіць акцэнт на жыццевыя асалоды.

Значнае месца Д. Скрынчанка адводзіць філасофіі ідэнтычнасці. Ен напісау шэраг прац пра беларусаў у кантэксце разгляду іх у прасторы рускай праваслаунай культуры. Яго меркаванне засяроджана на тым, што беларусы не павінны падлягаць русіфікацыі, паколькі менавіта яны захавалі выснову грэка-візантыйскага праваслауя, базавыя каштоунасці ўсходнеславянскай цывілізацыі. Беларусаў ня трэба змешваць з палякамі. У 1907 годзе ў Мінску ен надрукаваў твор пад назвай «Заслугі, аказаныя старымі дваранскімі родамі Мінскай губерніі праваслаўнай веры». Ен адзначае ролю шляхты Мінска склаўшай у 1612 годзе духоўны наказ захоўваць праваслаўную веру ва ўмовах Контррэфармацыі. Складаныя гістарычныя ўмовы быцця беларусаў склалі выснову для твора «Трагедыя беларускага народа». Адначасова быў напісаны твор па культуры беларусаў пад назвай «Беларусы, іх вусная і кніжная мова ў свеце гісторыі».

Лес прадстаўнікоў рускай рэлігійнай філасофіі аказауся трагічным паколькі супаў са сталінскім перыядам савецкай гісторыі. Высланыя за межы Расіі мысляры засталіся ў жывых. Яны пазбеглі рэпрэсіяў. Тыя, што засталіся ў Расіі сталі ахвярамі рэпрэсіяў. Паколькі тэрыторыя Беларусі ўваходзіла і ў склад Польшчы то існавала магчымасць вымушанай міграцыі ў гэтую дзяржаву, нягледзячы на тое што там панавала каталіцкая царква.

Пасля распаду СССР руская праваслауная царква аднавіла свае інстытуцыянальныя пазіцыі ў Беларусі. Заключана пагадненне паміж гэтай царквой і беларускай дзяржавай. У структуры Беларускага дзяржаунага ўніверсітэта функцыянуе інстытут праваслаўнай тэалогіі. У яго склад уваходзяць багаслоускія кафедры. Штогод праводзяцца Кірыла-Мяфодзіяўскія чытанні ўдзел у якіх прымаюць прадстаунікі розных хрысціянскіх канфесій. Галоўная турбота царквы звязана з захаваннем традыцый. Гэтаму спрыяюць чытанні і канферэнцыі, прысвечаныя Е. Полацкай, К. Тураўскаму, праваслауным брацтвам, кнігадрукаванню і духоўнай асвеце.

Пазіцыі хрысціянскіх канфесіяў ураунаважаны палітыкай беларускай дзяржавы ў галіне рэлігіі і веравызнання. За кароткі тэрмін

праведзены шырокі спектр даследаванняў у галіне гісторыі праваслаўнай рэлігіі на тэрыторыі Беларусі.

У многіх людзей, у тым ліку і вучоных, узнікла жаданне вярнуцца да рэлігіі. Для вернікау вяртанне да царквы і касцела азначала трансфармацыю вобразу жыцця, у які вярнуліся хрысціянскія пасты, святы, міласэрнасць. Некаторыя вучоныя, такія як А. Вейнік (1919-1996) узялі на сябе рашучасць не толькі прыняць рэлігію ў вобразе праваслаунага хрысціянства, але і карыстацца тэалагічным дыскурсам пры напісанні кніг. Адсутнасць тэалагічнай адукацыі стварыла падставу для крытыкі як з боку багаслоускіх аутараў, так і з боку навуковай грамадскасці. Вучоны ў галіне цеплафізікі лі цейных працэсаў на выснове непрафесійных філасофскіх абагульненняу зрабіу акцэнт на распрацоўку новай натуразнаучай парадыгмы, у межах якой ен дайшоў да анталагічных высноў існасці ў выглядзе хранальных, метрычных, вярмічных з яу. Ен вымушаны быў пайсці на рызыковыя па магчымай рэакцыі вывады, абумоўленыя адсутнасцю адэкватнай для сучаснай фізікі інтэрпрэтацыі ў дыялектычным матэрыялізме катэгорыі матэрыі. Яна традыцыйна ў педагагічным выкладанні зводзіцца да аб ектыўнай рэчаіснасці пабудаванай мікраа бектнымі структурамі.

Гэтыя структуры генерыруюцца квантавым полем. Гэта ўказвае на тое, што прастора ў выглядзе матэрыяльнага асяроддзя на выснове электрамагнітных, гравітацыйных, ядзерных узаемадзеянняў канструіруе метрыку і храналогію фізічных працэсаў. Спадарожнікам гэтых працэсаў з яўляецца інфармацыя. Растлумачыць насычанасць і рознасць працэсаў у цэласным Сусвеце толькі з дапамогай матэрыяльных пачаткаў складана, паколькі застаюцца пытанні аб з явах, на якіх пакуль няма абгрунтаваных інтэрпрэтацый. У навуцы зауседы існавалі гіпотэзы і калянавуковая прастора гіпатэтычных інтэрпрэтацыяў. Але гэтая абставіна не дае права змешваць дыскурсы. Гэтае правіла парушыў А. Вейнік і стаў аб ектам крытыкі як навукоўцаў, так і багасловаў.

Яшчэ адну спробу звяртання да тэматыкі тэалагічнага дыскурсу ва ўмовах пасляатэістычнай эпохі ажыццявіла А. Гурко пад уплывам гараматалогіі Ж. Дэрыды і мадальнай метадалогіі Д. Зільбермана. Яна выдала твор на рускай мове «Божественная ономатология – именование Бога в имяславии, символизме и деконструкции» (2006). Зроблена заяўка на аналіз зыходных базавых канцэптаў сучаснай духоўнасці. Адным з такіх канцэптаў з яўляецца Бог.

А. Гурко зыходзіць з таго, што ў дыскурсе філасофіі Платон выпрацаваў тэорыю імя, якой прытрымліваліся Плоцін, Прокл. Тэалагічны дыскурс разглядае імя як імяслаўе Творцы. Гэта характэрна для Аэрапагіта, кападыйскіх айцоў царквы.

Акцэнт у даследаванні сутнасці імяслаўя Творцы А. Гурко робіць на грэка-праваслаўную традыцыю і рускую рэлігійную філасофію П. Фларэнскага, С. Булгакава, А. Лосева. Сімвалізм прадстаулены В. Івановым і Э. Касірэрам. Відавочны пераход цераз кампаратывістыку да сучаснай тэматыкі даследаванняу Ж. Дарыды, якія выходзяць за межы тэалагічнага дыскурсу і фактычна зводзяцца да разгляду такога канцэпту постмадэрнізму як дэканструкцыя у выглядзе аналізу мыслення пра Бога, дзеяння па прыкладу Бога, імявобразу Бога. Праблематыка імявобразу Бога разглядаецца ў якасці фундаментальнай прадпасылкі разумення сутнасці чалавека і мовы, якой ен карыстаецца і якая прадстаўляе яго светапогляд і практыкі жыццядзейнасці. А. Гурко стала прафесарам Бостанскага ўніверсітэта ў ЗША і атрымала магчымасць знаеміць студэнтау з новымі падыходамі да тэорыі імя на мяжы філасофіі і тэалогіі.

На Беларусі традыцыйную аснову аднавіу тэалагічны дыскурс праваслауных і каталіцкіх навучальных устаноў. Беларуская мова паступова становіцца элементам штодзенных службаў у касцелах і цэрквах У структуры БДУ функцыянуе тэалагічны факультэт. На канфэрэнцыях з удзелам хрысціянскіх канфесіяў абмяркоуваюцца агульныя пытанні біблеістыкі, захавання духоунасці ва ўмовах радыкальнай секулярызацыі грамадства. На змену таталітарным практыкам атэізму СССР у краінах Заходу прыйшлі дэмакратычныя практыкі сэксуальнай рэвалюцыі, аднаполых шлюбаў. Каталіцкую царкву патрэслі скандалы з айцамі-педафіламі. Ватыкан вымушаны павярнуцца да праблем веруючых у складаных для яго ўмовах грамадства ўсеагульнага карыстання і перагляду каштоўнасцей. Беларусь аказалася абароненай ад праблем касцела ў сучасным заходнім грамадстве дзякуючы канструктыўнаму працэсу вяртання да духоўнасці. Гэты канструктывізм адлюстроуваецца ў казаннях айцоў, іх мабілізацыі ва ўмовах вялікай аднаўленчай працы.

## 2. Практычны раздзел. Метадалогія крэатыўнай дзейнасці і творчасці

### *2.1. Дыялог філасофіі і архітэктуры ў культурнай традыцыі Беларусі*

Пачынальніцай дыялогу філасофіі і архітэктуры была Е. Полацкая, якая звязала дзейнасць сярэдневечнай полацкай школы дойлідства з тэалагічным светаўспрыняццем пад час прыняцця архітэктурных рашэнняў. Л. Богша таксама кіраваўся тэалагічным светаўспрыняццем у працэсе вырабкі крыжа, стаўшага духоўнай рэліквіяй Беларусі. Роспіс унутраных паверхняў храмаў фрэскамі быў магчымы дзякуючы таму, што мастакі былі веруючымі людзьмі.

З прыняццем хрысціянства на Беларусь прыйшла эстэтыка грэка-візантыйскай і заходнееўрапейскай архітэктурных традыцый. Яна праявілася ў дойлідстве, кнігадрукаванні, прыкладным мастацтве, іканапісу, фрэскавых храмавых роспісах. Каменнае будаўніцтва акцэнтавана на ролі храма ў паўсядзенным жыцці вернікаў, а таксама на абаронных задачах. Праваслаўныя прытрымліваюцца агульных канонаў грэка-візантыйскай архітэктуры ў спалучэнні з лакальнымі адметнасцямі, што відаць на прыкладзе полацкай архітэктурнай школы. Каталікі мясцовую традыцыю архітэктурнай школы вядуць ад нямецкіх аналагаў, паколькі першыя каталіцкія абшчыны на тэрыторыі Беларусі былі прадстаўлены ганзейскімі купцамі.

Абаронныя каменныя комплексы будаваліся па ўпрошчаным аналагам тэўтонскай замкавай архітэктуры. Яны размяшчаліся ў паўночна-заходняй частцы Беларусі, дзе праходзіла мяжа з Тэўтонскім ордэнам. Гэта замкі ў Навагарадку, Лідзе, Гродне, Крэве, Гальшанах, Міры, Несвіжы. Па меры фарміравання магнатэрый, атрымання гарадамі Магдэбургскага права складваліся архітэктурныя адметнасці сельскай і гарадской інфраструктуры. У сельскай мясцовасці, якая ўключала невялікія прыватныя гарады раслі амбіцыі магнатаў на стварэнне палацава-абаронных комплексаў з элементамі храмавай, свецкай забудовы. Гэтыя жаданні супалі з эпохай Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусі. Масавае распаўсюджанне атрымала кнігадрукаванне і звязанае з ім мастацтва дызайна літарнай і партрэтнай графікі. Яго магчымасцямі карыстаўся Ф. Скарына пад час выдання Бібліі.

У свецкім і храмавым будаўніцтве магнаты перавагу аддалі архітэктарам з Італіі. Дзякуючы Радзівілам была закладзена традыцыя прысутнасці італьянскіх дойлідаў на Беларусі. На Беларусі працавалі Э. Марконі, Дж.М. Бернардоні, Дж. Дэ Сакка, Э. Марконі.

Яны прынеслі на Беларусь архітэктурную культуру барока. Ва ўмовах Контрэфармацыі яна стала асноўнай, паколькі з прыходам у краіну езуітаў пачалося масавае будауніцтва каталіцкіх храмау. Пад уплывам архітэктуры барока аказаліся і праваслаўныя храмы.

Стылістыку барока актыўна выкарыстоўваў С. Полацкі (1629-1680). Катэгорыі эстэтыкі ен увеў у кантэкст тэалагічнага дыскурсу. На вяршыні сістэмы каштоўнасцей знаходзіцца Бог. Не меньшай вартасцю валодаюць яго тварэнні ў выглядзе прыроды і чалавека. Гэта і есць рэальная прыгажосць, якую адлюстроувае цераз дзейнасць чалавек. М. Сарбеускі (1595-1640) разглядаў эстэтыку як сродак чалавека рухацца да прыгожага і духоунага.

За адносна кароткі час сфарміраваліся культурныя алметнасці беларускага барока. Яны сталі прадметам даследавання і навуковых пошукаў А. Мальдзіса. Ен іх даследаваў на прыкладзе дойлідства, грамадска-філасофскай лірыкі, драматургіі, партрэту, гравюры, дэкаратыуна-прыкладнога мастацтва. У жанры партрэту працавалі Г. Хаецкі, Ф. Лекшыцкі. Вядомасць набылі гравюры братоў Тарасевічау. Магілеўскую гравюрную школу прадставілі бацька М. Вашчанка і сын – В. Вашчанка. Шырокае распаўсюджанне атрымалі езуіцкія тэатры і аркестры. Атрымаў развіцце феномен школьных тэатраў. Зфарміравалася барочная беларуская драматургія. Яе стваральнікамі сталі выкладчыкі езуіцкіх калегій. А. Бэнкен выдаў у Слуцку ў 1739 годзе зборнік песняў «Духоўная музыка». Магнаты і шляхта прытрымліваліся стылістыкі сарматызму. Вонкава яе прадстаўляу касцюм.

Полацкі сшытак засведчыў існаванне на Беларусі бытавой гарадской высновы барока. Астрамечаўскі рукапіс быў знойдзены А. Мальдзісам у Ягелонскай бібліятэцы. Ен складаецца з нотных тэкстаў двух соцен канцон і танцаў эпохі Адраджэння і ранняга барока. Аўтары твораў невядомы. Творы ствараліся на тэрыторыі Беларусі. У ліку творау шэйсят вакальных і інструментальных кампазіцый, напісаных у стылі барока. Творы выконваліся рознымі музычнымі інструментамі. У асноўным яны двугалосыя. Музыка есць хуткая і марудная па музычнаму тэмпу.

Тэалагічны дыскурс дамінаваў у форме барока на тэрыторыі Беларусі да сярэдзіны XVIII стагоддзя. Затым наступіў час пераходнай стылістыкі ў форме эклектыкі. Узнікла патрэба ў тэарэтычным асэнсаванні эстэтыкі ва ўмовах пераходнай да Асветы і класіцызму эпохі. Э. Славацкі (1772-1814) сістэматызаваў падыходы ў беларус-

кай эстэтыцы да мастацтва. Ен дэталева спыніўся на разглядзе катэгорыі эстэтычнага смаку. Па за межамі даследаванняў засталася беларуская народная культура, яе архітэктура, тэатр (батлейка), паэзія, музыка, рамествы, дойлідства.

За кароткі гістарычны тэрмін Беларусь стала месцам актыўных міжкультурных зносін, месцам працы дойлідаў з Італіі, Нямеччыны, Нідэрландаў, Фландрыі, Англіі, Польшчы. У іх ліку П. Нонхардт, К. Пенс, К.Ф. Пеппельман, Дж. Кларк, Ф.Г. Шахт, І. С. Беккер, Дж. Кварэнгі, К. Спампані.

Вялікую ролю ў станаўленні нацыянальнай беларускай школы выяўленчага мастацтва адыгралі Ш. Чаховіч (1689-1775), Ф. Смуглевіч (1745-1807), Я. Рустэм (1762-1835). Яны спалучалі барока з класіцызмам. Яны стварылі галерэю палотнаў. Ш.Чаховіч напісаў сорак чатыры палотны для Полацкай езуіцкай акадэміі. Ф Смуглевіч быў прафесарам Віленскага ўніверсітэта. На гэтай пасадзе яго справу прадоўжыў Я. Рустэм, які адкрыу пры ўніверсітэце мастацкую школу і загадваў ею. Яго вучнямі былі І. Аляшкевіч, В. Ваньковіч, Я. Дамель, Н. Орда, К. Русецкі, І. Хруцкі.

Па меры росту уплыву французскай культуры на Беларусі адбылася канвергенцыя барока і класіцызму. Французскія акцэнты былі абумоўлены ростам ролі ў Еўропе абсалютызму, уваходам тэрыторыі Беларусі ў Расійскую імперыю, надзеямі беларускай шляхты на аднаўленне ВКЛ з дапамогай Напалеона. У архітэктуры перавага стала аддавацца палацава-паркавым комплексам. Па меры аслаблення ролі тэалагічнага дыскурсу ў паўсядзенным жыцці магнатаў пазіцыі класіцызму мацнелі. Гэтаму ўзмацненню спрыялі творы ў асяроддзі італьянскіх дойлідаў. А. Паладзіо зрабіу акцэнт на антычную архітэктуру як эталон сучаснага будаўніцтва. Л. Гуцэвіч на гэтай выснове выпрацавау стыль строгага класіцызму і рэалізаваў яго ў шматлікіх пабудовах.

Строгі класіцызм трактавауся патрыятычна як форма ідэнтычнасці прыхільнікаў аднаўлення ВКЛ. Дойлідскія рашэнні расійскіх уладаў абапіраліся на ампір нават калі гаворка ішла пра будаўніцтва ваенных крэпасцяў у Бабруйску і Брэсці. Каталіцкія суполкі аддавалі перавагу неараманскаму стылю. Вынікам стаў чырвоны касцел (касцел святых Сымона і Алены) у Мінску. Будаўніцтва было завершана ў 1910 годзе. Аўтарам праекту быў польскі дойлід Т. Паяздзерскі. Развіцце атрымаў архітэктурны неакласіцызм дзякуючы таленту І. Жаўтоўскага.

Паланізаваная беларуская шляхта і магнацкія сем і актыўна развівалі інфраструктуру тэатраў, бібліятэк, паркаў, музыкі, карцінных галерэяў. Попыт на палотны матымаваў мастакоў на адлюстраванне краявідаў пад уражаннем любові да родных мясцін, мары аб аднаўленні дзяржаўнай незалежнасці. Адным з такіх мастацкіх творцаў і арганізатараў інфраструктуры культуры стаў Міхал Казімір Агінскі (1729-1800). Ен быў кампазітарам, паэтам, казачнікам, пісьменнікам, заснавальнікам тэатру ў Слоніме. Па яго заказу быў рэалізаваны праект архітэктурнай мадэрнізацыі Слоніма. У горадзе з явіліся мануфактуры, канал, культурныя ўстановы, тыпаграфія. Архітэктар з Італіі І. Мараіна пабудаваў будынак тэатра. Была створана сцэнічная механіка якая забяспечвала тэатральныя эфекты. У тэатры працавалі оперная, балетная, драматычная трупы, аркестр.

М.К. Агінскі граў на скрыпцы, арфе, кларнэце, фартэпіяна. Ен удасканаліу арфу і напісаў аб гэтым музычным інструменце артыкул у Энцыклапедыю Дзідро. У тэатры Слоніма працаваў мастаком Я. Рустэм. Менавіта Міхал Казімір Агінскі спрыяў мастацкаму станаўленню пляменніка Міхала Клеафаса Агінскага (1765-1833). Той пастянна бываў у Слоніме, дзе дзядзька наладзіў яму музычную адукацыю, якую ен прадоўжыў у Італіі у Дж.Б. Віоцці і М.Ф. Байса. Стау кампазітарам. Напісаў вядомы паланез «Развітанне з Радзімай».

Да практыкі мадэрнізацыі памесцяу і ўласных гарадоў звярнуліся Сапегі, Тызенгаўзы, Радзівілы, Храптовічы, Чапскія, а таксама расійскія ўласнікі беларускіх памесцяў. А. Тызенгаўз (1733-1785) ажыццявіў мадэрнізацыю Гродна і прадмесцяў. Былі пабудаваны дзесяткі мануфактур, аптэкі, адкрыты навучальныя ўстановы, батанічны сад, звярынец, медычная навучальная ўстанова, шпіталі. Была праведзена мадэрнізацыя Пастаў, дзе знаходзілася асноўная рэзідэнцыя сям і. К. Тызенгаўз (1786-1853) у палацы ў Паставах сабраў багатую калекцыю палотнаў. Болей за 600 экспанатаў. У ліку палотнаў былі творы Л. Да Вінчы, Я. Цінтарэтта, П. Рубенса, А. Дзюрэра, Х. ван Рэйн Рэмбрандта, беларускіх мастакоў – Я. Дамеля, Я. Рустэма, Ш. Чаховіча.

Палацава-паркавыя комплексы уключалі аранжарэі, тэатры, бібліятэкі. Затрачаныя сродкі на архітэктурныя праекты матывавалі уласнікаў на далейшыя дзеянні звязаныя са стварэннем калекцый прадметаў мастацтва, стварэннем тэатральных труппаў, бібліятэч-

ных збораў. Памесці ператварыліся ў цэнтры мастацкай і інтэлектуальнай дзейнасці. Не сталі выключэннем Радзівілы. Асаблівую ролю ў станауленні эстэтыкі Беларусі адыграла Ф. У. Радзівіл. Яна пашырыла бібліятэчны збор за кошт літаратуры рэлігійнай гісторыі, філасофскіх кніг. У стылістыцы сармацкай культуры ў палацыправодзіліся банкеты, маскарады, капэлы, феерверкі. У тэатры ставіліся драмы, аперэтты, оперы. Жанчына стала пісаць творы для пастановак. Першым творам стала камедыя «Востразумовае каханне» (1746). Адчуваўся ўплыў італьянскай камедыі. Аутарка распрацоувала дэкарацыі. У творах пераважае тэматыка кахання, гумару, сатыры. Пасля смерці Ф. Уршулі быў выдадзены збор яе твораў пад назвай «Komedye y Tragedye» (1754). У яго ўвайшлі шаснаццаць п есаў, сямнаццаць оперных лібрэтта.

Радзівілы ўнеслі значны ўклад у развіцце дызайна касцюма ў сармацкім стылі. На мануфактуры ў Слуцку яны наладзілі вытворчасць паясоў для мужчынскага касцюма. Пояс меў выключнае значэнне, паколькі падкрэсліваў сацыяльны статус таго, хто яго насіў. Для падкрэслівання гэтага статусу выкарыстоўвалася шытво залатымі ніткамі.

Сапегі разгарнулі мастацкую і архітэктурную дзейнасць у Ружанах. У 1770 годзе саксонскі архітэктар І.С. Бекер у стылі класіцызму пабудаваў палацавы комплекс з аранжарэяй, будынкам тэатру, англійскім паркам, бібліятэкай. Тэатр працаваў з 1765 па 1791 год. Бібліятэка налічвала багаты збор літаратуры.

Храптовічы пабудавалі ў стылі класіцызму палац у Шчорсах у 1776 годзе дзякуючы італьянскім архітэктарам Дж. Сакка, К. Спампані і французу Я. Габрыэлю. Палацавы ансамбль уключаў парк, бібліятэку. Фонд бібліятэкі быў настолькі значны, што ім карысталіся А. Міцкевіч, Я. Чачот, У. Сыракомля, а таксама даследчыкі з Віленскага ўніверсітэта. У ваколіцах функцыянавалі мануфактуры і заводы.

Чапскія ўклалі сілы і матэрыяльныя сродкі ў палацавы комплекс у Станькава. К. Гуттэн-Чапскі (1778-1836) асаблівую ролю надаваў збіранню мастацкіх каштоўнасцей. Ен займаўся нумізматыкай. У яго калекцыі было дванаццаць тысяч манет. Яго захапленне мастацтвам перайшло да графа Э. Чапскага, а ад таго да Кароля Чапскага. Апошні ўнес вялікі ўклад у развіцце гарадской інфраструктуры Мінску. Пад час яго кіравання гарадскімі ўладамі быў пабудаваны будынак тэатра, адкрыты ўстановы культуры. Быў актуалізаваны

спорт як вобраз жыцця, арганізаваны рух трамваяў, пабудавана электрастанцыя.

За кароткі час Беларусь набыла арыгінальны вонкавы пейзажны выгляд, які прывабіў Н. Орду (1807-1883). Род вядзе паходжанне ад татар. З 1833 па 1856 гады мастак жыў у Парыжы. Ен меў музычны талент і схільнасць да жывапісу. Сябраваў з Ф. Шапэнам, сустракаўся з Ф. Лістам, які яму параіў заняцца кампазіцыяй. Вынікам сталі музычныя творы і высокае фартэпіяннае майстэрства. Ен стаў займацца педагагічнай дзейнасцю. У 1843 годзе ен быў прызначаны дырэктарам італьянскай оперы ў Парыжы. У 1856 годзе ен вярнуўся на Беларусь. Ен прыняў удзел у падзеях, звязаных з паўстаннем 1863-1864 гадоў. Аказаўся ў турэмным зняволенні. Быў амніставаны ў 1867 годзе. Ен шмат часу аддавау жывапісу. Дзякуючы яму нашчадкі атрымалі каштоўную інфармацыю пра культурныя і гістарычныя пейзажы Беларусі.

Н. Орда рэалізаваў унікальны мастацкі праект візуальнай панарамы краіны. З гэтай мэтай ен падарожнічаў па Гродзенскай, Магілеўскай, Мінскай губернiях. Ен адлюстраваў сотні відарысаў архітэктурных помнікаў, гарадоў, мястэчак. У іх ліку сядзібы С. Манюшкі, А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, Ю. Нямцэвіча, Т. Нарбута, Т. Зана, І. Дамейкі, Я. Чачота.

У 1873 годзе Н. Орда выдаў у Варшаве дапаможнік пад назвай «Граматыка музыкі». Ен прысвяціў яго таленту С. Манюшкі. Той быў уражаны такой увагай. У 1882 годзе ў Варшаве былі выдадзены 14 паланезаў і некалькі песень у выглядзе зборніка, напісаных Н. Ордай. Ен стаў адным з заснавальнікаў Мінскага музычнага таварыства.

В. Ваньковіч (1800-1842) стварыў галерэю партрэтаў блізкіх сяброў па Віленскаму ўніверсітэту. Пад час прабывання ў Пецярбурзе ў 1828 годзе ен напісаў самае вядомае і блізкае па сяброўству палатно пад назвай «Адам Міцкевіч на скале Аю-Даг». З 1839 года мастак падарожнічаў па Еуропе. Памер у Парыжы. Побач знаходзіўся А. Міцкевіч.

Ад высновы беларускай сялянскай культуры вырасла беларусамоўная эстэтыка нацыянальнага тэатра, выяўленчага мастацтва. Ролю ў гэтым пераходзе адыгралі У. Сыракомля, В. Дунін-Марцінкевіч, С. Манюшка. Яны звярнуліся да сялянскай тэмы і да беларускай мовы. Паўстанне 1863-1864 гадоў замацавала тэндэнцыю ў фарміраванні нацыянальнай эстэтыкі.

Садзейнічала беларускай справе дзейнасць М. Баброўскага (1784-1848), вядомага даследчыка славянскіх культур. Ен разглядаў беларускую мову як адну з самастойных славянскіх моваў. Гэты вывад ен зрабіў на выснове даследаванняў на тэрыторыі Беларусі і ў Еуропе. У архіве і бібліятэцы Супрасльскага манастыра ен знайшоў летапіс XI стагоддзя. Выкладаў у Віленскім універсітэце. Меў магчымасць працаваць у бібліятэках універсітэтаў Італіі, Францыі. Даследаваў дзейнасць Ф. Скарыны, П. Мсціслаўца, І. Федарава, Ш. Фіоля. Быў членам Археалагічнай акадэміі ў Рыме, Азіяцкага аб яднання ў лондане і Парыжы.

К канцу XIX стагоддзя для таленавітых юнакоў стау відавочным перыферыйны адукацыйны статус Беларусі ў Расійскай імперыі. Падобная сітуацыя складвалася і ў сферы мастацкай адукацыі. Пачатковую інфраструктуру гэтай адукацыі прадстаўлялі мастацкія школы. Яны функцыянавалі ў Віцебску, Мінску, Вільні. Менавіта на іх выснове адбылося першапачатковае прафесійнае станаўленне беларускіх прадстаўнікоу Парыжскай мастацкай школы. Гэтая школа ўзнікла на Монпарнасе які быў даступны па жытлу, здыму арэндных рамяшканняў для мастацкіх майстэрняў. Мастакі разлічвалі на растучы камерцыйны рынак мастацкіх каштоўнасцей. Гэтаму рынку спрыяу вобраз жыцця еўрапейцаў, заснаваны на бытавым камфорце, жаданні калецыяніраваць мастацкія творы прыкладной і абстрактнай накіраванасці. Бытавыя і высокамастацкія інтарэсы стварылі сітуацыю эклектыкі ў якой сфарміраваўся мадэрн.

Творцы шырока выкарыстоувалі элементы раманскага стылю, готыкі, неакласіцызму, рацыяналізму, іррацыяналізму. Актыўна вывкарыстоўваліся элементы культуры Японіі, Блізкага Усходу. Бытавы камфорт быў разлічаны на грамадскую буржуазную свядомасць, адчуваўшую растучую рызыку сацыяльных канфліктаў. У гэтай сітуацыі быў заказ на тямнічае, містычнае, эратычнае, меланхалічнае ўспрыняцце рэчаіснасці з улікам цялеснай асалоды. На гэтым фоне сацыяльная бяздзейнасць маскіравалася пад душэўную стомленасць.

Відавочны быў інтарэс да іншых культур. Гэтым інтарэсам скарыстаў С. Дзягіляў у форме культурнага праекта рускіх сезонаў. Прадстауленні адбыліся ў Парыжы і Лондане. У Парыжы яму дапамагаў ураджэнец Беларусі Л. Бакст (1866-1924). Ен быў мастаком, сцэнографам, ілюстратарам, дызайнерам. Выдатным майстрам

станкавага жывапісу і тэатральнай графікі. У кантэксце мадэрну фарміраваў еўрапейскую моду на экзотыку і арыенталізм. Быў удзельнікам аб яднання «Мір мастацтва». Жыў і працаваў большай часткай у Пецярбурзе і Парыжы. Быў вольным слухачом Акадэміі мастацтваў у Пецярбурзе. У 1889 годзе прыняў удзел у мастацкай выставе. Напісаў партрэты А. Бенуа, А. Белага, В. Разанава, С. Дзягілева. У 1893-1897 жыў у Парыжы. У 1898 годзе прыняў удзел у «Першай выставе расійскіх і фінскіх мастакоў», выставах «Свет мастацтва», «Secession». У Пецярбурзе працаваў да 1909 года. Выкладаў у школе Е. Званцавай. Адным з яго вучняў быў М. Шагал. З 1910 года і да смерці жыў і працаваў у Парыжы. Ен актыўна працаваў над тэатральнымі дэкарацыямі ў рамках дзягілеўскага праекта Ballets Russes. Гэта былі балеты «Клеапатра», «Шахерэзада», «Жар-птушка», «Карнавал», «Нарцыс», «Дафніс і Хлоя», «Спячая прыгажуня».

Пры працы над сцэнічнымі касцюмамі і тэатральнай бутафорыяй Л. Бакст актыўна вывучаў антычную, бліскаўсходнюю, еўрапейскую, егіпецкую, расійскую культуры. Гледачоў уразіла стылістыка колеру і ценю, смеласць творчых рашэнняў. Пры падрыхтоўцы спектакляў Л. Бакст рабіў шмат графічных замалевак. Малюнкі тканін і мадэлі касцюмаў зрабілі вялікі ўплыу на развіцце еўрапейскай моды. Ен напісаў партрэты А. Паўлавай, М. Фокіна, І. Рубінштэйн, К. Дэбюссі, Ж. Кокто.

Арыстакратызм мадэрна маскіраваўся спалучэннем матэрыяльнай дастатковасці з імітацыяй прастаты і арганічнасці вобразу жыцця. Адсюль раслінная тэматыка дэкору. Прыхільнікі вяртання да традыцыйных рамесстваў прапаноўвалі такім чынам захаваць творчы і індывідуальны характар мастацтва. Тэарэтыкам падыходу быў Дж. Рэскін, прыхільнікам прыкладной метадалогіі – У. Моррыс. Арганічнасць звязвалася ў графіцы з хвалепадобным узорам (А. Макмуда). Прыхільнікі рамесстваў адкрывалі цэнтры вытворчай дзейнасці, але яны няздолелі канкурыраваць па кошце выробленых твораў з масавай вытворчасцю тавараў на прамысловых прадпрыемствах. У архітэктуры раслінны дэкор і арганічнасць атрымалі распаўсюджанне ў Бельгіі і Каталоніі. Цэнтрам архітэктурнага мадэрну стала Барселона.

Побач з мадэрнам зфарміраваўся мадэрнізм, які быў арыентаваны на радыкальныя рашэнні ў розных галінах жыццядзейнасці грамадства. Адчуваўся ўплыў анархісцкіх, сацыялістычных і ка-

муністычных ідэй. Прыхільнікі гэтых ідэй у мастацтве і дызайне імкнуліся ў Парыж. Асноунымі краінамі, дзе ўзнік авангард былі Іспанія, Італія, Расія. У гарадской рысе Парыжу мадэрн і мадэрнізм паралельна суіснавалі. Тут было шмат выставачных галярэяу і былі пакупнікі мастацкіх твораў.

Свой шлях у Парыж праклалі дзесяткі таленавітых мастакоў з Беларусі. Паколькі многія з іх былі этнічнымі яўрэямі, то яны мелі цяжкасці з мастацкай кар’ерай у Пецярбурзе з-за цэнзу аседласці. У іх ліку былі Я. Баўглей, Р. Генін, Л. Ідэльбаўм, Я. Зак, М. Кікоін, П. Крэмень, О. Мяшчанінаў, Я. Мілкін, І. Левін, О. Любіч, А. і Н. Пэўзнеры, Х. Суцін, М. Шагал, О. Цадкін, Ш. Царфін, Л. Шульман, Н. Хадасевіч-Ляжэ.

Пачаткова іх творчыя біяграфіі фарміраваліся ў Беларусі, дзе яны атрымлівалі пачатковую мастацкую адукацыю ў школах студыях Мінска, Віцебска, Вільні. З імі працавалі вядомыя мастакі, такія як Ю. Пэн, Я. Кругер (восем гадоў пражыў у Парыжы), І.А. Трутнеў.

Х. Суцін, М. Кікоін, П. Крэмень адчулі значны ўплыу віленскай малявальнай школы І. А. Трутнева. Сярод іх П. Крэмень вылучаўся філасофскай абгрунтаванасцю выбару парадыгмы жывапісу. Выбар быў зроблены на карысць Сезана і на карысць эмпрысіянізму. М. Кікоін гэты выбар рэалізаваў да статуса прынца жывапісу. Х. Суцін у адрозненне ад сяброў знаходзіўся ва ўладзе сінергіі пастаянных матэрыяльных цяжкасцей, неарганізаванасці і не ўпарадкаванасці асабістага жыцця. Фрагментарнасць перыяду недахопу матэрыяльных сродкау давала нечаканыя тэмы для палотнаў. Прыход поспеху не змяніу стылістыку мастака. Яго жыцце праходзілў у экстрэмальным рэжыме, звязаным з пастяннай рызыкай трапіць у нацысцкі канцэнтрацыйны лагер і адсутнасцю ўнутранай сілы волі для трансфармацыі вобразу жыцця, міграцыі ў ЗША дзе жыла яго сястра.

Асаблівую ролю ў фарміраванні эстэтычных традыцый мадэрнізму на Беларусі адыграла Віцебская мастацкая школа. У гэтым горадзе нарадзіўся М. Шагал. Тут атрымаў першапачатковую мастацкую адукацыю Щ. Цадкін, які стаў сусветна вядомым скульптарам. Ен спалучаў кубізм з мяккімі пластычнымі тэхнікамі адлюстравання скульптурных вобразаў. У 1953 годзе ен стварыў помнік «Разбураны Роттэрдам», які зрабіў яго сусветна вядомым скульптарам. Ен з яўляецца аўтарам помніка братам Ван-Гогам. Яго жыцце прайшло ў США і Францыі.

Першапачатковую мастацкую адукацыю М. Шагал атрымаў у Ю. Пэна. Пасля працягвау адукацыю ў Пецярбурзе. Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года вярнуўся ў Віцебск з рэвалюцыйнымі паўнамоцтвамі ў галіне культуры. Адкрыў у Віцебску мастацкае вучылішча, а таксама філіял у Смаленску. Працаваць запрасіў К. Малевіча. Абое былі прыхільнікамі руху да новага грамадства. Аднак пры афармленні агітацыйных рашэнняу іх пазіцыі не супадалі. К. Малевіч поўнасцю адмовіўся ад фігуратыунага мастацтва. На ачышчанай ад яго выснове ен веў практычны і тэарэтычны пошук новых форм адлюстравання рэчаіснасці. У выніку прыйшоў да супрэматызму. Пад якім разумеецца свабода ад наследства прадметнага свету. Мастак прыйшоў да безпрадметнасці. Яна ўспрымаецца ім як пустэча, поўная адсутнасць аб ектаў у свядомасці. Вызваленая ад прадметнасці свядомасць канцэнтруецца на быцці.

Глыбінныя пошукі К. Малевіча мелі не столькі суб ектыуныя колькі аб ектыуныя прычыны. У выяуленчага мастацтва з явіліся канкурэнты ў выглядзе тэхнікі фотаздымкаў, кінематографа, серыйнай прамысловай тыпаграфскай дзейнасці. Яны адлюстроўвалі вонкавую прадметнасць з высокай якасцю. Выяўленчае мастацтва ў такіх умовах шукала новыя для сябе сродкі прысутнасці на рынку попыту. Мадэрнізм зрабіў выбар на карысць інтэлектуальнай дзейнасці, у межах якой ен мог займацца самастойнымі пошукамі. Але нельга было ігнараваць і фактар адваротнай сувязі з масавай аўдыторыяй. Каб прыцягнуць увагу да сябе і трымаць яе на сабе выкарыстоўваліся формы скандалаў, дыскусій. К. Малевіч сувязь з грамадствам забяспечваў цераз рэгулярныя вулічныя выставы агітацыйных мастацкіх твораў у стылістыцы рэвалюцыйнага плакату. Гэта дазваляла сумяшчаць тэарэтычную дзейнасць з агітацыйнай і выкладчыцкай дзейнасцю.

Калі К. Малевіч (1879-1935) прыехаў у Віцебск у 1919 годзе ў мастацкае вучылішча, то ен ужо выпрацаваў уласнае разуменне супрэматызму. Аб гэтым сведчаць яго творы «Ад'кубізму і футурызму да супрэматызму», «Супрэматызм». Разуменне супрэматызму азначала поуную перамогу чыстага пачуцця над прадметным светам. Адбылося выйсце за межы прадметнага свету. Чорны квадрат адлюстроўвае геаметрычную выснову прадметнасці. Гэта значыць, што за фенаменалагічным светам прадметаў есць яшчэ адна

прадметнасць, але ўжо прадметнасць не пачуццевая. Калі рухацца далей то можна трапіць у пустэчу пустэч.

К. Малевіч адкрывае новую парадыгму існасці. Яна заключаецца ў тым, што пустэча з яуляецца фундаментальнай катэгорыяй быцця. Пакуль яна не звязана з прадметнасцю яна не звязана з часам. Як толькі яна генерыруе прадметнасць у выглядзе форм яна актуалізуе феномен часу. Важна даследаваць саму пустэчу, адной з форм адлюстравання якой стаў чорны квадрат. У ім адлюстраваны нуль спакою, нулявая форма. Як толькі падобная стадыя свядомасці дасягнута адкрываюцца магчымасці творчасці чыстага дзеяння, у якім адлюстравана ўсеагульная ўзбуджанасць свету, узбуджанасць без мэты, без прадметнага ўяўлення аб прасторы і часе. Дасягаецца сітуацыя канвергенцыі дзеяння і спакою.

К. Малевіч актыўна карыстаецца сродкамі тэалагічнага дыскурсу. Сваю ідэю мастацкага творцы ен тлумачыць па аналогіі з дзейнасцю Бога. На яго думку Бог задумаў пабудаваць прадметны свет каб дасягнуць спакою ад факту завершанасці створанай рэчаіснасці, яе дасканаласці. Перад адкрыўся спакой, паколькі прадметны свет набыў завершанасць. У дадзеным выпадку гаворка ідзе не пра хрысціянскі дыскурс, а пра стылістыку дыскурса, якая павінна зрабіць зразумелай ідэю спакою. У гэтым спакоі мастацкі творца карыстаецца сутнасцю жывапісу сродкамі вызваленай фарбы, вызваленага руху, вызваленай пустэчы, вызваленай геаметрычнай формы. Ен дачыняецца да вызваленага існавання існасці. Выяўляюцца бясконцыя магчымасці колеру ў дынаміцы.

Чысты жывапіс набірае дынаміку. Ен вызваляецца ад колеру. Пачынаючы з Белага квадрата напісана серыя прац «белае на белым». Сінтэз этапаў паказаны на выставе ў 1920 годзе. За чорным, каляровым, белым супрэматызмам выстаўлены пустыя габелены. Спатрэбілася аэранаўтыка каб можна было арыентавацца ў беспрадметнасці. Быў распрацаваны аэрадынамічны супрэматызм з элементамі прадстаўленымі аэрапланамі, архітэктонамі, планітамі. У прасторы ўзнікла выява белага Сусвету з аб емістымі архітэктонамі і пласкаснымі планітамі. Зададзеная метрыка распрацавана на сялянскай тэме ў карцінах «Сялянка», «Дзяучына ў полі», «Складанае прадчуванне». Гэта плоскасці ў двух вымярэннях і аб емістыя канструкцыі, заземленыя пад цяжарам. Беспрадметны свет адлюстроувае вока, якое не ведае гарызонту, успрыняцце адбываецца ў варыяцыях вымярэнняў.

Свет канструіруецца з простых геаметрычных формаў і простых арыфметычных дзеянняу. Складваннем і памнажэннем трохкутніка з трохкутніка, чатырохкутніка, круга узнікаюць супрэматычныя кампазіцыі на розныя тэмы.

Геаметрызм дапамог К. Малевічу застацца ў прадметнасці і засяродзіць увагу на стылістыцы мастацкай творчасці, у тым ліку агітацыйнай. К. Малевічу ўдалося перацягнуць на свой бок значную частку выкладчыкаў Віцебскага мастацкага вучылішча. Быў створаны УНОВІС. М. Шагал застаўся ў меньшасці. Ен не змог прыняць стылістыку безпрадметнасці і кубізму. Ен жыў вобразам роднага горада ў прадметных дэталях, запаўшых яму ў душу. Мадэрнізм для яго асацыяваўся з фігурнасцю, якая мела прысутнасць у прасторы жорстка не фіксаваную. Фігуры лятаюць у паветры і такім чынам выказваюць большы сэнс, чым фатаграфічны здымак. Гэта адлюстраванне стану свядомасці, зачараванай феноменам малой разімы. Гэта фігуратыунасць у каардынатах няжорсткай тапалагічнай дэтэрмінацыі. У гэтым стылі адкрываецца магчымасць бачыць настальгічныя перажыванні чалавека. М. Шагал пакінуў Віцебск і накіраваўся ў далекае падарожжа, якое закончылася ў Парыжы. Атрымаўшы перамогу К. Малевіч таксама пакінуў Віцебск.

Мадэрнізм суседнічаў у беларускім мастацтве з моцна ўкараненай школай жывапісу. Гэтая школа працягвала тадыцыі класічнага выяўленчага мастацтва. У ліку мастакоў былі В. Бялыніцкі-Біруля, М. Станюта, Е. Мінін, З. Астаповіч-Бачарова. Яны адлюстроўвалі родныя ім пейзажы гарадоў і наваколіцы. Пейзаж дапоўніўся жанрам партрэту. Выдатным пейзажыстам быў С. Жукоўскі (1875-1944), які вымушаны быў уступіць рэвалюцыйнаму рускаму авангарду і выехаць у Польшчу. Трагічны лес напаткау Р. Семашкевіча (1900-1937). Ен быу рэпрэсіраваны. У стылістыцы гарадскога пейзажу працаваў М. Аксельрод.

Славутыя традыцыі беларускай мастацкай эстэтыкі прадоўжылі сусветна вядомыя М. Бахцін і Л. Выгацкі. М. Бахцін працаваў у Віцебску выкладчыкам. Ен пераехау ў горад з Невеля, дзе пры яго ўдзеле ўзнікла інтэлектуальная суполка, якая абапіралася на філасофскія ўплывы твораў нямецкіх неаканціянцаў, М. Бубера. Ключавым стала паняцце дыялогу. Яно давала перспектыву захавання статусу мастацтва ў грамадскай свядомасці. М. Бахцін звярнуўся да тэматыкі карнавалу, форм народнай сярэднявечнай, рэнесанснай культуры. Ен упэуніуся, што мастацтва з яўляецца сродкам дыялогу

людзей у абставінах не падуладных сістэме каардынат. Есць перыядызацыя, а есць формы камунікацыі, якія захоуваюць свой анталагічны статус у любой сістэме каардынат. Гэта народны гумар, народны тэатр, гэта бытавая ментальнасць, якая складаецца з учынкау і іх адлюстраванняў. Канцэпт учынку стаў адным з ключавых у творах М. Бахціна.

Л. Выгацкі пад уплывам культуры сярэбранага веку засяродзіў сваю увагу на псіхалогіі мастацкай творчасці. Ен нарадзіўся ў Воршы, з бацькамі пераехаў у Гомель і захапіуся псіхалогіяй. Ен атрымаў юрыдычную адукацыю ў Маскве. Вярнуўся ў Гомель. Займаўся педагагічнай дзейнасцю ў мясцовым тэхнікуме. Тут ен адкрыу псіхалагічны кабінет. Ен праводзіу эмпірычныя даследаванні ў выпускных класах горада. Вывучаўся аспект настрою навучэнцаў. Гэта была заяўка на вывучэнне псіхалогіі развіцця асобы ва ўмовах узроставых крызісаў. Вынікі даследаванняў былі прадстаўлены на навуковай канферэнцыі ў Маскве. Па выніках выступу атрымаў прапанову пераехаць у Маскву ў інстытут псіхалогіі. Узмацненне культурнай дамінанты ў яго даследаваннях выразілася ва ўвазе да ролі дыялогу. Вучоным напісаны працы па адметнасцям культурнай кампаненты ў структуры псіхікі. Гэтыя вынікі далі падставу для разгляду паняцця доўгатэрміновай стратэгіі сацыялізацыі творчай асобы ў кантэксце канкрэтнага культурнага заказу. Была актуалізавана тэматыка даследаванняў у галіне крэатыўнай псіхалогіі мастацкай дзейнасці.

Л. Выгацкі распрацаваў культурна-гістарычную тэорыю свядомасці чалавека. На выснове гэтай тэорыі ен ажыццявіў канвергенцыю псіхалогіі, сацыялогіі, эстэтыкі. У творы «Псіхалогія мастацтва» ен падрабязна разгледзеў феномен эстэтыкі. Твор уключае крытыку спекулятыунай эстэтыкі, абмяжоўваючай мастацтва механізмамі рацыянальнай рэфлексіі. Пад крытыку трапіў эстэтычны фармалізм, які патрабуе аддаваць перавагу канструкцыям і шаблонам. Прадметам крытыкі стаў псіхааналіз, паколькі ен абмяжоўваецца інстынктамі і не ўлічвае сацыяльна-культурных фактараў мастацкай дзейнасці. Творчасць зводзіцца да ўмення рэалізаваць тэмы сугучныя сэксуальнасці, дарэфлексіўным пачуццям.

Падрабязна даследавана эстэтычная рэакцыя ў кантэксце дыялогу творцы і гледача. Сцвярджаецца тэза, што ацэнка мастацтва залежыць ад псіхалагічнага разумення з якім мы падыходзім да яго. Мастацтва бярэ матэрыял з жыцця і дае гледачу, што ў матэрыяле

не ўтрымліваецца. Гэта творчы акт мастака. Вось чаму ўспрыняцце мастацтва патрабуе творчасці каб разабрацца ў структуры твора, пераадолець пачуцце, знайсці яго катарсіс. Гэта не азначае адыход ад эмацыянальнай кампаненты. Гэта азначае тое, што яна пагружаецца ў кантэкст дадзенай гістрачнай эпохі і з высновы герменэутыкі дае паунату значнасці кантакту з мастацкім творам. Эстэтычныя пачуцці з яўляюцца сацыяльна-абумоўленымі пачуццямі.

У кантэксце нацыянальнай ідэнтычнасці развівалася эстэтыка другога беларускага адраджэння. Яна была арыентавана на нацыянальны тэатр, музыку, выяўленчае мастацтва. Частка выпускнікоў малявальных школаў Мінска і Вільні прысвяціла сябе станаўленню новабеларускай культуры. Акцэнт быу зроблены на рэалізм народнага мастацтва, сялянскай культуры. Гэта дазволіла нацыянальнай эстэтыцы прайсці адаптацыю ва умовах СССР да канонаў сацыялістычнага рэалізму. Ратавала дамінуючая тэма быту народа, яго змагання за лепшае жыцце, адлюстраванне поспехаў у камуністычным будаўніцтве.

Фарміраваліся нацыянальныя школы опернага, камернага, балетнага мастацтва, апярэтты, джаза. У 1920 годзе на выснове «Першага таварыства драмы і камедыі» (кіраўнік Ф. Ждановіч) адкрыты Беларускі дзяржаўны тэатр. У ім працавала С. Станюта. З 1926 года да назвы тэатра прыставілі лічбу 1, паколькі акадэмічныя тэатры былі адкрыты ў Віцебску і ў Гомелі. У 1930 годзе вядомы саліст Марыінскага тэатру А. Банючыч адкрыў у Мінску дзяржаўную студыю оперы і балета. У яе перайшлі з Беларускага дзяржаўнага тэатру 1 салісты оперы, харавыя і балетныя труппы, сімфанічны аркестр. Архітэктар І. Лангбард прапанаваў праект будынку для тэатра оперы і балету ў Мінску. У 1933 годзе операй «Кармэн» быў адкрыты Дзяржауны тэатр оперы і балету. Галоўную партыю выканала Л. Александроўская. Фарміравалася інфраструктура кіназдымачнай дзейнасці, фотастудый. Атрымаў развіцце ландшафтны дызайн. Прадметам творчасці сталі гарадскія паркі, батанічны сад, узбярэжжа ракі Свіслачы. У спецыяльна пабудаваным будынку функцыянавала нацыянальная бібліятэка. Архітэктурнай адметнасцю Мінска стаў будынак Дома ўраду.

Частка скульптараў і мастакоў вандравала ва ўмовах цывілізацыйнага і ідэялагічнага разлому, які праходзіу па тэрыторыі Беларусі, сярод іх Я. Драздовіч (1888-1954). Ен нарадзіўся ў цяперашнім Міерскім раене. Мастацкую адукацыю атрымаў у Вільні, у маля-

вальнай школе І. Трутнева ў 1906-1910 гг. Радзіму не змог пакінуць. Валодау талентам жывапісца, графіка, скульптара, пісьменніка, фальклартыста, даследчыка. На спалучэнні стылістыкі жывапісу, філасофіі і навуковай фантастыкі рэалізавау арыгінальную канцэпцыю касмізму.

Займаўся кніжнай графікай, у якой ажыццявіў канвергенцыю стылістыкі беларускага фальклору са стылістыкай мадэрну. Афармляў выданні К. Буйло, А. Грыневіча, уласную аповесць «Гарадольская пушча». Стварыў графічную серыю замкавай архітэктуры, беларускай прыроды, местачковай культуры. Як скульптар стварыў вобраз Ф. Скарыны, кампазію «Плач Гарыславы».

Цярпеў ад матэрыяльных цяжкасцяў. Гэтая абставіна адкрыла яшчэ адзін талент творцы. Ен пісаў кауры. Пастаянны пошук заказчыкау зрабіў яго мастаком-вандрауніком і этнолагам. Ен запісваў народныя песні, збіраў і апрацоўваў для слоўнікаў лексіку народнай мовы. Замалеўваў прадметы сялянскага быту, прывычкі, жытло, прадметы працы. За серыю малюнкаў ен атрымаў прэмію акадэміі навук СССР. На адной з беларускіх дарог у 1954 годзе ен фактычна і памер.

Крыніцай творчага зместу для Я. Драздовіча сталі сны. Яны мелі футуралагічную накіраванасць. Адзін накірунак тычыўся касмічнай тэматыкі. У выніку акрамя мастацкіх палотнаў пра жыхароў Венеры, Марса, Сатурна, ім былі напісаны кнігі па астраноміі, уключаючы працы «Тэорыя руху ў касмалагічным значэнні», «Гармонія планетаў Сонечнай сістэмы». Ен зрабіу малюнак шматступеньчатай касмічнай ракеты са спадзяваннем на касмічныя падарожжжы і кантакт з іншапланецянамі. На палотнах ен стварыў візуальныя вобразы жыхароў Марса, Месяца, Сатурна.

Другі накірунак зместаў тычыўся зямной будучыні чалавецтва. Змест сноў адлюстраваўся на палотнах «Дух цемені», «Дух зла». Гэтыя зместы актуалізаваліся напярэдадні і ў час Вялікай Айчыннай вайны. Пошукі мастакоў, іх творчасць сталі прадметам даследаванняу М. Шчакаціхіна (1896-1940). Адукацыю ен атрымаў у Маскоўскім універсітэце ў 1914-1918 гадах. З 1922 года працаваў у БДУ. Адзін з заснавальнікау беларускага мастацтвазнаўства. Даследавау гісторыю беларускага мастацтва ад самога яго пачатку. Вывучау фрэскі, іканапіс, манументальнае дойлідства XI-XVII стагоддзяў, гравюры выданняў Ф. Скарыны. Увеў канцэпты «беларускае барокка», беларускае адраджэнне. Распрацаваў канцэпцыю

гісторыі беларускага мастацтва. Даследаваў творчасць беларускага мастака XVII стагоддзя Р. Мядзвецкага. У 1928 годзе быў надрукаваны першы том «Нарысаў з гісторыі беларускага мастацтва». Быў рэпрэсіраваны. Памер у ГУЛАГу.

Ю. Дрэйзін (1879-1942) стаяу ў вытокау даследавання беларускай музычнай культуры і эстэтыкі. Адзін з першых твораў называўся «Музыка і рэвалюцыя». Актыўна перакладаў на беларускую мову тэксты звязаныя з музыкай. Усяго зрабіў больш за 820 перакладаў, у тым ліку антычных аўтараў. Стаў аўтарам слоўніка «Музычныя тэрміны». Адукацыю атрымаў у Віленскай духоўнай гімназіі, Юр’еўскім і Маскоўскім універсітэтах. Выкладаў у навучальных установах Магілева. Заснаваў у горадзе ў 1919 годзе першы сімфанічны аркестар. Ен быў у складзе аркестру, выконваў першую партыю скрыпкі. Пасля выкладау гісторыю і тэорыю музыкі ў навучальных установах Мінска. Быў сябрам Беларускага таварыства пісьменнікаў і кампазітараў. Пагроза рэпрэсіяў вымусіла Ю. Дрэйзіна пакінуць Беларусь у 1935 годзе.

Прыкладны дыскурс эстэтыкі дапоуніў дыскурс філасофска-аналітычнай эстэтыкі. Былі выдадзены працы С. Вальфсона, а таксама праца Я. Барычэўскага «Аб прыродзе эстэтычнага разважання». Выснову тэарэтычных даследаванняу сфарміравала тэорыя эстэтыкі, распрацаваная І. Кантам. На думку Я. Барычэускага першаснай высновай эстэтычнага меркавання з’яўляецца пачуцце асалоды. Катэгарыяльныя структуры эстэтыкі неабходны ў выяўленчай і літаратурнай творчасці. С. Вальфсон нягледзячы на прыхільнасць афіцыйнай філасофіі марксізму ў эстэтыцы сумяшчаў пралеткультаускую ідэялогію з аналізам творчасці беларускіх творцаў.

Аднак перыяд рэпрэсіяў ускладніў карыстанне філасофска аналітычным дыскурсам эстэтыкі, паколькі тэма беларусізацыі ператварылася ў падставў для абвінавачванняў. Тым не менш эстэтыка мастацкай культуры Беларусі развівалася на прыкладным узроуні. Гэта былі сферы опернага і балетнага мастацтва, музыкі. Аб тым як фарміраваліся школы ў галіне музычнай культуры распавядае ў творах А. Ладыгіна. Яна ўнесла значны ўклад у захаванне дыялогу філасофіі і прыкладной эстэтыкі мастацкай дзейнасці.

Падзеі Вялікай Айчыннай вайны звязалі эстэтыку выяўленчага мастацтва Беларусі з практыкамі экзыстэнцыяльнага асэнсавання магчымасцей чалавека на мяжы жыцця і смерці. Паказальнай стала творчасць М. Савіцкага (1922-2010), трапіўшага ў палон і пра-

вёўшага не адзін год у канцэнтрацыйных лагерах смерці, арганізаваных нацыстамі. Адлюстравалі беларускія мастакі партызанскую тэму, паўсядзеннае жыцце ва ўмовах барацьбы з ворагам. Скульптары пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны стварылі панараму гістарычнай памяці савецкім салдатам, партызанам, падпольшчыкам, спаленым вескам, загінуушым у канцэнтрацыйных лагерах смерці, створаных нацыстамі на тэрыторыі Беларусі. Узведзены комплесы памяці ў Хатыні, Брэсцкай крэпасці, у Мінску (помнік Перамогі, Курган Славы).

Аднаўленне беларускіх гарадоў пасля Вялікай Айчыннай вайны зрабіла актуальнай працу архітэктарау. Яны павінны былі знайсці мяжу паміж новай забудовай і рэканструкцыяй створаных беларускім народам аб ектау культуры. Адыгрывау фактар атэізму, класавы фактар непрыняцця некаторых помнікаў як напамінку аб багатых саслоуях, прыгнятаушых беларускі народ. Тым не менш даследаванне гісторыі беларускай архітэктуры стала прадметам пошукаў і публікацый навукоўцаў з сям'і Чантурыяў. На пачатку XXI стагоддзя выдадзены шматтомны твор «Архітэктура Беларусі».

Амаль поунасцю знішчаная нямецкімі акупантамі інфраструктура беларускіх гарадоў абумовіла аднаўленне на базе Беларускага політэхнічнага інстытуту цэлай сістэмы навуковых школаў, звязаных з архітэктурай, будауніцтвам, прамысловасцю, транспартам, прыборабудаваннем, энергетыкай, металургіяй. Пасля іх дапоўнілі накірункі горнай хіміі, кібернэтыкі. У тэхналагічным інстытуце вызначылася спецыялізацыя лясной гаспадаркі, тыпаграфскай справы, тэхнічнай хіміі. У сельскагаспадарчых навучальных установах акцэнт быу зроблены на сельскагаспадарчае машынабудаванне і тэхналогіі вырошчвання і селекцыі прадукцыі раслінаводства і жывелаводства. Адным з накірункаў дзейнасці стала тэхнічнае забяспечанне сувязі, сістэмы гандлю.

У стылістыцы пасляваеннага неакласіцызму былі рэалізаваны праекты забудовы цэнтрау буйных беларускіх гарадоў. У рэалізацыі гэтых праектаў удзельнічалі Я. Аграновіч-Панамарова, В. Аладаў, Р. Патаеу, А. Сычова. Пераход у будауніцтве на жалезабетонныя канструкцыі абумовіў даследаванні па будаўнічай механіцы, матэматычным разлікам будаўнічых канструкцый, матэрыялам. У гэтых даследаваннях прынялі ўдзел П. Аляўдзін, І. Ахвердаў, М. Балыкін, М. Блешчык, Ю. Багамолаў, А. Барысевіч, С. Басакоў, У. Варанько, І. Голубеў, П. Дзячак, Дз. Згіроўскі, Я. Кавалеў, І. Ле-

ановіч, В. Лысаў, Г. Ляхевіч, Ю. Мартынаў, М. Нікіценка, Э. Аучыннікаў, Г. Пастушкоў, Ц. Пецольд, Дз. Сабалеўскі, В. Тарасаў.

На філасофска-аналітычным узроўні даследаванняў важную ролю адыгралі працы Э. Дарашэвіча і В. Конана. У іх разгледжана гісторыя эстэтычнай думкі Беларусі. А. Майхровіч у спецыяльнай працы разгледзеў эстэтычныя погляды Я. Коласа.

Абагульнены падыход да мастацтва ў катэгорыях філасофіі дазволіў М. Крукоўскаму (1923-2013) пісаць творы пад назвай «Логіка прыгажосці», «Галоўныя эстэтычныя катэгорыі. Вопыт сістэматызацыі», «Кібернэтыка і законы прыгажосці». У іх разгледжаны цераз канцэпты колеру, гуку, рытму, прапарцыянальнасці, сімметрыі, прыгажосці эстэтычныя якасці чалавека і рэчаіснасці. Разгледжана сувязь паміж эстэтычнымі катэгорыямі і стылямі. Спалучэнне логікі і эстэтыкі дазволіла правесці катэгарыяльны аналіз эстэтычнай дзейнасці.Тэарэтычныя даследаванні дапоўнілі працы В. Салеева пад назвай «Мастацтва і яго ацэнка», «Сучасная эстэтыка Беларусі», а таксама праца А. Майхровіча «Аб эстэтычным асваенні рэчаіснасці».

У другой палове XX стагоддзя было прынята рашэнне аб адраджэнні народных мастацкіх раместваў і вывучэнні ў школах традыцыйных тэхнік апрацрукі матэрыялаў. У выніку ў Віцебскім дзяржауным універсітэце (педагагічным інстытуце) у 1965 годзе кафедра «Асновы вытворчасці» была перайначана ў кафедру «Праца і дэкаратыўнае мастацтва». З 2010 года на яе выснове створаны кафедры дызайна і дэкаратыуна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі.

У Мінску падрыхтоўка мастакоў вялася ў мастацкім вучылішчы і Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце. У станаўленні школы дызайну важную ролю адыграў мастак Г. Вашчанка (1928-2014) які ў 1961 годзе набраў студэнтаў на спецыяльнасць «манументальна-дэкаратыўнае мастацтва» і заснаваў кафедру манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. 36 гадоў мастак выкладаў у навучальнай установе. Ен запрасіу на кафедру свайго калегу мастака А. Кішчанку (1933-1997), валодаушага мастацтвам мазаікі, керамікі, габелену, стварыушага самы вялікі па плошчы габелен пад назвай «Габелен стагоддзя».

Прыкладная эстэтыка абаснавалася ў XX стагоддзі ў навучальных установах Беларусі, звязаных з падрыхтоўкай архітэктараў, ды-

зайнераў, спецыялістаў для ўстаноу культуры. Адным з цэнтраў прыкладной эстэтыкі стаў Беларускі політэхнічны інстытут, дзе вядзецца падрыхтоўка архітэктараў і дызайнераў. У ліку выпускнікоў І. Марозаў, таленавіты архітэктар, скульптар, тэарэтык эстэтыкі і культуралогіі. У ліку яго прац «Архітэктурная герменэўтыка» (2000), «Асновы культуралогіі. Архетыпы культуры» (2001), «Герменэўтыка дойлідства» (2009).

Дэкаратыуна–прыкладны аспект нацыянальнага дызайну Беларусі даследуецца, рэканструіруецца, развіваецца цераз дзейнасць цэнтра даследаванняў беларускай культуры і мовы НАН Беларусі, універсітэта культуры, акадэміі мастацтваў, кафедры этналогіі БДУ. Попыт на вынікі гэтых даследаванняу расце ва ўмовах рынкавай эканомікі, якая спрыяе аграрнаму, гісторыка-культурнаму, этнаграфічнаму турызму. Сувязі эстэтыкі з фальклорам разгледжаны В. Конанам у працы «Ля вытокаў самапазнання». В. Салеевым у творы «Нацыянальная самасвядомасць і мастацкая культура».

Створаная ў беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце аснова для станаўлення школы дызайну дзякуючы І. Герасіменку, І. Селязневу, А. Чарнышову была прадстаўлена ў шэрагу манаграфічных даследаванняў па тэматыцы дызайну. У БДУ кафедра дызайну адкрыта ў 2004 годзе. У Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў прадстаулены факультэт дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У БНТУ функцыянуе кафедра прамысловага дызайну і дызайну ўпакоўкі. Вядзецца набор студэнтаў па спецыяльнасці дызайн калесных і гусенічных машынаў.

Расце роля камп ютарнага дызайну на факультэце інфарматыкі і робататэхнічных сістэмаў БНТУ. Вядзецца падрыхтоўка мэнэджэраў па накірунку кіравання дызайн-праектамі. Падрыхтоўку дызайнераў па ландшафту ажыццяўляе архітэктурны факультэт. Вынікам рэфлексіі па тэме дызайну стала праца выкладчыкаў кафедры філасофскіх вучэнняў БНТУ пад назвай «Філасофія дызайну» (2016). Паралельна з тэндэнцыяй канвергенцыі дыскурсу сучаснай беларускай інжынерыі з дыскурсам эстэтыкі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва назіраецца канвергенцыя філасофска-аналітычнай эстэтыкі з культуралогіяй і педагаічнай дзейнасцю ў галіне эстэтычнага выхавання. Гэта бачна на прыкладзе твора В. Мартынава «Філасофія прыгажосці» (1999), а таксама манаграфіі В. Салеева і О. Івашкевіч «Эстэтычнае ўспрыняцце і дзіцячая фантазія» (1999).

Ва ўмовах рынкавай эканомікі ўзнік попыт на цэнтры эстэтыкі і дызайн-студыі з улікам узроставых асаблівасцей насельніцтва. Дызайн стаў элементам медыцынскіх паслуг (касметычная хірургія, стаматалогія). Ен прысутнічае ў сектары бытавых паслуг і вытворчасці бытавой тэхнікі. Адметным стаў накірунак дызайну паслуг цырульняў (салонаў прыгажосці). Будаўніцтва стварыла попыт на інтэр'ерны дызайн. Адбылася канвергенцыя дызайну і індустрыі моды. Яны маюць непасрэдны працяг у прадуктах легкай прамысловасці. Лен стаў зыходным матэрыялам цераз які атрымалі канструктыунае развіцце элементы беларускага арнаменту, касцюма, вышыукі, выцінанкі.

Беларускімі распрацоушчыкамі праблематыкі дызайну выпрацавана метадалагічная выснова сістэмнага разгляду творчай дзейнасці. У 1974 годзе А. Чарнышоў прадставіў гэтую метадалогію ў Мінску на навукова-практычнай канферэнцыі па дызайну і мастацка-канструктарскай адукацыі. Даклад называуся «Метадалагічныя прынцыпы пабудовы агульнай тэорыі дызайн-дзейнасці (філасофскі аспект). За выснову быў узяты прынцып узаемадзеяння і прапанавана ўніверсальная фармальна-графічная мадэль працэсу ўзаемадзеяння. Працягам стала дысертацыя пад назвай «Канцэпцыя ўзаемадзеяння і метадалагічныя праблемы дызайну». Пад увагу бралася тэндэнцыя аптымізацыі адносін паміж карыстальнікамі і вытворцамі. Рынак патрабуе дызайн-канцэпцый, інавацыйных мастацка-праектных ідэй, стратэгій форматварэння, канцэптуальных мадэляў перспектыўных формаў задавальнення карыстальніцкага попыту розных групау насельніцтва, асартыментных ідэялогій таваравытворцаў, канкрэтных праектных ідэй форматварэння прадметна-прасторавага асяроддзя жыццядзейнасці сучасных людзей.

Дызайн-дзейнасць дэманструе канструктарскую выснову. Яна арыентавана на фарміраванне, развіцце, актуалізацыю сацыяльна-вартасных якасцяў чалавека ва ўмовах яго ўзаемадзеяння з матэрыяльнымі дызайн-прадуктамі сістэмнай арганізацыі. Праектны метад заснаваны на адзінстве прынцыпаў навуковай, тэхнічнай, мастацкай творчасці. Фактычна гаворка ідзе аб мастацкіх кампанентах сучаснай інжынернай дзейнасці. Самастойнасць гэтых кампанентаў была асэнсавана ў 1845 годзе Г. Коулам. З таго моманту спатрэбіўся час каб дызайн стаў разглядацца як сучасная мадыфікацыя інжынернай дзейнасці. У сістэме сацыяльных катэгорый грамадства гэтая мадыфікацыя абазначаецца як крэатыуная індустрыя.

Пры такім падыходзе дызайн разглядаецца як спецыфічная праектна-даследчая, мастацка-кампазіцыйная дзейнасць. Канцэптуальны дызайн дазволіў цераз сістэму адукацыі рыхтаваць спецыялістаў для беларускай эканомікі. На думку І. Герасіменкі гэта мэтазгодна ва ўмовах глабалізацыі, калі ўзнікла рызыка страты эканамічнай ідэнтычнасці тавараў і вытворцаў. Патрэбна канцэпцыя дызайну з нацыянальнымі адметнасцямі. А. Чарнышоў лічыць, што постмадэрнізм стварыў феномен эклектычнай архітэктуры. Мы можам дабавіць, што ва ўмовах пераходнасці дзейнічаюць не толькі механізмы дэканструкцыі, але і канвергенцыі архітэктурных мастацкіх стыляў.

У мэтах падрыхтоўкі дызайнераў вышэйшай кваліфікацыі ў 2000 годзе быў адкрыты Савет па абароне кандыдатскіх дысертацый пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў па спецыяльнасці тэхнічная эстэтыка і дызайн. У сістэму адукацыі Беларусі прыйшлі архітэктары, дызайнеры з практычным вопытам інжынернай і кіраўнічай дзейнасці. Адзін з іх А. Сардараў. Ен спалучае інтарэс да народнай беларускай культуры, яе архітэктурных традыцый з праектнай дзейнасцю. Ен займаецца аб емнай архітэктурай, у якой дамінуе гарадская тэматыка. Па яго праектам мадэрнізаваны бульвар па вуліцы Леніна ў Мінску, падземныя пераходы на праспектах Пераможцаў і Незалежнасці, інтэр’еры будынкаў міністэрстваў транспарту, замежных спраў, прыдарожная інфраструктура. Як дызайнер ен працуе са светам, сімволікай, праекціруе знакі дарожнай інфраструктуры з элементамі турыстычнай і гісторыка-культурнай сімволікі. Гэта знакі «Пачатак дарог Беларусі», «Нулявы кіламетр». З вопытам практычнай дзейнасці ў сістэму адукацыі вярнуўся І. Марозаў.

Увага да горада трансфарміравала скульптуру. Яна адыйшла ад манументалізму і стала прысутнічаць у малых формах, дапаўняючых сцэнкі гарадскога жыцця элементамі іншых гістарычных эпох у вобразах фатографа, цырульніка, паэта, пісьменніка, кампазітара, дзяўчынкі з парасонам, гарадавога, гандлеўкі, карэты, птушак, шыльдаў, тумбаў аб’яу. З явай стаў вулічны авангард у жанры графіці. Спачатку з ім змагаліся як з практыкай парушаючай вонкавы выгляд гарадоў. Прычынай з яўляюцца падросткі, якія малююць на будынках не мастацкія завершаныя кампазіцыі, а адлюстроўваюць пераходны ўзрост. Таму такім прадстаунікам вулічнага мастацтва як В. Чарнабрысаў складана ажыццяўляць творчыя задумы з пазіцыі «Прыгажосць уратуе свет».

У свой час маладыя мастакі сабраліся ў суполку «Арцель». У маніфесце паставілі задачу эстэтызацыі асяроддзя пражывання сваімі рукамі. Насустрач пайшлі домакіраванні. Дазволілі распісаць домакіраванне на вуліцы Кедышкі. На праспекце Незалежнасці 145 распісалі жылы дом. Пасля былі пад’езды у Мінску і Гомелі, школьныя сталовыя. Эскізы ўзгадняліся з жыльцамі і ўладамі. Але мастак не можа быць бясконцым альтруістам. У Беларусі няма мастацкага рынку пакупнікоў. Арт-рынак толькі фарміруецца, што бачна па невялікай колькасці прыватных галерэяў, рэкламе. Беларускі арт-рынак пакуль не стаў паўнацэнным удзельнікам еўрапейскага рынку. Мастакі самі шукаюць шляхі да патэнцыяльных прыватных пакупнікоў. Есць зрухі. Створаны інтэрнэт-рэсурс пад назвай «Беларускі авангард». Ен утрымлівае інфармацыю пра мастакоу і іх творы. Сярод аўтарау У. Акулаў, які прадстаўляе пераемнасць з першым беларускім авангардам цераз выкладчыкаў Віцебскага педагагічнага інстытута, у якім ен навучаўся.

Такім чынам, дыскурс выяўленчай і архітэктурнай эстэтыкі Беларусі гістарычна ўзаемадзейнічау з тэалагічным і літаратурным дыскурсамі. Пад уплывам працы прадстаўніка постмадэрнізму Ч. Джэнкса «The Language of Post-Modern Architecture» (1977) архітэктурная эстэтыка стала дыялагавай, тэкставай, інфармацыйнай, камунікатыунай. Ей прадпісана несці розныя паведамленні, якія могуць прачытаць розныя карыстальнікі. У логіку праектавання ўключаецца патэнцыяльны карыстальнік з яго спецыяльнымі патрэбамі і каштоунасцямі. У гэтай сістэме каштоўнасцей прысутнічае экалогія, узроставая псіхалогія, сацыяльная праца, гістрарызм. Архітэктар арганізоўвае сацыяльнае асяроддзе і камунікацыю цераз гэтае асяроддзе. Паколькі патрэбы і каштоўнасці ў карыстальнікаў розныя то сучасная архітэктура сумяшчае стылістыку. Перавагу яна аддае не ідэялогіі, а стварэнню асяроддзя для камунікацыі і канструктыўнага дыялогу карыстальнікаў. Метадалогія выпрацаваная прадстаунікамі постмадэрнізму аказалася прымальнай для новых тэндэнцый у архітэктуры. Сам жа стыль аказаўся часовым з-за ўласных абмежаванняў, звязаных з дэканструкцыяй і іроніяй. Дэканструкцыю і іронію змянілі сацыяльнасць, экалагізм, дыгіталізацыя архітэктурнай дзейнасці тэхналогіяу разумнага дому, арганічнага жытла і асяроддзя. На гэтыя прыярытэты матывавана камунальная гаспадарка гарадоў.

Працягваюцца даследаванні на мяжы псіхалогіі і эстэтыкі, пачатыя Л. Выгацкім. Яны накіраваны на сацыялізацыю асобы за кошт выкарыстання сродкаў мастацкага ўздзеяння. Куратарам гэтых даследаванняў з’яўляецца Л. Рожына. Ей распрацавана метадычнае забяспячэнне педагагічнай дзейнасці на музычна-педагагічным факультэце Беларускага дзяржаунага педагагічнага ўніверсітэту – «Музыкальное искусство. Практическая психология». Выкарыстоўваюцца канцэпты мастацкай перцэпцыі, мастацкай фасілітацыі, мастацкай камунікацыі.

Мастацкая перцэпцыя разглядаецца як працэс успрыняцця, разумення, ацэньвання чалавека, як галоўнага аб екта пазнання ў мастацтве і мастацкай камунікацыі. Даследуецца як яна ўплывае на сэнсарна-перцэптыўнае, інтэлектуальнае, вербальнае, імажытыўнае развіцце асобы. Мастацкая фасілітацыя садзейнічае фарміраванню эстэтычнай мастацкай культуры асобы, яе кагнітыўных стыляў, рахункаў кадзіравання інфармацыі. Мастацкая камунікацыя выпрацоувае ў асобы культуру інтэрпрэтацыі тэксту з улікам фактараў ментальнасці, ідэнтычнасці. Выхаваўчы эффект дасягаецца дзякуючы канвергенцыі дыскурсу мастацкага тэксту з дыскурсам навуковага даследавання. Навуковы стыль стварае дадатковыя магчымасці камунікацыі і, адпаведна, дадатковыя рэсурсы сацыялізацыі асобы за кошт актывізацыі фактараў самастойнай рэфлексіі. Пры навучанні студэнтаў выкарыстоуваецца практыка псіхалагічнага аналізу мастацкіх і дакументальных тэкстаў. Гэта літаратурныя тэксты і тэксты выяўленчага мастацтва ў форме жывапісу.

### *2.2. Філасофія і беларуская літаратура*

Пачаткі айчыннага літаратурнага дыскурсу даследчыкі гісторыі беларускай літаратуры бачаць у творчасці К. Тураўскага, а таксама эпічных творах, напісаных на царкоўнаславянскай мове. Паколькі мы ўжо разгледзелі творчасць К. Смалятыча, К. Тураўскага, Е. Полацкай на выснове тэалагічнага дыскурсу грэка-візантыйскай стылістыкі, то можам толькі адзначыць што літаратурныя сродкі пад час філасофскай рэфлексіі выкарыстоўваліся ў мэтах надання тэкстам большай тлумачальнай яснасці. Прыводзіліся прыклады ў форме павучанняў, характэрных для стылістыкі Бібліі Новага Запавету, дзе разглядаўся сацыяльны вобраз жыцця веруючага, а таксама асоба Хрыста.

Эпоха Адраджэння і Рэфармацыі выпрацавала беларусамоўную літаратурную стылістыку выданняў Бібліі дзякуючы Ф. Скарыне, С. Буднаму. У мэтах азнаямлення еўрапейцаў з Вялікім Княствам Літоўскім, яго гісторыяй, культурай, прыродай, філасофіяй беларускімі аўтарамі быў выпрацаваны арыгінальны жанр навалацінскай паэзіі. Найбольш поўна ім скарыстау М. Гусоўскі ў паэме «Песня пра зубра». У паэтычнай форме паказаны адметнасці сацыльнай і палітычнай арганізацыі грамадства, праблемы, звязаныя з войнамі, унутранымі канфліктамі, існуючым разрывам паміж гуманізмам і паўсядзеннай культурай простага люду. Раскрыты асаблівасці арганізацыі эканамічнага жыцця. Падрабязна разгледжаны пытанні ўзаемадзеяння ўлады і права. Сцвярджаецца прымат натуральнага права. На прыкладзе зубра апісаны адметнасці беларускай прыроды. Я. Вісліцкі прысвяціў сваю паэтычную дзейнасць апісанню грамадства ВКЛ на прыкладзе найбольш уплывовых магнацкіх сем'яў, у першую чаргу Радзівілаў.

К канцу XVII стагоддзя Контррэфармацыя на Беларусі завалодала культурнай прасторай у форме барока, прадстаўляючага тэалагічны дыскурс. Беларускі літаратурны тэкст канчаткова стаў полімоўным з тэндэнцыяй умацавання ролі лацінскай і польскай моў. Гэтыя адметнасці сталі прадметам даследаванняў і адкрыццяў А. Мальдзіса. Навуковец даследавау адметнасці літаратуры беларускага барока. Рэлігійна-панегерычную паэзію XVII стагоддзя прадставілі С. Полацкі, А. Белабоцкі, З. Моршчын, А. Варакомскі, М. Кулігоўскі, С. Шэмет, Д. Рудніцкі. Адметным накірункам паэзіі стала лірыка. Яна звязана з музычнай творчасцю. Мела месца ананімнасць паэтычнай творчасці, што праявілася на прыкладзе паэмы «Тарас на Парнасе».

Асобны накірунак літаратурнай дзейнасці сфарміравала мемуарыстыка. Гэтая літаратурная традыцыя ідзе ад жанру жыцій і хаджэнняў. Падарожнікі і тыя хто пра іх пісаў спалучалі асабістыя ўражанні ад убачанага з прычынамі падарожжау і элементамі навуковага дыскурсу. Суправаджалі тэксты замалеўкамі, апісаннем прыроды і культуры. Значнае месца займала біяграфічная кампанента. Жанр мемуарау выкарыстоўваўся магнацкімі сем'ямі, у тым ліку сям'ей Радзівілаў, а таксама шляхтай. Мемуарная літаратура барока Беларусі прадстаўлена творамі Б. Маскевіча, А. Длужыка-Каменскага, Л. Сяніцкага, Я. Храпавіцкага, Я. Цадроўскага, С. Пільштыновай.

Асвета прынесла на Беларусь ідэі Вальтэра, Русо, Мантэск'е. Французскі ўплыу быў настолькі моцны, што вызначыў стылістыку класіцызму, ракако. Рэч Паспалітая бачыла ўФранцыі паратунак сваей дзяржаўнасці. Але не ўсе грамадства падзялала гэтую думку. Пачаліся вострыя ўнутраныя канфлікты паміж палітычнымі плынямі. Прыхільнікі свецкай культуры паспелі вывесці адукацыю з пад парадкавання каталіцкай царквы. Радыкальны праект Канстытуцыі справакаваў Прусію, Расію, Аўстра-Венгрыю на падзел Рэчы Паспалітай. Т. Касцюшка, меўшы вопыт ваеннай інжынерыі, атрыманы ў Паўночнай Амерыцы не змог супрацьстаяць расійскаму войску. Багатыя магнацкія роды Беларусі захавалі свае матэрыяльныя магчымасці і юрыдычны статус у межах працягваўшага дзейнічаць на тэрыторыі Беларусі заканадаўства ВКЛ.

Працягвала існаваць мара аб аднаўленні поўнай дзяржаўнай незалежнасці ВКЛ. Надзеі звязваліся з Напалеонам, які пачаў ваенную кампанію супраць Прусіі, Аўстра-Венгрыі, Расійскай імперыі. У эстэтыцы пад уплывам гэтай палітычнай мары вырасла роля класіцызму і рамантызму. Класіцызм выкарыстоўвауся ў архітэктуры палацава-паркавых комплексаў. Рамантызм стаў метадалогіяй настальгічнай літаратуры па старых добрых часах беларускай шляхты, яе гераічным мінулым. А. Міцкевіч задаволіў патрэбу ў гэтай інтэнцыі. Ен напісаў паэмы «Гражына», «Конрад Валенрод», «Свіцязянка», «Пан Тадэвуш».

Эпоха рамантызму стварыла феномен польскамоўнага паэтычнага дыскурсу на тэрыторыі Беларусі з вялікай колькасцю беларусізмаў. Філасофія ідэнтычнасці А. Міцкевіча, Я. Чачота, В. Дуніна-Марцінкевіча заключалася ў сінтэзе настальгічнай старашляхецкай польскамоўнай сельскай традыцыі з беларускамоўным фальклорам, які стаў прадметам глыбокіх даследаванняў. На высnове гэтых даследаванняў сфарміравалася новае бачанне Беларусі. Яно заключалася ў прызнанні феномену беларускай народнай культуры. Аўтары сталі не толькі збіраць паэтычны фальклор, але і пісаць вершы, п'есы на беларускай мове.

К. Каліноўскі паклаў пачатак фарміраванню новабеларускай літаратурнай стылістыкі журналістыкі. Ен выдаваў на беларускай мове газету пад назвай «Мужыцкая праўда». Уздымаліся пытанні сацыяльнага жыцця беларускага грамадства. Завершаную форму філасофія ідэнтычнасці набыла ў літаратурнай творчасці Ф. Багушэвіча, братоў Луцкевічаў, М. Багдановіча,

А. Пашкевіч (Цеткі), Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага. Асаблівая роля ў распрацоуцы філасофіі ідэнтычнасці сродкамі літаратурнага дыскурсу належыць М. Багдановічу. Ен рэалізаваў сістэмны падыход да палітычных і грамадскіх традыцый беларускага народа. Аб гэтым сведчаць цыклы вершаў «Старая Беларусь», «Старая спадчына». Змест адлюстраваны ў вершах «Летапісец», «Перапісчык», Слуцкія ткачыхі», «Агата». Цэласнасць ахопу гісторыі выражана з дапамогай публіцыстыкі. Паэтам напісаны артыкулы «Беларускае адраджэнне», «Беларусы», «За сто гадоў», «На беларускія тэмы», «Аб гуманізме і неабачлівасці», «Хто мы такія». Не закончанымі засталіся працы пад назвай «З барацьбы Полаччыны з Кіеўшчынай», «Літоўская Пагоня». М. Багдановіч прасачыў этапы другога адраджэння беларускай культуры і яе ідэнтычнасці на ўзроўні інтылігенцыі. У першай палове XIX стагоддзя спаланізаваная інтылігенцыя стала вяртацца да беларускай мовы. Гэта бачна па творчасці Я. Баршчэўскага, А. Вярыгі-Дарэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Кіркора, У. Сыракомлі, Я. Чачота. Паўстанне 1863-1864 гадоў дало штуршок беларусамоўнай выдавецкай дзейнасці К. Каліноўскага, паэтычнай творчасці Ф. Багушэвіча. Выключную ролю ў станаўленні Я. Купалы адыгралі 1895-1904 гады калі яго сям'я жыла недалека ад сям'і З. Чаховіча (1831-1907), актыўнага ўдзельніка паўстання 1863-1864 гадоў. Ен атрымаў магчымасць азнаеміцца з гісторыяй паўстання.

Пасля расійскай рэвалюцыі 1905-1907 гадоў нацыянальная ідэнтычнасць беларусау інстытуцыяналізавалася не толькі ў формах літаратуры, але і палітычнага руху за стварэнне нацыянальнай дзяржавы. Аналіз гістарычных адметнасцей адраджэння нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў М. Багдановіч ажыццявіў на параўнаўчай выснове. Ен вывучау гістарычны лес балгараў, сербаў, чэхаў, славенцаў, кашубаў, лужыцкіх сербаў. Ва ўмовах расійскай рэвалюцыі 1917 года беларускія пісьменнікі і паэты прынялі актыўны ўдзел у станаўленні беларускай нацыянальнай дзяржаунасці. Створаная пры іх актыўным удзеле Беларуская сацыялістычная грамада стала ядром палітычнага руху за стварэнне нацыянальнай дзяржаўнасці.

К моманту заключэння Рыжскай дамовы ў 1920 годзе паміж РСФСР і Польшчай нацыянальная дзяржаунасць Беларусі была прадстаўлена БССР. РСФСР гарантавала дзяржаўную самастой-

насць толькі Ўсходняй часткі Беларусі. Заходняя тэрыторыя Беларусі да верасня 1939 года знаходзілася ў складзе Польшчы.

Ва ўмовах фактычнага знаходжання тэрыторыі Беларусі на цавілізацыйным разломе І. Абдзіраловіч (1896-1923) у філасофска-публістычным эсэ «Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага светапогляду» (1921) канстатаваў сістэму каардынат беларусі паміж Захадам і Ўсходам. Ні адна з гэтых цывілізацый не ўтрымлівае прыкладаў самаарганізацыі, прывабных для Беларусі. Галоўныя недахопы гэтых сацыяльных сістэмаў звязаны з кансерватыўнасцю інстытуцыянальных формаў. Захад дэкларуе гуманістычныя формы культуры, а на практыцы атрымліваюцца формы прыгнечання, зняважы да чалавека. Усход (візантызм) дэкларуе духоўнасць, а фактычна практыкуе дагмат формы над зместам. Беларусі прыйдзецца на выснове метадалагіі ліючайся формы селектыуна інтэграваць у сваю культурную прастору сацыяльныя і палітычныя практыкі, якія будуць адпавядаць яе кантэксту. У гэтых умовах нацыяналістычны месіянізм можа ствараць перашкоды для інтэграцыі Беларусі ў глабальную прастору міжкультурнага дыялогу.

На тэрыторыі БССР адбылася канвергенцыя нацыянальнай культуры другога адраджэння, мадэрнізму рускага авангарду і пралеткультаўскай ідэялогіі. Пляцоўкай канвергенцыі новай беларускай літаратуры з пралеткультаўскай ідэялогіяй стаў Мінск. А. Бабарэка (1899-1938) стаў адным з арганізатараў літаратурных аб’яднанняў «Маладняк» (1923), а пасля «Узвышша» (1926). Ен прыняў кастрычніцкую рэвалюцыю і быў блізкі з ідэялогіяй пралеткульту, распрацаванай ураджэнцам Гродзенскай губерніі А.А. Багданавым (Маліноўскім). Сутнасць ідэялогіі пралеткульту заключалася ў разбурэнні старой культуры і стварэнні на яе месцы новай класавай культуры. Відавочны ўплыў марксізму. За аснову бралася творчая самадзейнасць пралетарыяту, здольная злучыць працу і навуку. У выніку пралетарыят авалодае рэсурсамі навукі. Пралеткульт быў актуалізаваны ў кастрычніку 1917 года напярэдадні рэвалюцыі. Пасля перамогі рэвалюцыі была створана арганізацыйная інфраструктура, у тым ліку часопіс «Пралетарская культура». Выдавалася каля дваццаці часопісаў.

А. Бабарека сфармуляваў асноуныя эстэтычныя крытэрыі развіцця літаратурнай творчасці. Акрамя ідэялагічнай пралетарскай кампаненты мелі месца метадалагічныя кампаненты сінтэзу музыкі і слова, слова і колеру. Прыводзіўся прыклад майстэрства К. Чор-

нага. Прадметам даследавання сталі ўзнікненне аўтарскай задумкі і яе рэалізацыя з улікам адваротнай сувязі з чытачом. Поспех дыялогу залежыць ад якасці мастацкага твору, адпаведнасці яго мастацкаму ідэалу.

Парадыгма дыялогу вывела эстэтыку А. Бабарэкі за межы пралеткультаускіх прынцыпау. Ен звяртаецца да псіхалагізму, індывідуальнасці асобы творцы і чытача. Псіхалагізм дае выйсце на духоўную тэматыку і на нацыянальны кампанент культуры. Парада мастацкім творцам заключаецца ў тым, каб яны асвойвалі вобразныя сістэмы вуснай народнай творчасці, выразныя сродкі мовы, архетыпы, ментальнасць.

Нацыянальны вобраз свету адлюстроўвае стабільнасць жыццядзейнасці ў часе і прасторы. Створаныя ў цыклічным руху часу паэтычныя творы станавіліся тэкстамі песнямі. Музычнасць стала крытэрыем якасці мастацкага вершаванага твору.

Эвалюцыя пралеткультаускай парадыгмы на Беларусі ішла на выснове літаратурных згуртаванняў. Першым такім згуртаваннем стаў «Маладняк» (1923). У яго складзе былі А. Александровіч, З. Астапенка, А. Бабарэка, З. Бядуля, А. Вольны, П. Галавач, А. Гурло, В. Дубоўка, А. Дудар, М. Зарэцкі, К. Крапіва, Я. Пушча, П. Трус, М. Чарот, К. Чорны. У трыдцатыя гады XX стагоддзя члены «Маладняка» трапілі пад рэпрэсіі.

У 1926 годзе частка паэтау выйшла з «Маладняка» і стварыла літаратурна-мастацкае аб яднанне «Узвышша». Сярод іх А. Бабарэка, З. Бядуля, В. Дубоўка, К. Крапіва, Я. Пушча, К. Чорны.

Акцэнт быў зроблены беларускую народную культуру. Гэта быў амаль поуны адыход ад пралеткульту. Ва ўласным часопісе яны друкавалі творы заснаваныя на вобразах народнай беларускай культуры. Гэта быў твор Я. Коласа «У глыбінях Палесся», напісаная ім казка «Залаты прамень». На пачатку трыдцатых гадоў XX стагоддзя аб’яднанне самараспусцілася.

«Маладняк» і «Узвышша» узаемадзейнічалі з літаратурна-мастацкім і грамадска-палітычным часопісам «Полымя», у вытокаў якога стаялі Я. Колас і Я. Купала. З 1934 года часопіс стаў прадстаўляць творчы воблік Саюза пісьменнікаў Беларускай ССР.

Творчыя працэсы ў літаратуры сталі прадметам разгляду акадэмічнай навукі. У станаўленні эстэтыкі творчасці важную ролю адыграў прафесар БДУ Я. Барычэўскі (1883-1934). Ен атрымаў запрашэнне на працу ў Беларусі пад час працы ў Маскоўскім

універсітэце. У кнігах «Тэорыя санету» і «Паэтыка літаратурных жанраў» разгледзеў прыроду мастацтва ў сувязі с сацыяльнымі фактарамі. Друкаваў шмат артыкулаў пра творчасць М. Багдановіча, М. Гарэцкага, Я. Купалы, Я. Коласа ў часопісах «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», «Працы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта». Быў рэпрэсіраваны.

Праблемы літаратурнай эстэтыкі сталі прадметам даследавання Л. Выгацкага (1896-1934) у творы «Псіхалогія мастацтва». Як ен сам піша ў выснову твора леглі тры літаратурных даследаванні пра Крылова, Гамлета і кампазіцыю нарыса.

Кароткі перыяд культурнай палітыкі ў БССР пад назвай беларусізацыі змяніўся перыядам рэпрэсіяў. Беларускай літаратуры нягледзячы на страты, у тым ліку трагічную смерць Я. Купалы, удалося захаваць грамадскі статус дзякуючы сялянскай тэматыцы, раскрыццю цяжкага лесу беларускага народа да 1917 года. Дастаткова ўзгадаць раман І. Мележа «Людзі на балоце». У ім відавочна прысутнасць персаналізму штодзеннага існавання з удзелам Бога. У глыбіні светапогляду паляшук прытрымліваецца прысутнасці творцы ў яго жыцці і жыцці яго блізкіх. Свецкі трагізм у катэгорыях персаналізму фармулюецца выразам «Бог даў, Бог забраў, на тое яго воля». У такім тлумачэнні трагізм сітуацыі пераходзіць ў вымярэнне адвечнага працэсу тварэння і адыходу ў вечнасць. Не чалавеку меркаваць аб гэтых рашэннях і не яму ацэньваць іх катэгорыямі свецкай культуры. Гэта важнае ўказанне на ментальнасць духоўнасці на яе анталагічны сэнс. А значыць і самазахаванне. Адкрыцце анталагічнай сутнасці духоунасці дазволіла М. Бярдзяеву, што знаходзіўся пад уплывам марксізму, парваць з гэтай ідэялогіяй і стаць пачынальнікам унікальнай трансфармацыі хрысціянскай тэалогіі на выснове прыярытэту асобы ў духоўным жыцці. Яго дзейнасць у Францыі мела працяг у справе А. Мунье. Беларускі пісьменнік І. Мележ разумеў анталагізм духоўнага быцця асобы і ен змог яго паказаць літаратурнымі сродкамі, што сведчыць аб агульнаеўрапейскай накіраванасці яго мыслення ў катэгорыях антрапацэнтрызму.

Узмацненне філасофскай кампаненты ў творчасці беларускіх пісьменнікаў і паэтаў адбылося пад уражаннем падзей Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі краіны. У творах стаў відавочны ўплыў экзыстэнцыялізму з характэрнай для яго тэматыкай пагранічных сітуацый, выбару ва ўмовах небяспекі згодна катэгорый свабоды і

залежнасці, адказнасці і страху, рашучасці і здрады, эгаізму і ахвярнасці. У сувязі з гэтым можам узгадаць творы М. Лынькова «Векапомныя дні», І. Мележа «Мінскі напрамак», А. Адамовіча «Хатынская аповесць», Б. Сачанкі «Вялікі лес», А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка «Я з вогненнай вескі». Творы пісалі непасрэдныя ўдзельнікі баявых дзеянняў у складзе савецкай арміі, партызанскага руху. Сярод франтавікоу В. Быкау, І. Шамякін, В. Адамчык, І. Чыгрынаў, І. Навуменка, А. Савіцкі.

Экзыстэнцыялізм В. Быкава заснаваны на дамінанце канкрэтнай пагранічнай сітуацыі. Канчаткова ен на ім засяродзіўся ў 1959 годзе ў творы «Жураўліны крык». Да гэтага твора была спроба вызначыцца з прыярытэтам апісання жыццевых лесаў. Паказальным быў твор «У першым баі». У ім вызначылася тэма трагічнага франтавога лесу маладых афіцэраў і салдат. Гэты лес фарміруецца ваеннымі дзеяннямі, якія суправаджае экстрэмальнасць выканання баявой задачы – «Трэцяя ракета», «Пастка», «Праклятая вышыня», «Мертвым не баліць», «Дажыць да світання». Псіхалагічная насычанасць пагранічнай сітуацыі раскрыта ў творах «Альпійская балада» і «Сотнікаў».

Пісьменніка ўразіла эвалюцыя цывілізаванай культуры да антыгуманізму ў форме ідэялогіі фашызму. Прадметам разгляду сталі тыя, што знішчалі людзей і тыя, хто стау ахвярай антыгуманізму – творы «Кар’ер», «У тумане», «Аблава», «Сцюжа». В. Быкау пад ураженнем катастрафізму быцця чалавека і яго духоўнай моцы ва ўмовах нігілізму выпрацаваў філасофска-алегарычны стыль сваіх прац дзякуючы якому ен змог паказаць дамінанту гуманізму ва ўмовах пастаянна існуючай рызыкі дэградацыі грамадства.

А. Адамовіч (1927-1994) прыйшоў да экзыстэнцыялізму пад час Вялікай Айчыннай вайны калі знаходзіўся на тэрыторыі Беларусі акупаванай нямецкімі войскамі. Ен быў удзельнікам партызанскага руху. Пасля вайны атрымаў адукацыю ў БДУ і там жа працаваў выкладчыкам. Выкладаў беларускую літаратуру ў Маскоўскім дзяржауным універсітэце. Акрамя ўласнай літаратурнай творчасці шмат увагі надаваў філасофскаму асэнсаванню кагнітыўнай стылістыкі культуры. Можна сцвярджаць блізкасць падыходу, характэрнаму творам М. Бахціна і Л. Выгацкага.

М. Бахцін (1895-1975), які працаваў у 1920-1924 гадах у навучальных установах Віцебску, упершыню ў еўрапейскай філасофіі звярнуў увагу на феномен кагнітыўнай рацыянальнасці, які існуе як

аб ектыуная рэчаіснасць у літаратурных тэкстах і які не браўся пад увагу даследчыкамі рацыянальнасці. Яго інтарэс да літаратуры і народнай культуры быу абумоулены ўпэуненасцю ў тым, што менавіта яны з'яўляюцца прасторай кагнітыунай рацыянальнасці з характэрнымі для яе адметнасцямі народнай ментальнасці. Ен доўгі час не мог прадставіць грамадскасці вынікі даследаванняу з-за таго, што праходзіў школу экстрэмальнага экзыстэнцыялізму сталінскіх рэпрэсіяў. Асабліва высокая яго роля ў даследаванні стылістыкі і семантыкі літаратурнага раману. У другой палове XX стагоддзя ў Еўропе і ЗША ўзнік павышаны інтарэс да даследаванняў М. Бахціна.

Прадметам даследавання А. Адамовіча таксама стаў літаратурны раман у кантэксце культурнай творчасці. Яго ўвага засяроджана на адметнасцях беларускага літаратурнага рамана – творы «Шлях да майстэрства: Станаўленне мастацкага стылю К. Чорнага» (1958), «Культура творчасці» (1959), «Беларускі раман» (1961), «Становление жанра: Белорусский роман» (1964), «Маштабнасць прозы» (1972), «Война и деревня в современной литературе» (1982). Філасофскія даследаванні дапоўніу экзыстэнцыяльнымі даследаваннямі дакументальнай накіраванасці. Стаў адным з аўтарау кнігі «Я з вогненнай вескі». Яго раманы прысвечаны тэме партызанскага руху на Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны з акцэнтам на трагічныя жыццевыя лесы простых людзей, мясцовых жыхароў – творы «Вайна пад стрэхамі», «Сыны ідуць у бой», «Хатынская аповесць».

На выснове твораў сумесна з Э. Клімавым А. Адамовіч стварыў дакументальна-мастацкую стужку «Ідзі і глядзі», у якой паказаны трагізм беларускага насельніцтва пад час вайны. Быцце на мяжы жыцця і смерці. Карнікі дэманструюць жудасны антыгуманізм. Дакументалізм стаў спалучацца ў творах С. Алексіевіч са сродкамі літаратурнага дыскурсу. Нобелеўскі камітэт адзначыў гэтую адметнасць прысуджэннем С. Алексіевіч прэміі ў галіне літаратуры.

Акцэнт на разглядзе здольнасці чалавека пераадолець пачуцці помсты і ненавісці. і захаваць дамінанту гуманізму ва ўмовах пагранічнай сітуацыі зрабіў І. Шамякін у творах «Помста», «Сэрца на далоні». Беларусы паказалі сваім гістарычным лесам, што злосць і пагарда няздольны абазліць чалавека да такой ступені каб ен сам стаў увасабленнем антыгуманізму. Гэтая мадыфікацыя экзыстэнцыялізму беларускай літаратуры сугучна літаратурнай мадыфікацыі экзыстэнцыялізму французскіх пісьменнікаў, дарэчы творчасці

Ж. П. Сартра. Мысляр на першае месца ставіў выраз «экзыстэнцыялізм – гэта гуманізм». Гэта свабода, якая даруецца чалавеку з самім фактам існавання і гэта адказанасць за ўчынкі і наступствы выбару. У гэтай свабодзе есць аспект кінутасці ў гістарычнае спляценне падзей – пагранічнасць, з якой можа справіцца толькі асоба, прыхільная каштоўнасцям гуманізму.

Дзякуючы У. Караткевічу на беларускай мове атрымаў працяг гістарычны рамантызм польскамоўных літаратурных твораў А. Міцкевіча. На мове філасофіі гаворка ідзе пра герменэўтыку, якая бярэ пачатак з тлумачальнай традыцыі Бібліі. Гэтай традыцыяй карыстаўся Ф. Скарына, калі выдаваў кнігі. Герменэўтыка сучаснай філасофіі акцэнтавана на асобе і часе, у каардынатах якога даследчык хоча зразумець падзеі з улікам тагачаснай ментальнасці. У. Караткевіч паставіў сабе задачу з дапамогай літаратурнай стылістыкі паказаць беларускую гісторыю ў катэгорыях гістарычнай ментальнасці. Для гэтага ен меў прафесійную выснову. Ен дэталева вывучаў паустанне 1863-1864 гадоў на выснове архіўных дакументаў. Важную ролю адыграў вопыт звязаны з літаратурнай казкай.

У. Караткевіч на выснове беларускага фальклору напісаў твор пад назвай «Казкі і легенды маей Радзімы». Ен стаў аўтарам такіх літаратурных казак як «Лебядзіны скіт», «Вужыная каралева», «Чортаў скарб», «Верабей, сава і птушыны суд», Кацел з каменьчыкамі», «Нямоглы бацька». Ен задумаў праект літаратурнай казкі для дзяцей у стылі Г. Андэрсана, а таксама твор пад назвай «Запісы фальклору». Літаратурныя тэмы для твораў У. Караткевіча давала беларуская гісторыя, пачынаючы з падзей XII стагоддзя. Літаратурны вобраз стварыла гістрычная постаць князя Вячкі. Князь змагаўся з крыжаносцамі. Ен загінуў за краіну.

Твор «Хрыстос прызямліуся ў Гародні» заснаваны на часе кіравання Жыгімонта ў XVI стагоддзі. «Чорны замак Гальшанскі» стаў творам, у якім У. Караткевіч рэалізаваў жанр дэтэктыву з улікам герменеутыкі розных гістарычных эпох і сучаснасці. Сучасныя падзеі вызначаюцца дэтэрмінацыяй гістарычнага дакумента. З гэтай дэтэрмінацыі вынікае рызыка для асноўных герояў твора. Тэму для твора «Цыганскі кароль» далі падзеі , што мелі месца на Гарадзеншчыне напрыканцы XVII стагоддзя. У «Сівой лягендзе» прадметам творчага асэнсавання сталі падзеі XVII стагоддзя, звязаныя з

паўстаннем сялян на Магілеўшчыне. Але ўсе ж асноўны інтарэс У. Караткевіча засяроджаны на ХІХ стагоддзі.

У рамане «Каласы пад сярпом тваім» ен апісаў панараму жыцця беларускага грамадства ў першай палове ХІХ стагоддзя. Краіна рухалася да падзей 1863 года. Непасрэдна тэма паўстання раскрыта цераз вобраз К. Каліноўскага. З гэтай мэтай была напісана драма пра кіраўніка паўстання на Беларусі. Адметнасці паўсядзеннага жыцця ў беларускай глыбінцы на Палессі ў другой палове ХІХ стагоддзя раскрыты ў творы «Дзікае паляванне караля Стаха». Твор напісаны ў жанры дэтэктыву. Адраджэнне беларускай нацыянальнай культуры ў другой палове ХІХ стагоддзя паказана ў апавяданні «Кніганошы». Герменеўтычнае прачытанне беларускай гісторыі ад яе вытоказ У. Караткевіч прадставіў у нарысе «Зямля пад белымі крыламі».

А. Разанаў (нарадзіўся ў 1947 годзе) працягвае на выснове паэтычнай стылістыкі тэму герменэўтычнага прачытання беларускай гісторыі. Аб гэтым сведчаць яго кнігі – «Назаўжды» (1974), «Каардынаты быцця» (1976), «Шлях – 360» (1981), «Вастрые стралы» (1988), «У горадзе валадарыць Рагвалод» (1992), «Паляванне ў райскай даліне», «Рэчаіснасць» (1998), «Танец з вужакамі» (1999). Акцэнт тэмы вызначаюць вершы «Рагнеда», «Арышт Кастуся Каліноўскага». Побач з герменэутыкай прысутнічае канструктывізм, у якім адлюстроуваецца жаданне надаць літаратурнаму нацыянальнаму дыскурсу філасофскую выснову інтэлектуальнага дыялогу з чытачом на пытанні анталагічнай сутнасці быцця і дзейнасці. Робіцца спроба знайсці шлях да сучаснага чытача на выснове больш шырокай тэматыкі, чым тая, што была характэрна для беларускай літаратуры, сканцэнтраваная на тэмах вескі і гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У творчасці Я. Маўра (1883-1971) герменеутыка спалучаецца з міжкультурнай тэматыкай і з прыгодніцкім жанрам. У 1928 годзе пад уражаннем падарожжаў М. Міклухі-Маклая ў краіну папуасаў была напісана аповесць «У краіне райскай птушкі». У 1930 годзе пабачылі свет «Палескія рабінзоны». Яна адрасавана маладому чытачу, які можа стаць у Беларусі удзельнікам прыгодніцкай гісторыі. Аповесць «Чалавек ідзе» акунула чытача ў герменэўтыку першабытнага чалавека.

Я. Маўр быў чалавекам, арыентаваным на каштоўнасці глабалізацыі. У 1926 годзе ен быў удзельнікам міжнароднай канферэн-

цыі прыхільнікаў эсперанта. Ен быў ганаровым старшыней беларускіх аматараў эсперанта. К моманту распаду СССР нацыянальны літаратурны дыскурс стаў носьбітам шырокай сацыяльнай, псіхалагічнай, філасофскай тэматыкі.

Тэхнагенныя фактары прагрэсу ўнеслі ў структуру сусветнай і беларускай літаратуры акцэнты пераходнай эпохі. Яна абазначаецца тэрмінам «постмадэрнізм». Змест гэтага тэрміну фарміруе ў тым ліку і філасофская тэматыка. Яна стала адной з высноў сучаснага беларусамоўнага літаратурнага дыскурсу.

У парадыгме стылістыкі постмадэрнізму рэалізуе творчыя задумкі С. Балаханаў (нарадзіўся ў 1977 годзе). Палеміка з літаратурным крытыкам Д. Жукоўскім падштурхнула С. Балаханава да напісання такіх артыкулаў як «Сартр за наваградскай камяніцай», «Ізноў пра кляты постмадэрнізм», «Архіпелаг постмадэрн», «Entlarvung адзінокага ў пустэльні». Робіцца спроба асэнсаваць рэсурсы постмадэрнізму і яго адметнасці ў беларускай літаратуры. Аналізуецца кантэкст гісторыі. Постмадэрн на Беларусі спалучаецца са спробай вытрымаць лінейнасць этапаў культуры. Ен спалучаецца з мадэрнам (авангардам), меушым уласныя мадыфікацыі, у тым ліку савецкую мадыфікацыю 20-х гадоў XX стагоддзя.

У беларускім літаратурным постмадэрне дамінуе дэканструкцыя. Яна параджае стылістыку каляжоу, мазаікі, фрагментарнасці тэксту, іроніі, надменнасці і іранічнага крытызму, інтэртэкстуальнасці. У падобнай стылістыцы напісаны творы А. Хадановічам, Ю. Барысевічам, Ю. Пацюта, А. Анціпенка, А. Скрынчаном, А. Турашам, Л. Вольскім, Л. Галубовічам. Дзякуючы стылю іроніі есць спасылкі на беларускую класічную літаратуру. Гэта сведчыць аб пераймальнасці, якую цяжка вытрымліваць ва умовах інтэлектуальнай гульні сродкамі літаратурнага дыскурсу. Форма амбіцый дамінуе над зместам. Фактычна ен пакуль не знойдзены, што адпавядае пераходнай сутнасці постмадэрну. Змест будзе цяжка знайсці ва умовах мазаізацыі і фрагментацыі светапогляду карыстальнікау электронных мабільных сродкау сувязі і інтэрнэт суполак.

Прывабным можа стаць псіхалагізм, які пакуль з яуляецца адной з форм інтэлектуальнай гульні. Ен выкарыстоуваецца творцамі для дэманстрацыі уласных амбіцый. Сапраўднымі па глыбіні пісьменнікі, падобныя В. Быкаву, станавіліся творцамі калі яны дэманстравалі літаратурную глыбіню вобразау. Такая глыбіня

фарміравалася жыццевым вопытам. Культура постмадэрна пераходная таму, што аутарытэт жыццевага вопыту на якім трымалася узроставая субардынацыя пакаленняу страціла вартасць.

Цяпер аутарытэт кожнага пакалення, абумоулены markednymі аргументамі.Дзеці і моладзь апелююць аргументамі высокай тэхналагічнай мабільнасці. Узроставыя катэгорыі людзей застаюцца адзін на адзін з архаічным на фоне сучаснасці асабістым вопытам. Маладыя пакаленні карыстаюцца сродкамі унутрыпакаленнага дыялогу. У такіх умовах інфармацыя аператыуна становіцца даступнай і адаптацыя да яе не займае шмат часу. Атрыманая перавага неадэкватна успрымаецца моладдзю ва ўмовах яе матэрыяльнай залежнасці ад працягваючага дамінаваць у грамадстве традыцыйнага інстытуцыянальнага парадку ў выглядзе прывычак, руцін, блакіровак, ментальнасці, механізмау інтэграцыі ў прафесійную дзейнасць. Беларускай літаратуры ў такіх умовах прыходзіцца мець дачыненне з новай сацыяльнай рэчаіснасцю. Беларусамоуны дыскурс карыстаецца featuresнай тэкставай стылістыкай. Мае месца працэс, які патрабуе талерантнасці і часу.

### *2.3. Філасофія і дыскурс універсітэцкай навукі*

Філасофія інтэгравалася ў розныя дыскурсы культуры. Частку іх мы ўжо разгледезелі на прыкладзе тэалогіі і мастацтва. Але ў філасофіі есць і уласны прафесійны дыскурс які заснаваны на выкарыстанні катэгарыяльнага апарату з дапамогай якога разглядаюцца праблемы метафізікі, антрапалогіі, дыялектыкі, логікі, эпістэмалогіі, сацыяльнай эвалюцыі грамадства і культуры. Прафесійная мова філосафаў выпрацавана на выснове абстрагавання зместу ўніверсалій культуры розных гістарычных эпох і цывілізацый у форму катэгорый. Гэты працэс рэалізавалі антычныя, індыйскія, кітайскія мысляры. Хрысціянская тэалогія інтэгравала катэгарыяльныя структуры антычнай філасофіі сістэмна прадстаўленыя дыялектыкай і логікай. У такім выглядзе яны увайшлі ў сістэму адукацыі Беларусі XVI-XVIII стагоддзяў. Вывучаць філасофію пачыналі ў калегіях каталіцкіх ордэнаў, а працягвалі ў Віленскай і Полацкай акадэміях, меушых статус універсітэтаў. Перавагу пры вывучэнні філасофіі аддавалі логіцы.

З трыццатых гадоў XIX стагоддзя да дваццатых гадоў XX стагоддзя на тэрыторыі Беларусі адсутнічала сістэма універсітэцкай адукацыі. На прафесійным узроўні філасофія не выкладалася. Таму

ўражэнцы Беларусі сталі ўдзельнікамі інтэлектуальных працэсау на тэрыторыі Расіі. У распрацоўку мадыфікацыі катэгарыяльных структур рускай рэлігійнай філасофіі ўнеслі ўклад С. Полацкі і М. Лоскі.

Кантакты Еуропы і Расіі з цывілізацыямі Далекага Усходу актуалізавалі кампарацівісцкі аналіз ужо існаваушых катэгарыяльных структур. Уклад у гэты аналіз унеслі ўраджэнцы Беларусі. О. Гашкевіч (1814-1875) карыстауся рускай, кітайскай, японскай мовамі не толькі на ўзроуні вербальнай камунікацыі, але і тэрміналагічных даследаванняў. Ен стаў аўтарам аднаго з першых руска-японскіх слоўнікаў.

М. Судзілоускі (1850-1930) карыстауся тэрміналагічнымі адметнасцямі кітайскай і японскай мовы пры напісанні твораў па філасофіі Кітаю. Паколькі ен валодаў васьмю еурапейскімі мовамі, то меў магчымасць параўноўваць культурныя і філасофскія традыцыі. А. Макавельскі (1884-1969) быў засяроджаны на адметнасцях мовы антычнай філасофіі дасакратыкаў. У 1914-1919 ен выдаў тры тамы працы пад назвай «Дасакратыкі».

З адкрыццем на тэрыторыі Беларусі ўніверсітэта (БДУ) і інстытутаў была створана сістэма кафедраў філасофіі. У іх задачу ўваходзіла выкладанне дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму на выснове працаў К. Маркса, Ф. Энгельса, У. Леніна, В. Сталіна. Пасля таго як даследчы інстытут беларускай культуры быў трансфармаваны ў Акадэмію навук БССР узнік накірунак даследчай філасофіі. У 1931 годзе ў структуры Акадэміі быў створаны інстытут філасофіі. К гэтаму часу падрыхтоўка прафесійных філосафаў вялася на факультэце грамадскіх навук БДУ. Выкладалі прафесары С. Вальфсон (1894-1941), Б. Быхоўскі (1901-1980), В. Іваноўскі (1867-1939), С. Коцэнбоген (1889-1946), В. Сцяпанаў (1903-1979), І. Лушчыцкі (1907-1973), Г. Левін (1907-1974), К. Буслаў (1914-1983).

С. Вальфсон узначаліў інстытут філасофіі АН БССР. Былі выдадзены дапаможнікі па дыялектычнаму матэрыялізму. Навуковыя інтарэсы прафесароу былі звязаны з метадалогіяй навукі (В. Іваноўскі, Г. Левін), даследаваннем творчасці К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча (І. Лушчыцкі), аналізам філасофскіх поглядаў Берклі, Дэкарта, Гегеля, К'еркегора, Спінозы, Фейербаха, Фрэйда. Шапенгаўэра (В. Быхаўскі). Пэўны час у Мінску (1955-1961) працаваў Ф. Аляксандраў. Ен вядомы як аўтар комплексных

працаў па гісторыі заходнееўрапейскай філасофіі і гісторыі сацыялогіі (1958).

У 1947 годзе на гістарычным факультэце БДУ было адкрыта аддзяленне філасофіі. Яно існавала да 1989 года. На яго выснове быў створаны філасофска-эканамічны факультэт з кафедрамі філасофіі гуманітарных і натуразнаучых навук, а таксама з кафедрай гісторыі філасофіі, этыкі, эстэтыкі, логікі. Загадвалі кафедрамі В. Сцяпана, Г. Давыдюк, П. Карака, І. Жбанкова, А. Кляўчэня, М. Рожын, В. Сцепін, А. Елсукоў, А. Зелянкоу.

У Беларускім політэхнічным інстытуце кафедру філасофіі узначаліу П. Пратасеня. Была адкрыта аспірантура. Вялася падрыхтоука кандыдатау навук. На кафедры больш дзесяці гадоу працавау В. Сцепін, а таксама А. Елсукоу, П. Карлюк, В. Камароу, У. Беркау, В. Салееу. В. Грынін, Л. Уварау, У. Семянюк. Распрацоувалася эстэтыка у непасрэднай інтэграцыі з кафедрамі архітэктурнага факультэта, а таксама пытанні філасофіі і метадалагіі інжынернай дзейнасці, этыкі, логікі.

У Беларускім радыетэхнічным інстытуце адметнасці кафедры філасофіі сфарміравау Ю. Харын. Перавага аддавалася даследаванню катэгарыяльных структурау марксісцкай дыялектыкі, філасофіі сацыяльнага дзеяння. У Беларускім тэхналагічным інстытуце накірунак даследаванняу кафедры філасофіі вызначыу П. Вадап янау, тэматыкай арыентаванай на экалогію, біясферу.

Дз. Шыраканаў у інстытуце філасофіі АН БССР зрабіў прадметам даследаванняў катэгарыяльныя структуры марксісцкай дыялектыкі ў цеснай сувязі з метадалогіяй навукі. Асаблівая вага надавалася аналізу феномена дэтэрмінізму. На праблематыцы метадалогіі натуразнаўчых навук заснаваны даследаванні па касмалогіі і астрафізіцы А. Трафіменкі.

У інстытуце філасофіі АН БССР сфарміравалася школа даследаванняў гісторыі філасофскай думкі Беларусі. Узнікла традыцыя сістэматычных гісторыка-філасофскіх даслеванняў на выснове выпрацаванай храналагічнай катэгарызацыі асоб і грамадскіх працэсау. Даследаванні М. Алексютовіча, Е. Бабосава, А. Біралы, М. Батвініка, Г. Галенчанкі, Э. Дарашэвіча, В. Кароткага, Т. Кароткай, А. Козела, У. Конана, А. Кляўчэні, А. Коршунава, І. Лушчыцкага, А. Лягчыліна, С. Неміроўскага, А. Майхровіча, Я. Мараша, М. Махнача, С. Падокшына, Я. Парэцкага, Е. Пракошына, С. Сокала, В. Старасценкі, К. Тарасава, А. Яфрэмава.

Катэгарыяльныя структуры антычнай філасофіі даследаваў М. Іоська (1929-1986). Катэгарыяльны апарат марксісцкай дыялектыкі даследавалі Д. Шыраканаў, А. Харын, А. Зелянкоў. Пад уплывам даследаванняў па сярэдневечнай філасофіі культуры да тэмы суадносіны катэгорый філасофіі і культуры звярнуўся В. Сцепін. Ен рэканструяваў працэс фарміравання філасофскіх катэгорый на выснове ўніверсалій культуры. Пры гэтым ен актыўна карыстаўся прыкладамі з еўрапейскай і кітайскай культур. Ен увеў перыядызацыю эвалюцыі прафесійнай філасофіі і навукі на выснове змены тыпаў рацыянальнасці.

Марксісцкая філасофія Беларусі доугі час не звярталася да даследаванняў некласічнай філасофіі ў канструктыўным яе разглядзе. Пераломнымі сталі працы В. Сцепіна, А. Міхайлава, М. Рожына, А. Гурко, М. Фурса.

В. Сцепін займаючыся метадалогіяй навукі сутыкнууся з неабходнасцю знаемства з працамі пазітывістаў. Гэтыя працы далі штуршок да распрацоукі на марксісцкай выснове катэгарыяльнай мадыфікацыі даследчага працэсу сучаснай навукі. Аналагам парадыгмы Т. Куна стала навуковая карціна свету. Змена карцінау свету адбываецца не ў залежнасці ад навуковай суполкі, а пад уплывам супярэчнасцей абумоўленых няздольнасцю існуючых тэорый інтэрпрэціраваць факты. У выніку навуковай рэвалюцыі мяняецца мадыфікацыя навуковай рацыянальнасці, стыль навуковага мыслення. У гэтым працэсе актыуную ролю адыгрываюць філасофскія прынцыпы. Змястовая і метадалагічная эвалюцыя даследчай навукі прасленджана В. Сцепіным на прыкладзе фізічнай тэорыі.

А. Міхайлау прысвяціу даследаванні эпістэмалагічнай тэматыцы, бяручай пачатак ад Р. Дэкарта і ідучай цераз рацыяналізм І. Канта да фенаменалогіі, экзыстэнцыялізму і філасофскай герменэўтыкі. Разгледжаны адметнасці эвалюцыі заходнееўрапейскай кантынентальнай некласічнай філасофіі.

М. Рожын засярожаны на эвалюцыі класічнай новаеурапейскай філасофіі на выснове эпістэмалагічных парадыгм картэзіянскай і кантаўскай гнасеялогій. У манаграфіі «Праблема аб ектыўнай дастаâернасці ведаў у еўрапейскай філасофіі (ад Р. Дэкарта да Л. Вітгенштэйна) фармулюецца метадалогія сучаснай эпістэмалогіі. Яна заключаецца ў тым, што дастаâернасць ведаў фарміруецца не прамой адпаведнасцю інфармацыі аб прадмеце самому прадмету, а з улікам патрабаванняў дастаâернасці ў выглядзе прынцыпаў, пара-

дыгм. Пазнаючы суб’ект фармулюе крытэрыі даставернасці ведаў. У дадзеным кантэксце трэба разлічаць пытанні даставернасці ведаў і іх аб ектыунасці.

Даставернасць фарміруецца крыніцамі інфармацыі, спасылкамі на крыніцы. Аб ектыунасць адносіцца да кагнітыунай логікі мыслення ў межах якой дамінуюць ментальныя структуры, вопыт, жыццевы свет. Яны фарміруюць крытэрыі аб’ектыўнасці ведаў. Механізм рэалізацыі ідэала аб’ектыўна-даставерных ведаў вызначаецца зыходнымі перадумовамі філасофска-гнасеялагічнай канцэпцыі, якая свядома ці несвядома прымаецца дадзенай супольнасцю.

Р. Дэкарт зрабіу свядомай філасофска-метадалагічную мадэль узаемадзеяння кагнітыунага мыслення чалавека з аб ектыўнай рэчаіснасцю на выснове тэорыі ідэй. Ею карысталіся без альтэрнатыуна сто гадоў. Гэтага падыходу прытрымліваліся А. Арно, Дж. Локк, Д. Берклі. З характэрнымі для яго ўнутранымі супярэчнасцямі сутыкнуўся Д. Юм і прадставіў іх у тэкстах сваіх прац. М. Рожын паказвае, што І Кант пачынае з факту існавання ведау і даследуе ўмовы неабходныя для таго каб такія веды былі магчымымі. Ен распрацоўвае метадалогію канцэптуальна-тэкстуальнага падыходу да праблемы ведаў. Акцэнт ен робіць на кагнітыўную структуру мыслення ў выглядзе вопыту. Ен паставіў задачу выявіць магчымасць вопыту як адзінства пачуццевага назірання і рацыянальнага мыслення характэрныя ім апрыерныя формы, якія надаюць аб ектыўнае значэнне як пачуццевым успрыняццям, так і разумовым тлумачэнням.

Не ўсе еўрапейскія філосафы прынялі гнасеялагічны падыход І. Канта, заснаваны на вопыце. М. Рожын паказвае, што ў парадыгме Р. Дэкарта пісалі творы Б. Рассел, Дж. Мур, А. Айер. Але яны фактычна былі інтэграваны ў дамінанту кантаўскай парадыгмы. Прадметам даследаваня М. Рожына сталі працы ранняга і позняга Л. Вітгенштэйна, Г. Рэйхенбаха, І. Шэфлера, У. Куайна. Ен паказаў, што лагічны эмпірызм захаваў кантаўскі падыход, які заключаецца ў тым, што ўсялякае меркаванне аб аб’ектыўнасці патрабуе кантэксту – канцэптуальнай схемы ў выглядзе катэгарыяльнай мовы. Пры гэтым гэтыя схемы не абмяркоуваюцца. З іх дапамогай фармулююцца сказы.

Пад уплывам пераменаў у кагнітывістыцы, абумоуленых адкрыццем паралельнага суіснавання ў культуры ментальнасцяу позні

Л. Вітгенштэйн, на думку М. Рожына, удакладніу разуменне канцэптуальнай схемы як сеткі паняццяу і правілаў, ствараючай структуру дакладнай мовы-гульні. Гэтая трансфармацыя азначала пераход эпістэмалогіі ад традыцыі лагічнага аналізу да гісторыка-метадалагічнага даследавання канцэптуальных схемаў ва ўмовах дынамікі пазнавальных структур сучаснай навукі і суіснавання канцэптуальных схемаў.

Прадметам аналізу М. Рожына сталі метадалагічныя даследаванні Т. Куна. Ен знайшоў у ей недахопы, звязаныя з тлумачэннем механізмау змены і прыняцця навуковай суполкай парадыгмы даследчай і тлумачальнай навукі ў выглядзе сістэмнай інтэрпрэтацыі інфармацыі аб рэчаіснасці на выснове выбранай за даставерную тэорыі. Асноуны фундаментальны вывад М. Рожына сфармуляваны адносна эвалюцыі кантаускага падыходу да эпістэмалогіі. Сутнасць у тым, што ад дамінанты маналагічнай мадыфікацыі канцэптуальнай схемы гэты падыход дзякуючы Л. Вітгенштэйну зрабіу эвалюцыю да дыялагавай мадыфікацыі суіснавання канцэптуальных схемау. У гэтым заключаецца веліч Л. Вітгенштэйна. У сваім творы М. Рожын не назвау прозвішча беларускага філосафа найбольш блізка ўспрыняушага пазіттывізм і кантаўскую метадалогію канцэптуальнай схемы вопыту. Спасылка на гэтыя канцэпты ў савецкі перыяд гісторыі магла стварыць праблемы любому даследчыку. Аднаму з іх на выснове катэгарыльнай марксісцкай філасофіі удалося адаптаваць праблематыку даследаванняў Т. Куна да рэканструкцыі структур навуковай дзейнасці. Аутарам гэтых творау стау В. Сцепін. Ен крытычна аднесся да тлумачэнняу Т. Куна адносна прыроды і змены навуковых даследчых парадыгмаў у сучаснай навуцы. Прапанавана катэгарыяльная гісторыка-культурная мадыфікацыя навукі на выснове тэрмінау навуковая карціна свету, ідэалы і нормы навуковай дзейнасці, філасофскія прынцыпы, станаўленне навуковай тэорыі, тэорыя і факт, тэарэтычны і эмпірычны ўзроўні навуковай дзейнасці, этас навукі.

Акрамя канцэпцыі Т. Куна вядомай на Беларусі стала канцэпцыя навукова-даследчых праграмау – І. Лакаташа. Канцэпт «праграма» стаў аб'ектам аналізу ў логіцы У. Беркаў, І. Церлюкевіч, а таксама ў філасофіі дзейнасці – А. Лойка пад назвай філасофска-металагічнае даследаванне праграм дзейнасці: аксіялагічны аспект.

Напрыканцы XX – пачатку XXI стагоддзя беларускія філосафы выдалі фундаментальны слоўнік «История философии: Энциклопе-

дия» (2002). У ім бачны асноўныя накірункі даследавання катэгарыяльных структурау сучаснай філасофіі айчыннымі даследчыкамі. Сярод аўтараў М. Мажэйка. Яна ажыццявіла параўнаучы аналіз катэгарыяльных структураў постмадэрнізму і сінергетыкі. Вынікі выкладзены ў выданні «Становление теории нелинейных динамик в современной культуре» (1999). Яшчэ адзін аутар – А. Гурко даследавала катэгарыяльныя структуры постмадэрнізму на прыкладзе Ж. Дэрыды ў творы «Жак Деррида. Деконструкция: тексты и интерпретация» (2001).

Пошукі навуковага падыходу да параунаучага аналізу філасофскіх тэкстау прывялі А. Гурко да творчасці Д. Зільбермана. Яна ўспрыняла, распрацаваную ім мадальную метадалогію. Аб гэтым сведчыць яе твор «Модальная методология Давида Зильбермана» (2007). Ею разгледжана ідэя дадатковасці тыпаў катэгарыяльных структураў філасофіі, ствараючых Philosophia Universalis. Выдзелены для разгляду ідэальныя аб екты і ідэялізацыя, метады даследавання і разумення, мадальнасці.

Сканцэнтравана ўвага на адметнасцях мадальнага разумення і канструявання культуры. Разгледжаны працэдуры мадальнай метадалогіі – першасная, тэкставая, культурная, другасная, інтэрпрэтатыуная. Д. Зільберман імкнууся зрабіць прадметам даследавання рэканструкцыю дзейнасці філосафа ў яе сутнасных своеасаблівасцях. Для гэтага ен меркавау зфарміраваць комплекс пракаменціраваных, мадальна-пераутвораных тэкстау, ствараючых аснову будучай, усведамляючай сваю мадальную прыроду філасофіі. У такім разуменні філасофія зводзіцца да кампаратывістыкі тэкстаў, адкрываючай прадметнае поле дзейнасці мысляроу, незалежна ад іх прыналежнасці да адметных лакальнымі праявамі ландшафтаў культуры.

А. Гурко зразумеушы падыход Д. Зільбермана выкарыстала гэтае разуменне для больш глыбокага аналізу дэканструкцыі Ж. Дэрыды на прыкладзе граматалагічнага даследавання імяслаўя Творцы. Міжцывізацыйны падыход дазволіў А. Гурко ў катэгорыях кампаратывістыкі разгледзець імяслаўе Творцы на прыкладзе тэкстаў рускай рэлігійнай філасофіі і заходнееўрапейскай філасофіі культуры. Прыкладны аспект педагагічнай дзейнасці А. Гурко рэалізавала у ЗША ў Бостанскім універсітэце і каледжах горада.

Універсітэцкая філасофская навука Беларусі інтэгравана ў навучальны працэс. Яна забяспечвае ў форме педагагічнай дзейнасці

(лекцыі, практычныя заняткі, напісанне і выданне дапаможнікаў) агульнаадукацыйную місію падрыхтоукі кадрау для нацыянальнай эканомікі. Педагагічная дзейнасць спалучаецца з выхавaучай і ідэялагічнай дзейнасцю, метадалогіяй.

Навукова-даследчы працэс стаў аб ектам рэфлексіі беларускіх філосафаў у ХХ стагоддзі ў рамках марксісцкай метадалогіі. Адной з першых да метадалогіі наўкі звярнулася С. Яноўская. Яе інтарэсы ў галіне матэматыкі пад час працы ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце перараслі ў форму заняццяу матэматычнай логікай. Яна ініцыявала дзейнасць метадалагічнай школы, якая адыграла важную ролю ў станауленні ў СССР кібернэтыкі. Яна спрыяла выданню на рускай мове працаў прадстаунікоу пазітывісцкай метадалогіі. Важную ролю ў гэтай працы адыграла паездка ў Маскву Л. Вітненштэйна і працяглыя размовы з ім С. Яноўскай.

А. Багданаў (Маліноўскі) на прыкладзе тэкталогіі (арганізацыйнай навукі) паказаў практыкаарыентаваную накіраванасць метадалогіі сістэмнага падыходу да прыродных і сацыяльных структурау. Такі ж практычны падыход у межах метадалогіі сістэмнага падыходу прадэманстраваў Л. Чыжэускі. Л. Выгацкі метадалогію навукі разглядаў у міждысцыплінарнай функцыі даследавання творчых працэсаў пачынаючы са школьнага ўзросту. Фактару культуры ен адводзіў важную ролю.

Важная метадалагічная роля ў навуковых даследаваннях у працах беларускіх філосафау адводзілася катэгарыяльным структурам дыялектыкі (Дз. Шыраканау). Яшчэ адна метадалагічная школа навуковых даследаванняу была створана В. Сцепіным. У ей робіцца акцэнт на канвергенцыю катэгарыяльных структураў дыялектыкі (філасофскіх прынцыпаў) з катэгорыямі культуры і уласным катэгарыяльным апаратам метадалогіі навукі. В. Сцепін прапанаваў мадыфікацыю гэтага катэгарыяльнага апарату. Блок канцэптаў эмпірычнага і тэарэтычнага ўзроўняу навуковага даследавання быў дапоўнены блокам метатэарэтычных канцэптау. Гэта ідэалы і нормы навуковага даследавання, навуковая карціна свету, філасофскія прынцыпы.

Навуковая карціна свету ў сістэмным выглядзе прадстаўляе канцэптуальнае бачанне навукоўцамі на падставе распрацаваных імі тэорыяў прадметнай вобласці, прыроды, сацыяльнай рэчаіснасці. Крытэрый аб ектыунасці забяспечваюць ідэалы і нормы навуковай

дзейнасці. На іх выснове выпрацоўваецца этас навуковай дзейнасці, адной з задач якога з'яўляецца барацьба з плагіятам.

В. Сцепін зрабіу прадметам сваіх даследаванняу эвалюцыю даследчых структураў навукі на прыкладзе навуковай тэорыі ў фізіцы. Змена навуковых тэорыяў стала ім абазначацца навуковымі рэвалюцыямі. Сутнасць гэтых навуковых рэвалюцыяў кумулятыўная. Гэта значыць, што раней распрацаваныя тэорыі застаюцца ў прадметнай і агульнанавуковай карціне свету з улікам таго, што яны апісваюць розныя падсістэмы прыродных і тэхнічных структураў. Чарговая навуковая рэвалюцыя азначае прызнанне навуковай суполкай статусу новай тэорыі, напрыклад квантавай механікі і тых магчымасцей, што адкрываюцца перад даследчыкамі і распрацоўшчыкамі. Гэта прызнанне эўрыстычнага патэнцыялу новай тэорыі, якая павялічвае даследчыя і канструктарскія магчымасці ў інавацыйнай дзейнасці.

М. Рожын паказаў, што сучасная навука мае агульную метадалагічную выснову ў выглядзе катэгарыяльных структураў. Гэтыя структуры маюць адметнасці мовы, напрыклад, у Т. Куна гаворка ідзе аб парадыгме, у В. Сцепіна – аб навуковай карціне свету. Т. Кун разглядае эвалюцыю навукі цераз змену парадыгмаў (навуковыя рэвалюцыі) і В.Сцепін разглядае эвалюцыю навукі цераз навуковыя рэвалюцыі (змена навуковых карцінау свету). Розніца ў іх падыходах у тым, што Т. Кун разглядае змену парадыгм як вынік пошуку кансэнсусу сярод навукоўцаў, як іх здольнасць прыняць новы стыль навуковага мыслення. В. Сцепін бачыць прычыну змены навуковых карцінаў свету не толькі ў суб'ектыўных здольнасцях навукоуцаў да кансэнсусу і новых тыпаў рацыянальнасці, але і ў навуковых фактах, якія пабуджаюць навуковую супольнасць прызнаць перамены і даць ім адпаведную навуковую інтэрпрэтацыю.

Пэўная аналогія мае месца ў метадалагічных падыходах айчынных філосафаў з метадалогіяй даследчых праграмаў І. Лакаташа. Гэты падыход пры разглядзе мадэрнізацыі праграм дзейнасці рэалізаваў А. Лойка. Толькі ў адрозненне ад І. Лакаташа А. Лойка большую ролю надае пераймальнасці ў форме інстытуцыянальных практык, ствараючых выснову лінейнай эвалюцыі навукі на ўзроўні навуковых школаў, чалавечага капіталу.

Рынкавая эканоміка актуалізавала разгляд фактараў няжорсткай дэтэрмінацыі, сярод якіх важную ролю адыгрываюць фактары

рызыкі, нелінейнасці. Улік гэтых фактараў і мінімізацыя іх наступстваў важныя для эканамічных і палітычных структураў, міністэрства надзвычайных сітуацыяў, ваеннага ведамства. Сінергэтыка мае і такую метадалагічную праяву, як сінергія – уменне фарміраваць камандны стыль працы. Пад уплывам экалагічнай парадыгмы (П. Вадап'янаў, П. Карака) усе большая роля надаецца вывучэнню экалагічных рызык пры ажыццязленні праектаў, практычнай дзейнасці ў прамысловых памерах. Пад уплывам праблематыкі штучнага інтэлекту назіраецца рост ролі метадалогіі канвергенцыі гуманітарных і тэхнічных навук. Гэтая тэматыка стала прадметам даследаванняў А. Лойкі, В. Старжынскага.

Агульная метадалагія абапіраецца на тэорыю навуковага метаду, распрацаваную У. Лукашэвічам, а таксама на даследаванні лагічных аспектау навуковай дзейнасці і прадстаўлення яе вынікаў сродкамі навуковай аргументацыі (У. Беркаў, Я. Яскевіч). Дзякуючы метадалагічным распрацоўкам беларуская даследчая навука ўтрымлівае высокі ўзровень творчай актыўнасці. Дзяржава патрабуе каб гэты узровень меў больш эфектыуны працяг у вопытна-канструктарскай працы і распрацоўках. З гэтай мэтай ідзе пошук і апрабацыя новых арганізацыйных структураў навукова-практычнай дзейнасці. У ліку гэтых структураў тэхнапаркі, кластэры, стартапы, тэхналагічныя платформы, бізнес-інкубатары. Накоплены вопыт дзейнасці Парку высокіх тэхналогіяў. Вядзецца будаўніцтва індустрыяльнага парку «Вялікі камень». Важную ролю ў развіцці беларускай навукі адыгрываюць метадалагічныя практыкі ўдзелу ў міжнародных праграмах сумесных даследчых праектаў, праграмах абмену студэнтамі, маладымі вучонымі ў форме стажыровак, кароткатэрміновага навучання. Веданне англійскай мовы дазваляе беларускім вучоным друкаваць вынікі даследаванняў у аўтарытэтных навуковых часопісах, што ўплывае на рэйтынг навучальных устаноў.

### *2.4. Даследчая накіраванасць акадэмічнай філасофіі*

Акадэмічная філасофія (інстытут філасофіі НАН Беларусі) акцэнтавана на даследчай працы, асноўным заказчыкам якой з'яўляецца беларуская дзяржава. Праведзены комплекс навуковых даследаванняу па гісторыі філасофскай думкі Беларусі, метадалогіі навукі, сацыяльнай філасофіі.

Акадэмічная філасофія Беларусі бярэ пачатак з моманту стварэння ў трыдцатых гадах XX стагоддзя ў структуры АН БССР

навукова-даследчага інстытуту філасофіі. Ен быу створаны у 1931 годзе. Дырэктарам стаў С. Вальфсон. Да інстытуту ў 1935 годзе быў далучаны інстытут права і савецкага будаўніцтва. З 1938 году інстытут не функцыянаваў з-за сталінскіх рэпрэсіяў. Аднавіў працу ў 1947 годзе. У 1990 годзе на базе сацыялагічных структураў інстытуту быў створаны інстытут сацыялогіі НАН Беларусі. У 1999 годзе з інстытуту быў вылучаны ў самастойным інстытуцкім статусе сектар права.

С. Вальфсонам, І. Ільюшыным, Г. Аляксандравым, В. Сербентай, В. Горбачам былі актуалізаваны асноўныя тэмы акадэмічных даследаванняў. У шасдзісетых гадах ХХ стагоддзя асноўнымі тэмамі сталі гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі («Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии» (1962)), дыялектыка, логіка і метадалогія навуковай дзейнасці («Творчество в научном познании» (1976)), чалавек і грамадства (А.С. Майхрович «Поиск истинного бытия и человека. Из истории философии и культуры Беларуси» (1992)).

Вядомасць і прызнанне атрымалі даследаванні Дз. Шыраканава, Я. Бабосава, К. Буслава, П. Вадап янава, В. Конана, М. Купчына, А. Майхровіча, А. Манеева, С. Падокшына, Ю. Харына. Дз. Шыраканаў аказаў уплыў на фарміраванне практыкаарыетаваных даследаванняў па філасофіі сацыяльнага дзеяння (Ю. Харын), сацыяльнай экалогіі (П. Вадап'янаў), метадалогіі (У. Лукашэвіч, М. Жукаў, А. Трафіменка, В. Тузава, В. Старжынскі), філасофіі мадэрнізацыі дзейнасці (А. Лойка). Канвергенцыя дыялектыкі, логікі, метадалогіі, эўрыстыкі дазволіла рэалізаваць сістэмны падыход да праблем навукі.

Я. Бабосаў зрабіў акцэнт на сацыяльную тэматыку. У выніку былі выпрацаваны методыкі практычных даследаванняу грамадскай свядомасці ва ўмовах сацыяльнай трансфармацыі эканомікі. Эмпірычныя даследаванні далі матэрыял для арганізацыі ідэялагічнай працы ў кантэксце нацыянальнай бяспекі, устойлівага развіцця грамадства.

Ва ўмовах незалежнай Беларусі інстытут філасофіі НАН уключае цэнтры 1) філасофска-метадалагічных і міждысцыплінарных даследаванняў; 2) сацыяльна-філасофскіх і антрапалагічных даследаванняў; 3) даследаванняў глабалізацыі, інтэграцыі і сацыякультурнага супрацоўніцтва; 4) кіравання ведамі і кампетэнцыямі.

Т. Адула абгрунтавана разуменне інтэлектуальнай прасторы Беларусі, што дазволіла сістэматызаваць гісторыка-філасофскія даследаванні з улікам культурнага кантэксту асобнай краіны. Рэалізавана выданне філасофскай думкі Беларусі з улікам прыярытэтаў і каштоўнасцей інтэлектуальнай дзейнасці.

Аварыя на Чарнобыльскай АЭС стварыла накірунак даследаванняў у пацярпеўшых раенах з улікам не толькі тэхнічных, але і гуманітарных аспектау сацыяльнай экалогіі. Распрацавана і рэалізавана комплексная метадалогія адаптацыі пацярпеушых тэрыторый да новых умоў жыцця, прамысловай і сельскагаспадарчай дзейнасці. Была захавана інфраструктура населеных пунктаў, вытворчая база, камунікацыі. У непасрэднай блізкасці ад Чарнобыльскай АЭС створана зона адсялення са спецыяльным допускам для навукоўцау.

Каардынацыйная праца інстытуту філасофіі (дырэктар А. Лазарэвіч) дазволіла правесці ў 2017 годзе першы філасофскі кангрэс, на якім была прадстаўлена тэматыка навуковых даследаванняў, сумесных праектаў. Фундаментальныя даследаванні спалучаюцца з практычным забеспячэннем інтэграцыйных праектаў у фарматах Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, ЕАЭС, Эканамічнага поясу Шоўкавага шляху. Пад увагу бяруцца адносіны Беларусі з Еўрапейскім Саюзам, міратворчая роля Беларусі ў рэгіене.

## 3. Практычны раздзел. Філасофія і сацыяльная інжынерыя

### *3.1. Філасофія ў структуры юрыдычнага дыскурсу*

На Беларусі філасофія і юрыдычны дыскурс цесна звязаны. Першапачатковай формай іх сувязі было кананічнае права сярэднявечча. Гэтая сувязь бачна ў творах К. Смалятыча, К. Тураўскага. Тэалагічны дыскурс дэтэрмінуе змест кананічных нормаў і суправаджае яго асаблівай стылістыкай даходлівай формы з дапамогай метафары, павучання. У гэтай стылістыцы мае месца арыентаванасць на свядомасць веруючага. К моманту прыняцця хрысціянства насельніцтва Беларусі выпрацавала мясцовае права і практыкі правапрымянення. На яго выснове разглядаліся спорныя справы, крадзяжы, забойствы, скаргі. Гэта было комплекснае не пісанае права, рэалізацыяй якога займаліся копныя суды. Пісанае права прадстала ў выглядзе Біблії, «Рускай праўды», дамоў ганзейскіх купцоў з беларускімі гарадамі.

Дзяржаунае права фарміравалася адметнасцямі тэрытарыяльнай цэласнасці Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жэмойцкага. У эвалюцыі дзяржаўнага права адыгралі ролю фактары інтэграцыі краіны ў прастору еўрапейскай культуры. Юнакі з Беларусі атрымлівалі адукацыю ва ўніверсітэтах Еуропы дзе знаеміліся з рымскім правам і тэорыяй натуральнага права. Гэты ўплыў стаў відавочны ва ўмовах эпохі Адраджэння. У прадмовах да выданняў праблемы суадносіны натуральнага, кананічнага і дзяржаунага права разглядаў Ф. Скарына. Пра неабходнасць дыктатуры права ў грамадстве і дзяржаве пісаў М. Гусоўскі. Ен матываваў асобую ролю права праблемамі карупцыі сярод чыноўнікаў, адсутнасцю адзінства сярод шляхты ва ўмовах знешніх палітычных пагроз. Турбавала яго невысокая прававая культура насельніцтва.

С. Будны бачыў прававую тэматыку Беларусі скрозь шматканфесійнасць хрысціянства. Ен хацеў каб права гарантавала свабоду веравызнання, талерантнасць. Прававыя нормы гарантавалі асаблівую атмасферу палемікі па духоуным пытанням прадстаўнікоў праваслауя, кальвінізму, каталіцызму, шырокага спектру пратэстанцкіх абшчынау. У падобным накірунку пісаў палемічныя творы А. Волан. Ва ўзаемадзеянні з Л. Сапегай ен стварыў унікальную метадалагічную выснову заканадаўчай дзейнасці ў ВКЛ. Сутнасць яе заключалася ў канвергенцыі розных прававых практык, якімі карысталася насельніцтва Беларусі ў адзіны комплексны дакумент дзяржаунага права. Гэтым дакументам стаў Статут ВКЛ. Гэты дакумент (канстытуцыя) пастаянна ўдасканальваўся. Ен уключаў маемаснае, грамадянскае, крымінальнае, дзяржаўнае права. Гэтым дакументам быу гарантаваны дзяржаўны статус беларускай мовы. Канвергенцыя дала магчымасць карыстацца ў межах Беларусі практыкамі Магдэбургскага права. Актыўна выкарыстоўвалася права міждзяржаўных зносінаў. На яго выснове ажыццяўлялася палітыка палітычнага і ваеннага саюзу ВКЛ з Каралеўствам Польскім. Узмацненне адносінаў было юрыдычна афармлена ў форме канфедэрацыі пад назвай «Рэч Паспалітая». У межах канфедэрацыі абедзьве дзяржавы захоувалі самастойны юрыдычны статус. Прывабнасць грамадзянскага права Каралеўства Польскага для беларускай шляхты была настолькі высокай, што са шляхецкімі вольнасцямі была ўспрынята польская мова і вобраз жыцця. Паколькі Каралеўства Польскае характарызавалася абсалютным аўтарытэтам каталіцкай царквы, то са стварэннем канфедэрацыі ўплыў

гэтай царквы стаў расці і на Беларусі. Гэты рост супаў з Контррэфармацыяй. У грамадстве ВКЛ умацаваліся пазіцыі езуітау і кананічнага права. Атэізм у такіх умовах нес рызыку смяротнага асуджэння. Ахвярай гэтага права стаў К. Лышчынскі. Езуіты фактычна адыйшлі ад прынцыпаў верацярпімасці, суіснавання з другімі хрысціянскімі канфесіямі. Шляхам стварэння ўніяцкай царквы яны імкнуліся падпарадкаваць праваслаўных Беларусі Ватыкану. Беларуская мова была пазбаўлена статусу дзяржаўнай мовы.

Шляхта па свойму інтэрпрэціравала еўрапейскае саслоўнае грамадзянскае права. Юрыдычныя правы яна гарантавала толькі сабе. Сяляне і гараджане аказаліся пазбауленымі юрыдычных гарантый недатыкальнасці. Пачаліся масавыя уцекі сялян у Запарожскую Сечу. Права вета фактычна блакавала законатворчую дзейнасць дэмакратычных саслоуных структурау. У якасці аргументау замест права сталі практыкавацца наезды з мэтай фізічнага знішчэння супрацiунікаў. На палітычным узроуні ўзніклі канфедэрацыі (групоўкі шляхты, арыентаваныя на суседнія дзяржавы). Спробы прававым шляхам рэфармаваць Рэч Паспалітую не ўратавалі дзяржаву ад тэратэрыяльнага яе падзелу, зробленага Аустра-Венгрыяй, Прусіяй, Расійскай імперыяй.

Узброеныя паўстанні, накіраваныя на аднаўленне Рэчы Паспалітай, падауляліся. У іх выніку на тэрыторыі Беларусі было адменена права часоў ВКЛ, шляхта за ўдзел у паўстаннях пазбавілася маемасці і была выслана ва ўсходнія рэгіены Расійскай імперыі. Віленскі ўніверсітэт і Полацкая езуіцкая акадэмія перасталі быць адукацыйнымі цэнтрамі. Моладзь Беларусі стала атрымліваць юрыдычную адукацыю ў цэнтральных рэгіенах Расійскай імперыі. Лепшым прапаноўвалі кафедры і магчымасць выкладаць юрыдычныя прадметы. У іх ліку быў В. Спасовіч (1829-1906). Ен быў прафесарам Пецярбургскага ўніверсітэту. Яго аўтарству належыць дапаможнік па вышуковаму праву (1863). Паколькі гаворка ійшла аб дзяржауным праве, то ў лекцыях і дапаможніку шмат месца адводзілася філасофскім і сацыяльна-палітычным ідэям новага часу, у тым ліку працам Ф. Бэкана, Р. Дэкарта, Б. Спінозы, Дж. Локка, Е. Бентама. Асабліва дэталева разглядаліся працы прадстаунікоў нямецкай класічнай філасофіі – І. Канта, Г. Фіхтэ, Г. Гегеля.

Сумесна з земляком І. Агрызка В. Спасовіч выдаваў штодзенную газету «Слова». Яшчэ адзін ураджэнец Беларусі Л. Петражыцкі (1867-1931) атрымаў адукацыю ў Кіеускім універсітэце. Стажыра-

вауся ў Гейдэльбергскім універсітэце і ў Берліне ў Рускім інстытуце рымскага права. Выкладаў у Пецярбургскім універсітэце. Займаўся пытаннямі грамадзянскага і агульнага права. Прытрымліваўся пазітывізму. Стварыў школу сацыялогіі. Яго паслядоўнікамі сталі П. Сарокін, Н. Цімашаў, Дж. Гурвіч, М. Кандрацьеў. Распрацаваў тэорыю псіхалагічнага права. Разглядаў права як псіхалагічную з яву.

Праблемы прававой культуры ў Расійскай імперыі вызначаліся тым, што існавау разрыў паміж юрыдычнай адукацыяй і прававой свядомасцю. Аб гэтым сведчыла распаўсюджанне дзейнасці арганізацый, якія аддавалі перавагу сродкам дасягнення палітычных мэтаў у форме тэрарызму, супрацьпраўнай дзейнасці. Расійскія ўлады рэагавалі смяротным пакараннем выканаўцаў тэрарыстычнай дзейнасці. Такія ж сродкі смяротнага пакарання выкарыстоўваліся ў адносінах да кіраўнікоў узброеных паўстанняў, накіраваных на аднаўленне Рэчы Паспалітай. Ахвярай аднаго з такіх прысудаў стаў К. Каліноўскі.

У перыяд першай сусветнай вайны, рэвалюцый у Расіі дзейнасць права на тэрыторыі Беларусі была абмежавана ваенным становішчам, палітычнай узброенай барацьбой. З прыходам да ўлады бальшавікоў права было падпарадкавана ідэялагічнай кампаненце. Фармальна ўлада апелявала да інстытуту права, фактычна дзейнічала згодна ідэялагічных тэорыяу чырвонага тэрору, ваеннага камунізму, абвастрэння класавай барацьбы пры сацыялізме. У практыку былі ўведзены рэпрэсіі ў форме абвінавачванняў у антыдзяржаўнай дзейнасці. Ахвярамі бяспраўя сталі сотні тысяч людзей з Беларусі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі што ўваходзіла ў склад Польшчы згодна Рыжскай дамове 1920 года беларускае насельніцтва цярпела ад адсутнасці прававых гарантыяу нацыянальнай меншасці ў галіне культуры, адукацыі. Адстойванне правоў этнічных беларусаў пагражала затрыманнямі, адпраукай у турмы, створаны польскімі уладамі канцэнтрацыйны лагер у Бярозе-Картузскай.

На фоне ідэялагічнай дамінанты абвастрэння класавай барацьбы пры сацыялізме права у Беларусі атрымала інстытуцыянальны статус дзякуючы неабходнасці рэгуляваць юрыдычныя адносіны у эканоміцы, сацыяльнай сферы. У 1922-1923 гадах на тэрыторыі БССР былі ўведзены ў дзеянне Вышуковы, Вышукова-працэсуальны, Грамадзянскі, Грамадзянска-працэсуальны кодэксы РСФСР. Улас-

нае заканадаўства прадставілі Зямельныя кодэксы і Лясны кодэкс. З 1922 года на тэрыторыі БССР дзейнічала заканадаўства СССР.

Законатворчую дзейнасць забяспечвалі навуковыя школы і ўстановы. У першую чаргу гэта быў БДУ. Тут працавалі В. Пічэта (гістарычная школа), В. Дурданеўскі (дзяржаўнае права), Г. Парэчын, Г. Гурвіч (савецкае дзяржаўнае права), Б. Чрэдзін (рымскае права), В. Дружчыц (гісторыя дзяржавы і права), М. Кроль (судовая псіхіятрыя). У 1929 годзе быў адкрыты інстытут беларускай культуры. У ім была створана кафедра сучаснага права. Яе ўзначальваў М. Грэдзінгер. Кафедра надрукавала працы па розных накірунках юрыдычных навук. Пасля таго, як інстытут беларускай культуры быў перайначаны ў Акадэмію навук БССР быў створаны інстытут савецкага будаўніцтва і права. Даследаванні па зямельнаму, калгаснаму, сямейнаму, крымінальнаму, грамадзянскаму, працоўнаму, воднаму праву праводзіліся пад кіраўніцтвам М. Грэдзінгера. У 1935 годзе тэматыка права была аб’яднана з тэматыкай філасофскіх даследаванняў. У 1938 годзе інстытут філасофіі прарвау сваю працу з-за масавых арыштау супрацоунікаў.

Тэматыка права стала даследавацца пасля перапынку ў 1954 годзе ў Сектары тэорыі і гісторыі права АН БССР. Сектар адносіўся да інстытута філасофіі. Пасля быў выведзены з інстытуту ў статусе Аддзела прававых навук. Важную ролю ў станаўленні тэматыкі юрыдычных даследаванняу адыграў С. Маргулінскі (1912-1978). Яшчэ адным цэнтрам юрыдычных навук стаў юрыдычны інстытут у Мінску, які быў уключаны ў склад БДУ ў статусе факультэта. У другой палове XX стагоддзя праводзіліся даследаванні па тэорыі дзяржавы і права (С. Маргулінскі, В. Дарогін, С. Драбязка), канстытуцыйнаму і адміністратыунаму праву (А. Галаўко, А. Крамнік, А. Лейзерау, Л. Прыходзька), грамадзянскаму праву (В. Чыгір, Ф. Гавзе, В. Гадуноў), сямейнаму праву (М. Юркевіч), крыміналістыцы (А. Дулаў).

У 1965 годзе аддзел прававых навук увайшоў у склад інстытута філасофіі АН БССР. Была канчаткова выпрацавана практыка суіснавання філасофіі і юрыдычных навук у прасторы адной установы. Прафесійны дыялог філосафаў і юрыстаў забяспечылі А. Абрамовіч, В. Арцемава, Л. Астроўскі, А. Галаўко, Т. Доўнар, С. Драбязка, В. Круталевіч, В. Кучынскі, А. Матусевіч, М. Проніна, Э. Саркісава, В. Семянкоў, В. Чыгір, В. Шабайлаў, В. Шкурко, М. Юркевіч, А. Цікавенка, І. Юхо, В. Яўменау. З боку філосафаў

блізкую тэматыку разглядалі І. Антановіч, Т. Адула, Я. Бабосаў, К. Буслаў, А Гусеў, Л. Крыштаповіч, С. Лапценак.

Пасля распаду СССР незалежнай Беларусі трэба было зфарміраваць сістэму прававой дзейнасці і юрыдычнай адукацыі. Важную ролю адыграла тое, што быў хутка выпрацаваны мадэль беларускай дзяржаунасці, заснаваны на моцнай прэзідэнцкай уладзе. Гэты мадэль уключыў у механізм прыняцця рашэнняу заканадаўчыя і выканаўчыя структуры, дзяржапарат чыноўнікаў, Канстытуцыйны суд і судовую ўладу, пракуратуру, адвакатуру, натарыят, праваахоўныя органы, структуру падаткаабкладання і збору падаткаў у дзяржаўны бюджэт, дзяржаўны кантроль, следчы камітэт, камітэт дзяржаўнай бяспекі. Прэзідэнцкая ўлада ўключае адміністрацыю і вертыкаль, якія займаюцца кадравым забеспячэннем і ратацыяй кадраў, распрацоўкай агульных падыходаў да нарматыуна-прававой забяспечанасці дзейнасці структур дзяржаўнай улады згодна Канстытуцыі РБ. Асноўны дакумент дзяржавы быў выпрацаваны з улікам традыцый сацыяльна-арыентаванай палітыкі, у выніку парады ў форме рэферэндума з насельніцтвам краіны па шэрагу прынцыповых пытанняў. Адно з іх тычылася артыкулу аб смяротным пакаранні. У выніку беларуская прававая сістэма дапускае магчымасць смяротнага пакарання ў адносінах да забойцаў. Гэтая норма не адпавядае прававой практыцы дзяржаў Еўрапейскага Саюзу. Яе дзейнасць абгрунтоўваецца вынікамі рэферэндуму, цераз які большасць насельніцтва Беларусі выказалася за прысутнасць меры смяротнага пакарання як выключнай меры ў прававой прасторы дзяржавы.

Прававы дыскурс з яўляецца асноўнай нарматыўнай мовай дыялогу беларускай дзяржавы з грамадствам. Ен вызначае правілы гаспадарчай дзейнасці, адказнасці, забяспечвае вырашэнне спорных пытанняў. Ен з’яўляецца мовай дыялогу саюзных структураў Беларусі і Расіі, мытнага саюзу, дзяржаў еўразійскага эканамічнага саюзу, СНД. На ім фіксуюцца вынікі міждзяржауных перамоў і дамоў. На ўзроуні асобы гэты дыскурс забяспечвае гарантыі адукацыі, працаўладкавання (заключэння кантракту), пенсійнага, медыцынскага забеспячэння, сацыяльнай падтрымкі. Зфарміравалася камерцыйная інфраструктура юрыдычных паслуг у форме натарыяту, адвакатуры, кансалтынгу, юрыдычных аддзелау. Любое пытанне можа атрымаць выраз на мове прававога дыскурсу. Да гэтых пытанняу адносяцца шлюб і развод, дзе разглядаюцца не толькі

матэрыяльныя праблемы падзелу маемасці, але і маральныя фактары кампенсацыі. Актуальнасць набылі пытанні інтэлектуальнай уласнасці.

Значны дзяржауны сектар дае занятасць у Беларусі вялікай колькасці людзей. Сярод іх есць тыя (чыноўнікі), ад каго залежыць рашэнне эканмічных пытанняў важных для прадпрымальнікаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў. У месцах сустрэчы ўзнікае высокая рызыка карупцыі. Рост матэрыяльных даходаў з улікам прапановы на рынку наркатрафіку стварыў асобы накірунак мабільнасці прававога дыскурсу ва ўмовах хуткай адаптацыі наркатрафіку і гандлю людзьмі да розных узроставых катэгорый беларускай моладзі. Наркатычныя сродкі ствараюць рызыку для супрацьпрауных дзеянняў, для дэвіацыі. Транзітныя шляхі міграцыі цераз тэрыторыю Беларусі ў Еўрапейскі Саюз стварылі неабходнасць прававой рэгламентацыі асноўных паняццяў міграцыі.

Прававы дыскурс забяспечвае нарматыўнай базай дзейнасць лясной гаспадаркі, выкарыстанне прыродных рэсурсау, дзейнасць медыцынскіх установ, пытанні экалогіі, інфармацыйнай бяспекі. Ен выкарыстоўваецца ў спартыўнай сферы ў форме антыдопінгавага кантролю.

Маніторынг і прафілактыка правапарушэнняў у форме прававой адукацыі адыгрывае важную ролю ў дзейнасці праваахоўных структураў. Ставіцца задача мінімізаваць рызыку правапарушэнняу на выснове прадстаўлення насельніцтву інфармацыі не толькі адукацыйнага зместу, але і аргументаванага довадамі наступстваў карупцыі, ухілення ад падаткаў, парушэння працоўнага заканадаўства, бацькоўскіх, шлюбных абавязкаў, удзелу ў ценявой эканоміцы, дзейнасці тэрарэстычных арганізацыяў.

У структурах юрыдычнай адукацыі пры падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне права разглядаюцца розныя пытанні метадалогіі юрыспрыдэнцыі. Яны сістэматызуюцца на ўзроўні філасофіі права, дзе разглядаюцца тэарэтычныя пытанні прававой свядомасці, праваразумення, правапрымянення, прававой ідэнтычнасці. На прыкладным узроўні разглядаюцца пытанні юрыдычнай этыкі, у тым ліку судовай этыкі, прафесійнай этыкі адваката, натарыўса, супрацоўніка праваахоўных органаў. Разглядаюцца сучасныя падыходы да разумення права і яго ўплыву на развіцце галіновага заканадаўства.

Падрыхтоўка юрыстаў у Беларусі вядзецца ў БДУ, Акадэміі МВД, інстытуце МВД (Магілеу) і камерцыйных інстытутах. Адным з заснавальнікау юрыдычнай адукацыі ў незалежнай Беларусі стаў заслужаны юрыст РБ С. Драбязка. У 2007 годзе шляхам аб яднання Нацыянальнага цэнтра законатворчай дзейнасці пры Прэзідэнце РБ з інстытутам дзяржавы і права НАН Беларусі быў створаны Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь (НЦЗПД). У структуры прававога кластэра функцыянуе інстытут прававых даследаванняў. Яго супрацоўнікі ўдзельнічаюць у рабочых групах, што займаюцца падрыхтоукай законапраектаў. У іх ліку законы аб камерцыйнай тайне, аутарскім праве і сумежных правах, аб патэнтах, аб міжнародных дамовах, аб прававых актах, аб трэцейскіх судах, аб медыяцыі, аб гандлевых біржах, аб фізічнай культуры і спорце. Створаны Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал РБ. Практычныя распрацоўкі дапаўняюць тэарэтычныя даследаванні, заказчыкамі якіх з'яўляюцца дзяржаўныя структуры. Даследчыкамі падрыхтаваны і абаронены дысертацыі па прававой тэматыцы і метадалогіі юрыдычных навук.

На фундаментальным філасофскім узроуні спецыялісты для далейшай эвалюцыі прававой сістэмы РБ выбралі метадалагію канвергенцыі парадыгм натуральнага права і пазітывізму (пісанага права). Высновай стала традыцыя выпрацаваная ў цэнтры антрапалагічных даследаванняў інстытуту філасофіі і права АН БССР. За аснову эвалюцыі права бярэцца антрапалагічная кампанента натуральных правоў і іх адлюстраванне ў канцэпцыях гуманізму, новаеўрапейскага рацыяналізму, класічнай нямецкай філасофіі. Разглядаюцца канцэпты годнасці асобы, прававой дзяржавы, правоў чалавека, прававой ідэнтычнасці.

Усе большая роля надаецца стымулюючай ролі прававога дыскурсу ў развіцці нацыянальнай эканомікі і адпаведнай структуры сацыяльных стратаў. Асаблівая роля надаецца інстытуту прадпрымальніцтва і перспектыве фарміравання сярэдняга класу. З мэтай прыцягнення прамых інвестыцыяу створана прававая база для функцыянавання тэхналагічных, індустрыяльных паркаў, свабодных эканамічных зонаў. Пад увагу бяруцца фактары чацвертай прамысловай рэвалюцыі, лічбавай эканомікі, структурнай мадэрнізацыі.

### *3.2. Філасофія і дыскурс эканамічных навук*

Філасофія пастаянна звяртаецца да эканамічнай тэматыкі, паколькі яна дэтэрмінуе разгляд усяго комплексу праблем сучаснага грамадства. Першапачаткова эканамічная тэматыка прысутнічала у тэалагічным дыскурсе ў творах К. Смалятыча і К. Тураускага. Згодна кананічнага права разглядаліся этычныя аспекты ўзаемаадносінау людзей наконт пытанняу павагі да чужой уласнасці і жыцця ўласнікаў.

Ва ўмовах Вялікага Княства Літоўскага эканамічныя пытанні разглядаліся на выснове філасофіі права, якая ўключала гарантыі асабістай уласнасці, саслоуных адносінаў, самакіравання гарадоў, ролі дзяржавы ў эканамічным жыцці грамадства. Статуты ВКЛ сталі практычнай рэалізацыяй эканоміка-прававой рэфлексіі Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С. Буднага, А. Волана, Л. Сапегі.

Да эканамічнай тэматыкі ў XVIII стагоддзі звярнуліся фізіякраты І. Храптовіч (1729-1812), І. Страйноўскі (1752-1815). Яны зрабілі спробу рэфармацыі ВКЛ ва ўмовах прыкладу рэвалюцыйнай Францыі, апеляваушага да каштоўнасцей натуральнага права. Аднак гэтая спроба не атрымала прававога статусу. Магнаты абмежаваліся прамысловай рэвалюцыяй у выглядзе мануфактур, каналау, тэатраў. Пры гэтым яны не ўнеслі ніякіх зменаў у эканоміку. Права асабістасці на зямлю было замацавана толькі за імі і за шляхтай. Мабільнасць сялян на рынку працы была абмежаваная.

У складзе Расійскай імперыі беларуская эканоміка спалучала ранейшы мадэль зямельнай уласнасці з развіццем гарадской прамысловасці, чыгунак. Стаў адчувальным уплыў марксізму. На пазіцыях гэтай філасофіі стаяў А. Багданаў (Маліноўскі). Ен адным з першых у эканамічнай тэорыі прадставіў эканоміку не толькі як вытворчасць, уласнасць, але і як арганізацыйную дзейнасць (тэкталогію).

У 1931 годзе ў складзе АН БССР быў створаны інстытут эканомікі. Прадметам даследаванняу навукоўцау сталі рэгіянальныя адметнасці беларускай эканомікі. Практычную частку склала распрацоўка другога пяцігадовага плану развіцця эканомікі БССР. У 1937 годзе інстытут быў закрыты. У пасляваенны час ен аднавіў працу ў межах даваеннай тэматыкі сацыялістычнага будаўніцтва.

Практыкаарынтаваную накіраванасць мела падрыхтоўка эканамістаў у БДУ на факультэце грамадскіх навук на аддзяленні эканомікі. Па гісторыі народнай гаспадаркі Беларусі лекцыі чытаў В. Пічэта, па гісторыі эканамічных вучэнняў, сусветнай гаспадарцы,

палітычнай эканоміі, грашоваму звароту і крэдыту, банкаўскай справе – І. Герцык, фінансава-эканамічныя дысцыпліны – В. Якушын, статыстыку – Я. Святлоўскі, эканоміку пераходнага перыяду – В. Кнорын. Асобныя прадметы выкладаў М. Доўнар-Запольскі.

У 1929 годзе ў структуры БДУ функцыянавалі два эканамічныя факультэты. З 1933 года працавалі планава-эканамічны, фінансава-эканамічны і кааперацыі інстытуты. Яны былі аб яднаны ў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі. Цяперашняя назва БДзЭУ. У БДУ засталіся толькі кафедры палітычнай эканоміі. А. Лур’е займаўся арганізацыяй іх дзейнасці. У 1966 годзе ў БДУ была адноўлена падрыхтоўка эканамістаў.

Пасля распаду СССР падрыхтоўка эканамістаў у Беларусі з улікам камерцыйных вышэйшых навучальных устаноў набыла масавы характар. У структуры БДУ дзякуючы намаганням М. Кавалева быў адкрыты эканамічны факультэт. Незалежная Беларусь стала перад праблемай выбару эканамічнага мадэлю існавання. Пад час рэфлексіі акрамя марксізму пад увагу браўся інстытуцыяналізм, кейнсіянства, этатызм.

На выснове канвергенцыі марксізму (сацыяльна-арыентаванай эканомікі) і этатызму (дзяржаўнай эканомікі), быў выпрацаваны мадэль, які атрымаў юрыдычнае замацаванне ў канстытуцыі. Для суіснавання рэнтабельнай (валютнай) і сацыяльнай (датацыйнай) эканомік былі на юрыдычнай міждзяржаўнай выснове створаны механізмы падтрымкі нізкаканкурэнтных вытворчасцяу і нафтагазавага комплексу (валютныя паступленні якога залежаць ад паставак сыравіны па спрыяльных цэнах з Расійскай Федэрацыі).

Юрыдычнымі і палітычнымі механізмамі падтрымкі беларускай канстытуцыйнай эканомікі сталі Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, ЕАЭС, мытны саюз. Для некаторых галін айчыннай вытворчасці экспарт на расійскі таварны рынак з’яўляецца асноўнай крыніцай іх даходаў. Рызыкі звязаныя з адметнасцямі расійскага рынку пабуджаюць да дапаунення існуючага мадэлю эканомікі механізмамі рынкавага самарэгулявання і рынкавай камунікацыі. Пад увагу ўзята тэхніка-тэхналагічная мадэрнізацыя вытворчасцяў.

Найбольш актыўна філасофія і эканамічныя навукі ўзаемадзейнічаюць пры разглядзе праблем менеджмэнту, маркетынгу, лагістыкі, лічбавай эканомікі, мадэрнізацыі, інавацыйнай дзейнасці, эканамічнай бяспекі (Г. Броўка, У.Валадзько, А. Лойка, С. Сала-

доўнікау, В. Старжынскі). Канвергенцыі філасофска-эканамічнай тэматыкі спрыяла тэма еўразійскай інтэграцыі. У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце кафедра філасофскіх вучэнняў стала каардынатарам штогадовых міжнародных навуковых канферэнцыяў з удзелам эканамістаў Арменіі, Беларусі, Казахстана, Расіі, Узбекістана.

Сярод эканамістау Беларусі атрымала прызнанне канцэпцыя наасферагенезу, якая ўключае канцэпт зяленай эканомікі. Каэвалюцыя прыродных і сацыяльна-эканамічных структурау разглядаецца на выснове канвергенцыі дасягненняў біялагічных і інжынерных навук. Галіновая інжынерна-эканамічная навука асвоіла тэхналогіі разумнага дому, цеплавой мадэрнізацыі, аўтаматызацыі, электронных разлікаў, электроннага дэкларавання. Банкаускі сектар значную частку грашовых аперацыяу перавеў у форму электронных залікаў. Гэтымі тэхналогіямі актыўна карыстаецца гандаль, сфера турызму.

Філосафы і эканамісты актыўна абмяркоўваюць праблемы стратэгічнага макраэканамічнага менеджменту ў свеце перспектыў чацвертай прамысловай рэвалюцыі (А. Лойка). Пад увагу бяруцца тэндэнцыі канвергенцыі класічных і інфармацыйных тэхналогіяу у формы робататэхнікі і тое як гэтыя распрацоўкі адаб'юцца на рынку працы, мадэрнізацыі лагістыкі, сферы гандлю і паслуг, прамысловасці. Пад увагу бярэцца растучая роля ў сусветнай эканоміцы тэхналагічных платформаў, аддытыўных тэхналогіяў, канвергенцыя масмедыйных і эканамічных структураў у прасторы Інтэрнэту.

На ўзроуні макраэканамічных даследаванняу актуальнасць набыла тэма трансфармацыі глабалізацыі ў глакалізацыю. Пад увагу бярэцца растучая роля ва ўзаемаадносінах суб'ектаў эканамічнай дзейнасці пратэкцыянізму. Маркетынгавыя стратэгіі рэкламы прыцягнулі ўвагу да адпаведнасці таварных знакаў зместу, што яны прадстаўляюць. Нейрамаркетынг актуалізаваў даследаванні ў галіне канвергенцыі тэхнік візуалізацыі, штучнага інтэлекту, адваротнай сувязі, кагнітыунай псіхалогіі і кагнітыунай лінгвістыкі. Дыгіталізацыя стала трэндам офіснай дзейнасці, эрганомікі.

Тэхалогіі віртуальнай рэчаіснасці сталі адным з вядучых сегментау развіцця эканомікі, што бачна на прыкладзе эфектыунай дзейнасці Парку высокіх тэхналогіяу. Відавочна трансфармацыя структуры патрэб сучаснага чалавека. Ен траціць большую частку сродкаў не на мінімальныя фізіялагічныя патрэбы на ежу, піцце, адзенне, а на Інтэрнэт паслугі, кампутаравыя гульні, падарожжы і

аддпачынак, транспартныя сродкі, адпачынак за горадам, тэлефонныя размовы. Прыярытэты ў арганізацыі вольнага часу сталі дамінаваць над першаснымі патрэбамі. Відавочны значныя ўзроставыя адрозненні ў прыярытэтах пакупніцкіх патрэбаў і каштоўнасцей.

Парадыгма індустрыяльнай эканомікі ўступіла месца парадыгме інфармацыйнага грамадства і эканамічнай дзейнасці ў новых умовах. Перамяшчэнне эканамічных функцый грамадства ў Інтэрнэт-прастору абвастрыла праблему кантролю дзяржавы над ценявой эканомікай, прадстаўленай пагрозамі наркатрафіку, тэрарызму, ухілення ад падаткаў, карупцыяй. У гэтых умовах расце актуальнасць празрыстасці эканомікі, адказнасці карпаратыўных структурау за дастаўернасць інфармацыі.

### *3.3. Філасофія кіравання і эканамічны дыскурс менеджменту, маркетынгу, лагістыкі*

Адміністратыунае кіраванне ва ўмовах рынкавай эканомікі спалучаецца з менеджментам, маркетынгам, лагістыкай, карпаратыунай і прадпрымальніцкай культурай. Для эканамістаў практычных прафесіяў гэта важныя пытанні, паколькі ад іх залежыць паспяховая дзейнасць прадпрыемстваў, кампаніяў.

Пры аналізе мовы практычнага эканамічнага дыскурсу сустракаюцца канцэпты, у якіх прысутнічае слова «філасофія». Гэта «філасофія менеджменту», «філасофія маркетынгу», «філасофія бізнесу», «філасофія кіравання персаналам», «філасофія прадпрымальніцкай дзейнасці», «філасофія карпаратыўнага кіравання».

Менеджмент адлюстроўвае прысутнасць у эканоміцы спецыялістаў, здольных да кіруючай дзейнасці. Якасць іх працы вымяраецца паказчыкамі рэнтабельнасці, прыбытку, развіцця прадпрыемства, кампаніі. Неабходную інфармацыю даюць штоквартальныя дадзеныя. Менеджэр валодае пэўнымі дзелавымі, псіхалагічнымі якасцямі лідэра. Гэта дазваляе яму кіраваць прадпрыемствам, кампаніяй ва ўмовах пастаянных рызык, змены кан юнктуры рынку. У такіх умовах яму неабходна аналітычнае мысленне, бачанне стратэгіі і тактыкі развіцця прадпрыемства, кампаніі. Гэтае бачанне важна сфармуляваць у выглядзе місіі кампаніі. Філасофія бізнесу з’яўляецца крыніцай ключавых фармулевак. Так лічыць К. Мацусіта. Філасофія бізнесу бярэ прынцыпы з філасофіі

прыроды. Гэта прынцыпы жыццевага цыклу і развіцця. Усе бясконца рухаецца і змяняецца. Гэта азначае разуменне сацыяльнай дыялектыкі і ўменне працаваць ва ўмовах пераменаў і адказнасці ў гэтых умовах за арганізацыю, якая дае працу людзям.

Філасофія бізнесу ўказвае на вартасць камунікацыі, а таксама на адметнасці гэтай камунікацыі ў форме сістэмы каштоўнасцей, этыкі. У філасофіі прагматызму сфармуляваны асноўныя ўмовы поспеху ў бізнэсе. Яны звязаны з выгадай, верай у поспех. Заснавальнік інстытуцыяналізму Т. Вэблен адзначаў, што поспех ў бізнэсе залежыць не толькі ад прадпрымальніка, але і фактараў кумулятыунай дзейнасці. У іх ліку руціна, гістэрэзіс, блакіроўка. Ен указаў на прамую сувязь прафесійнай кампетэнцыі з тэхнічнай адукацыяй. Мэнэджэрамі павінны быць людзі з інжынернай адукацыяй. Гэта паказала практыка на прыкладзе арганізацыі вытворчасці Г. Фордам. У мэтах павышэння прадукцыйнасці працы на прадпрыемстве той сканструяваў канвеер, што дазволіла павысіць аплату працы і стварыць унутраны рынак для рэалізацыі аўтамабіляў. Увага да пытанняў вытворчасці прывяла да неабходнасці распрацоукі тэорыі чалавечых зносінаў у тэхналагічных працэсах. Адным з элементаў гэтай стратэгіі стала філасофія кіравання персаналам. Яна ўлічвае культуралагічную кампаненту звязаную з адметнасцямі амерыканскай, еўрапейскай, японскай сістэм менеджменту вытворчых працэсаў, якасці тавару, чалавечых зносінаў.

Вялікая дэпрэсія актуалізавала парадыгму маркетынгу. Вытворцы сталі ўключаць эканамічную дзейнасць у кантэкст канструктыунай працы з пакупніком. Спачатку маркетынг зводзіўся да спецыяльных аддзелаў рэкламы, вывучэння попыту, кантактам з пастаўшчыкамі і гандлевымі сеткамі. У задачы маркетынгавых структураў уваходзіла атрыманне выгадных прынцыпы этыкі ўзаемадзеяння з пакупнікамі і дзелавымі партнерамі (Д. Карнэгі).

Паступова маркетынгавая дзейнасць набыла не толькі практычную кампаненту, але і філасофскую. Прадметам разгляду стала роля эканомікі ў фарміраванні сучаснага вобразу грамадства. Было ўстаноўлена, што тавары выконваюць функцыю вобразу жыцця. Яны маюць сацыяльны статус брэнду, таварнай маркі, трэнду жыцця. Была сфармулявана канцэпцыя грамадства ўсеагульнага карыстання і ўстаноўлена прамая сувязь паміж пакупніцкай актыўнасцю насельніцтва і емкасцю ўнутранага рынку продажаў. Рэклама стала выкарыстоўваць сацыяльны змест эканамічнай інфармацыі. Некато-

рыя тавары сталі сімвалам сучаснага вобразу жыцця, свабоды, дэмакратыі.

Пакупнікоу сталі разглядаць у катэгорыях сацяльнай камунікацыі, дыялогу. Распрацаваны сацяльныя тэхналогіі сувязі з грамадскасцю з мэтай стварэння пастаянных групаў пакупнікоў. Прапаноуваюцца розныя формы падтрымання інтарэсу пакупнікоў да гандлевых цэнтраў і гандлевых інтэрнэт сетак. Гэта скідкі, розыгрышы прызоў, дастаўка на дом, сацыяльныя акцыі ў падтрымку культуры. Рэклама стала фарміраваць вобраз жыцця цераз актыўную штодзенную інфармацыю пра новыя тавары, новыя мадыфікацыі існуючых тавараў.

Маркетынг патрабуе вывучэння рынку попыту ва ўмовах растучай канкурэнцыі вытворцаў. У сувязі з гэтым расце роля тэхналагічных платформаў, дзе падтрымліваюцца ўстойлівыя сувязі вытворцаў і дзяржаўных структураў, ад якіх залежыць магчымасць працы на ўнутраных рынках з магчымасцю размяшчэння вытворчасцяў у непасрэднай блізкасці ад пакупнікоў. Гарантыямі працы на рынку з’яўляюцца міждзяржаўныя дамовы ў форме эканамічных саюзаў. Такой формай маркетынгу актыўна карыстаюцца беларускія вытворцы пры ўдзеле дзяржаўных структураў. Гэта дазваляе мець доступ на рынкі Расіі і еўразійскіх краінаў вытворцам высокаканкурэнтнай прадукцыі на спрыяльных для іх умовах. У дадзеным выпадку важную ролю адыгрываюць фактары гістарычнай памяці, агульнай рэгіянальнай культуры. Банкаўскія структуры падтрымліваюць экспарт тавараў, укладваюць інвестыцыі ў таваправодзячую сетку.

Узнік механізм цеснай сувязі маркетынгу з лагістыкай. Тэрмін «лагістыка» выкарыстоўваецца ў філасофіі ў сэнсе алгарытму, рацыянальнай дзейнасці. Практыкі лагістычнай дзейнасці існавалі тысячы гадоў як усферы мыслення людзей, так і практычнай сферы ваенных паставак, гандлю. На выснове сучаснай тэорыі лагістыкі створана сетка лагістычных кампаніяў, якая займаецца дастаўкай тавараў пакупнікам. КНР ініцыявала транскантынентальны лагістычны праект «Адзін пояс – адзін шлях». У межах гэтага падыходу ствараецца сетка індустрыяльных паркаў, плануецца мадэрнізацыя транспартных магістраляў. Тэрыторыя Беларусі ўваходзіць у эканамічную прастору падобных праектаў, што дазваляе разлічваць не толькі на рынкі еўразійскіх краінау, але і Еўрапейскага Саюзу.

Філасофія карпаратыўных структураў указвае на тое, што арганізацыя (прадпрыемства, кампанія) павінны мець стратэгію доўгатэрміновага функцыянавання ва ўмовах пастаянных пераменаў і за кошт пераменаў. Звычайна гэтую тэматыку звязваюць са стратэгічным менеджментам, які бярэ пад увагу макраэканамічныя і мікраэканамічныя фактары пераменаў з улікам попыту, эканамічнага цыклу, суадносіны мадэрнізацыі і інавацыйнай дзейнасці, аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў. Рост эфектыўнасці вытворчасці, прадукцыйнасці працы суправаджаецца аптымізацыяй існуючых структураў.

Філасофія прадпрымальніцкай дзейнасці дае адказ на пытанне аб тым, як эфектыўна выкарыстоўваць чалавечы капітал. Крыніцай занятасці становяцца невялікія спецыялізаваныя кампаніі, якія сфарміравалі рынак кансалтынгу, інжынірынгу, сферы паслуг.

Прадпрымальніцкая дзейнасць звязана з рызыкамі, якія адносяцца да сферау інтэлектуальнай уласнасці і барацьбы з карупцыяй. Філасофія права з'яўляецца важным элементам эканамічнай дзейнасці. Няведанне законаў ад адказнасці не вызваляе. Прадпрымальнікам прыходзіцца мець дзелавыя кантакты не толькі з чыноўнікамі, падаткавай інспекцыяй, аўдытам, банкаускім кантролем, але і следчымі структурамі, калі іх дзейнасць вызначаецца рысамі ценявой эканомікі. Каб пачынаючыя прадпрымальнікі маглі разабрацца ў асаблівасцях эканамічнай дзейнасці створана сістэма падтрымкі гэтага сацыяльнага інстытуту сучаснага грамадства. Дапамогу аказваюць міжнародныя банкі ў выглядзе спецыяльных праграмаў, нацыянальная дзяржава цераз сістэму бізнес-інкубатараў, падаткавых ільготаў, дзяржаўных заказаў.

Пад уплывам тэарэтычных даследаванняў у сінергетыцы ў эканоміцы важную ролю сталі надаваць фактарам страхавання рызыкі, верагоднасці, нелінейнасці, волацільнасці, дыверсіфікацыі, бізнес-планавання. Актуальнай стала кейнсіянская метадалогія падтрымкі вытворцаў пад час крызісаў, паколькі стабільнасць вытворчых структураў уплывае на занятасць. Падтрымка ажыццяўляецца цераз зніжэнне працэнтнай стаўкі рэфінансавання, крэдыты, дзяржаўныя заказы, электроннае дэкларaванне тавараў.

Філасофія карпаратыўных структураў указвае на фактар пераменаў, які ствараюць прамысловыя рэвалюцыі. Чацвертая прамысловая рэвалюцыя звязана з феноменам лічбавай эканомікі. У яе структуры важную ролю адыгрываюць кампутаравыя праграмы, якія за-

бяспечваюць аперацыі банкаўскімі карткамі, павышаюць мабільнасць прыняцця рашэнняў, транскцыйнай дзейнасці і яе кантролю. Фінансавы сектар выпрацаваў крыптавалюту. Паміж кампутаравай праграмай і прамысловым прынтарам узнікла прамая сувязь. Актуальнымі сталі электронны ўрад і электронны подпіс.

Назіраецца канвергенцыя тэхналагічнага дэтэрмінізму, менеджменту, маркетынгу, лагістыкі. Грамадства ўсеагульнага карыстання патрабуе гарантыяў занятасці для падтрымання пакупніцкай здольнасці насельніцтва. Гэты акцэнт трансфармаваў эканамічнае разуменне глабалізацыі. Прыклад далі ЗША. Яны дзеля захавання вытворчасцяў на тэрыторыі краіны актыўна карыстаюцца метадалогіяй пратэкцыянізму. Пасля распаду СССР Рэспубліка Беларусь прыклала ўсе намаганні каб захаваць прамысловы і аграрны сектар краіны, які гарантуе занятасць, магчымасці экспарту, прамысловую і харчовую бяспеку краіны ва ўмовах растучых геапалітычных рызыкаў.

Падтрымка дзяржавай мадэрнізацыі вытворчасцяў паступова пераводзіцца ў катэгорыі прамых інвестыцыяў, што бачна на курсе нацыянальнай валюты. Змяншаецца рызыка даўгавой залежнасці. Трансфармацыя эканамічнай структуры прывязана да маркетынгавай і лагістычнай парадыгмы стабільных гандлевых партнераў, якімі з яуляюцца Расійская Федэрацыя, Еўрапейскі Саюз, КНР.

Пастаяннае карыстанне таварам аднаго і таго ж вытворцы стварае гарантыю бяспекі ва ўмовах растучай ролі сімулякраў. На гэта звярнуў увагу Ж. Бадрыйяр. Сярод айчынных аўтараў гэтыя пытанні на ўзроўні сімвалічнай функцыі мовы сталі прадметам разгляду С. Саладоўнікава. Беларускія вытворцы актыуна займаюцца брэндзінгам тавараў, паколькі яны з’яўляюцца крыніцай інфармацыі аб нацыянальнай эканоміцы, нацыянальнай культуры, чалавечым капітале. Гэтую задачу выконваюць таваpaправодзячыя сеткі, цэнтры сэрвіснага абслугоўвання. Прыклад эфектыўнасці гэтай працы дэманструе рэгіянальная стратэгія прысутнасці беларускіх тавараў і вытворцаў у губерніях і рэспубліках Расійскай Федэрацыі.

Эканоміка і кіраванне прадпрыемствам, кампаніяй заснавана на філасофіі арганізацыі. Гэтая філасофія ўключае сукупнасць унутрыарганізацыйных прынцыпаў, маральных і адміністратыўных нормаў і правілаў узаемаадносінаў персаналу, сістэму каштоўнасцей і перакананняў, успрымаемую ўсім персаналам і падначаленую

глабальнай мэце арганізацыі. Парушэнне філасофскіх прынцыпаў арганізацыі стварае канфліктныя сітуацыі паміж адміністрацыяй і працаўнікамі, вядзе да страты эфектыунасці араганізацыі.

Філасофія арганізацыі афармляецца нарматыўным дакументам, паколькі адносіны паміж персаналам строга рэгулююцца. Філасофія кіравання персаналам арганізацыі заключаецца не толькі ў тым, каб задаволіць патрэбы арганізацыі ў спецыялістах, але і ў найбольш поўным задавальненні іх патрэбаў. Філасофія арганізацыі ствараецца на выснове Канстытуцыі, Грамадзянскага кодэксу, Працоўнага кодэксу, Дэкларацыі правоў чалавека, Калектыўнай дамовы, вопыту лепшых арганізацыяў. Улічваецца тып вытворчасці, форма ўласнасці, галіна народнай гаспадаркі, колькасць працуючых у арганізацыі, узровень іх дабрабыту, узровень культуры персаналу, асабістыя погляды кіраўніцтва.

Дакумент пад назвай «Філасофія арганізацыі» уключае мэты і задачы арганізацыі, дэкларацыю правоў работнікаў, патрабаванні да паводзінау працаўнікоў, дзелавыя і маральныя якасці, умовы працы і працоунае месца, сацяльныя гарантыі, сацыяльную падтрымку.

У філасофіі арганізацыі важную ролю адыгрывае абмеркаванне адносіны паміж доўгатэрміновымі і кароткатэрміновымі мэтамі. Фактычна абмяркоўваецца пытанне аб суадносінах прамых прыбыткаў ад таварных продажаў за кошт зніжак і прыбыткаў, фарміруемых знаходжаннем у трэндах зяленай эканомікі, энергазберагальных тэхналогіяў, экалагічнай прадукцыі.

### *3.4. Філасофія і камунікатыўная кампанента грамадства*

Грамадства і дзяржава існуюць дзякуючы камунікацыям. Адны з гэтых камунікацыяў ствараюць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы шляхам будауніцтва дарог, чыгунак, мастоў, судаходства, паветранай інфраструктуры аэрапортаў. Людзі атрымліваюць магчымасць перамяшчацца ў межах краіны, горада, што спрыяе іх працоўнай мабільнасці, занятасці, сямейным сувязям. У структуры транспартных камунікацый інтэгравана лагістыка. Беларусь валодае багатым вопытам гандлевых шляхоў, што дазваляе ей актыуна ўдзельнічаць у сучасных транскантынентальных праектах. Адным з такіх праектаў стаў «Адзін пояс – Адзін шлях». У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце падрыхтоўка спецыялістаў па накірункам транспартных камунікацый вядзецца на аутатрактарным факультэце і факультэце транспартных камунікацыяў.

Асобую катэгорыю камунікацыяў складаюць камунальныя камунікацыі. Яны выконваюць задачы водападачы і водаадвядзення, ацяплення, абслугоўвання і мадэрнізацыі камунікацый спальных, адміністрацыйных, прамысловых раенаў. З камунальнымі камунікацыямі звязаны энергетычныя камунікацыі, якія забяспечваюць асвятленне памяшканняу і вуліц, падагрэу вады у ацяпляльны перыяд, электрычную зарадку і працу розных тэхнічных прыстасаванняў. Сюды ўваходзяць электрафікаваныя ўчасткі чыгунак, метро, электрамабілі, бытавыя прыстасаванні, кампутары, ноўтбукі, мабільныя тэлефоны.

У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце падрыхтоўка спецыялістаў па накірункам энергетыкі вядзецца на факультэце энергетычнага будаўніцтва і энергетычным факультэце. Аб'емы карыстання электрычнай энергіяй растуць, што зрабіла актуальнай тэматыку эфектыўнага выкарыстання альтэрнатыуных крыніц энергіі. Ею займаецца ў структуры БНТУ кафедра ЮНЭСКА. Важную ролю ў сістэме прамысловых камунікацыяў адыгрываюць нафтапроводы, газапроводы, водапроводы. Па тэрыторыі Беларусі праходзяць транзітныя энергетычныя камунікацыі. Частка нафты паступае з Расійскай Федэрацыі на нафтаперапрацоўчыя комплексы ў Новаполацку і Мазыры. Прыродны газ з Расійскай Федэрацыі забяспечвае працу электрычных цеплавых станцый на тэрыторыі Беларусі. Беларуская АЭС трансфармуе энергетычную стратэгію Беларусі па пазіцыі энергетычнай забяспечанасці.

Асаблівую ролю ў грамадстве адыгрывае фактар інфармацыі, паколькі дзякуючы яму людзі могуць прымаць рашэнні, валодаць сітуацыяй, задавальняць патрэбу ў міжасабовай камунікацыі, фарміраваць светапогляд, будаваць дзелавыя адносіны. Адной з першых інфармацыйных тэхналогій у людзей стала вярбальная камунікацыя. Яна была дапоўнена пісьмовай часткай у выглядзе тэкстаў. Для гэтага былі распрацаваны пісьмовыя сімвалічныя, графічныя, лічбавыя мовы. У межах тэксту адбылася іх канвергенцыя. Тэксты першапачаткова пісаліся на гліняных дашчэчках, а таксама чарніламі на берасце, пергаманце, паперы.

Беларусь унесла значны ўклад у фарміраванне тэхналогій інфармацыйнай прасторы. Гэты ўклад быў яскравым у перыяд Адраджэння і звязаны з кнігадрукаваннем. Ф. Скарына стаяў у вытокаў айчыннай традыцыі інфармацыйнай прасторы. Друкарскай справай

займаліся С. Будны, М. Федараў, П. Мсціславец, С. Собаль. Кнігадрукаванне атрымала масавае распаўсюджанне на тэрыторыі Беларусі. Тэксты друкаваліся на беларускай, лацінскай, польскай мовах. Друкарскай справе спрыялі патрэбы адукацыі, мастацкай культуры, тэалогіі.

Важную ролю фактар адзінай нацыянальнай інфармацыйнай прасторы адыграў у перыяд другога беларускага Адраджэння, калі беларусамоўныя часопісы і газеты наладзілі дыялог з насельніцтвам. Пачынальнікам гэтай працы стаў К. Каліноўскі і газета «Мужыцкая праўда». Пасля базавая роля ў функцыянаванні інфармацыйнай прасторы беларускай нацыянальнай культуры перайшла да «Нашай нівы».

Пасля таго, як Беларусь набыла дзяржаўны статус у выглядзе БССР была зфарміравана сістэма дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Яна ўключала газеты, часопісы, радые. З 1922 году на тэрыторыі БССР асноўную ролю адыгрывалі федэратыўныя сродкі масавай інфармацыі, якія забяспечвалі функцыянаванне адзінай інфармацыйнай прасторы пятнаццаці саюзных рэспублік. У гэтай прасторы ўсе большую ролю сталі адыгрываць візуальныя тэхналогіі агітацыйнага плакату, фатаграфіі, кінаіндустрыі, тэлебачання.

Пасля распаду СССР ва ўмовах незалежнай Рэспублікі Беларусь сродкі масавай інфармацыі трансфармаваліся ў сегмент эканамічнай дзейнасці пад назвай медыяіндустрыі. Гэта абумоўлена канвергенцыяй камунікатыуных тэхналогіяў у прасторы Інтэрнэту. Медыяхолдынгі спалучаюць функцыю дзяржауных сродкау інфармацыі з функцыяй камерцыйных паслуг на рынку рэкламы, сувязей з грамадскасцю. Выпрацоуваецца комплексны мадэль трансфармацыі традыцыйных сродкау масавай інфармацыі ў аператыуныя структуры прадастаўлення якаснай інфармацыі з улікам палітычных, эканамічных інтарэсаў Беларусі, ментальнасці насельніцтва, камерцыйных электронных паслуг, інтэрактыуных тэхналогіяў дыялогу ва ўмовах глабалізацыі.

Палітычныя рашэнні ў накірунку еўразійскай інтэграцыі стварылі праблематыку адзінай рэгіянальнай інфармацыйнай прасторы. Яна стала прадметам разгляду ў працах С. Венідзіктава. Метадалогія інфармацыйных войнаў, атрымаўшая распаўсюджанне ў дзейнасці дзяржаў з глабальнымі амбіцыямі, акцэнтвала ўвагу беларускіх філосафау на пытаннях інфармацыйнай бяспекі грамадства

і дзяржавы. Прадметам даследаванняў С. Масленчанкі сталі сацыяльныя групы ў форме субкультур. Яны прэтэндуюць на дамінантны ўплыу на пэўныя групы насельніцтва цераз сеткавыя структуры і адпаведную інфармацыю. Дзейнасць падобных структураў падлягае дзейнасці прававой парадыгмы нацыянальнай бяспекі. Асабліва важна разумець прыярытэт гэтай парадыгмы ва ўмовах глабальнай праблемы тэрарызму, наркатрафіку, гандлю людзьмі. Усяго таго, што называецца ценявой эканомікай.

Прадметам даследаванняу стала праблема суб'ектыунасці ў глабальнай інфармацыйнай прасторы, абумоуленая барацьбой палітычных інтарэсаў сродкамі фэйк-тэхналогій. Распрацоўшчыкі аддаюцю перавагу не аб'ектыунасці інфармацыі, а палітычнаму і эканамічнаму кароткатэрміноваму заказу. Яны канструіруюць прадукты, якія не маюць на мэце інфармаваць, а пераследуюць мэты фарміравання грамадскай падтрымкі палітычным акцыям канфліктнай накіраванасці. Беларуская палітычная парадыгма бачання міжнародных адносінаў выключае такія падыходы. У гэтых умовах расце роля даследаванняу медыяпрасторы Беларусі, звязаных з тэмамі кагнітывістыкі, ментальнасці, талерантнасці, суадносіны права і этыкі, філасофіі чалавека і філасофіі тэхнікі ( А.Лойка, А. Якімовіч, Я. Яскевіч).

Побач з праблемамі камерцыйнай рэкламы абмяркоуваюцца праблемы сацыяльнай рэкламы. Пад увагу бярэцца накірунак сацыяльнаарыентаванай функцыі сучаснай дзяржавы, які патрабуе грамадскай падтрымкі ў выглядзе дабрачынных акцыяў, грашовых ахвяраванняў на рэалізацыю гуманітарных, духоўных праектаў па выратаванню жыцця цяжка хворых дзяцей, дагляду за бездапаможнымі адзінокімі людзьмі. Масмедыйнае інфармацыйнае забеспячэнне такіх акцыяў адыгрывае не толькі прыкладную ролю дапамогі, але і кансалідуючую ролю. У выніку фарміруюцца канкрэтныя выявы філасофіі гуманізму.

Парадыгма крэатыунай індустрыі стварыла механізм канвергенцыі сістэмы інавацыйнай дзейнасці і беларускіх сродкаў масавай інфармацыі. Роля апошніх заключаецца ў забеспячэнні функцыянавання тэхналагічных платформаў. Адным з накірункаў сталі стартапы. Распрацаваны прыкладныя сацыяльныя тэхналогіі інфармацыйнай падтрымкі пачынаючых шлях у крэатыўную індустрыю вучоных, распрацоўшчыкау. Адной з тэхналогіяў стаў краўдфандынг. Выкарыстоўваюцца спецыялізаваныя сайты-

пляцоўкі ў сетцы Інтэрнэту. За выснову бярэцца сацыяльна-вартасная інтэрнэт-благачыннасць у межах сацыяльнага праекту – дапамога састарэлым людзям, арганізацыя суботнікаў, прыцыгванне сродкаў спачуваючых людзей. У ліку праектаў аказваюцца інавацыйныя праекты, якія становяцца вядомымі шырокай аўдыторыі. Той, хто ахвяруе сродкі на праект сам вызначае іх памер і адначасова фарміруе попыт на інавацыйны прадукт. Рэклама стартапа прадугледжвае выкарыстанне візуальных тэхалогіяў. Філасофскія і метадалагічныя аспекты візуальных тэхналогіяў сталі прадметам даследаванняў у працах А. Лойкі, А. Якімовіч.

Камунікацыя стала важнай часткай карпаратыўных структураў. У сувязі з гэтым набылі вартасць этыка дзелавых зносінаў, этыка праграмовай інжынерыі, сінергія, сацыяльная псіхалогія партыкулярных структураў (А. Лойка). Карыстальнікі інфармацыі сталі яе крыніцай аб чым сведчаць электронныя энцыклапедыі, Інстаграмм (фотаздымак і аўтарскі тэкст). Захоўвае актуальнасць праблема канфідэнцыяльнасці, маніпулявання інфармацыяй. Тэхніка-тэхналагічны ўзровень інфармацыйных тэхналогіяў у Беларусі вызначаюць дасягненні рэзідэнтау кампаніяў Парку высокіх тэхналогіяў.

### *3.5. Філасофія ў функцыі метадалагічнага забеспячэння інжынернай дзейнасці*

Беларускія інжынеры, як і нямецкія і амерыканскія іх калегі праяўляюць пастаянную цікавасць да філасофскіх абагульненняу па тэматыцы тэхнікі, праектнай, канструктарскай дзейнасці, ролі тэхнікі ў грамадстве. Паколькі інжынеры з’яўляюцца прыхільнікамі навукова-тэхнічнага прагрэсу, то яны рэдка крытыкуюць сваю дзейнасць з пазіцый экалогіі, гуманітарных наступстваў.

Прафесійныя філосафы, наадварот больш увагі ўдзяляюць аналізу негатыўных наступствау навукова-тэхнічнага прагрэсу ў адносінах да грамадства і асобы. Аднак есць такія сярод іх, якія з’яўляюцца прыхільнікамі тэхналагічнага прагрэсу. Яны абгрунтавалі неабходнасць вядучай ролі інжынераў у сучасным грамадстве. Канцэпцыя называецца тэхнакраттызм. Яе распрацаваў на пачатку XX стагоддзя Т. Вэблен, прадстаўнік Чыкагскай эканамічнай школы (ЗША). Рынкавая эканоміка не ўспрыняла канцэпцыю, таму інжынерам прыходзіцца даказваць свае арганізацыйныя здольнасці ў якасці менеджэраў сучасных кампаніяў, у структурах міністэрства

прамысловасці, энергетыкі, камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва, а таксама ў праектных арганізацыях, канструктарскіх бюро, у цэхах прадпрыемстваў, кар'ерах і шахтах. Тэхнакраты-міністры адыгрываюць важную ролю ў забеспячэнні бесперапыннай дзейнасці розных галін гаспадаркі.

Адным з першых мадэль інжынера-сістэматэхніка распрацавау і асвоіў на Беларусі Ф. Скарына. Ен займаўся тыпаграфскай справай. Яму прыйшлося сканструяваць друкарскі станок, асвоіць тэхналогію друкавання, стаць менеджэрам, паколькі друкарская справа патрабавала немалых сродкау. Ен займаўся маркетынгам і лагістыкай, паколькі ўкладзеныя ў выданні сродкі трэба было акупаць. З асэнсаваннем уласнай прафесійнай вартасці да яго прыйшло жаданне выпрацаваць аўтарскі стыль гравюр, літаграфіі, кніжных выданняў.

К. Семяновіч меў даследчыя інжынерныя інтарэсы ў балістыцы, піратэхніцы, ракетабудаванні. Абапірауся на класічную механіку Г. Галілея, Р. Дэкарта. У філасофіі такі падыход называецца механіцызмам. Як вядома балістыка адыгрывае важную ролю ў артылерыі пры разліку каардынат, траекторыі і дакладнасці паражэння аб'ектаў ваеннай інфраструктуры і камунікацыяў. Піратэхніка забяспечвае спалучэнне выбуховых эфектаў з іх эстэтычнай функцыяй пад час карнавалаў, святаў, салютаў. Ракетабудаванне арынтавана на распрацоўку носьбітаў а бектаў, з мэтай іх дастаукі на запланаваныя арбіты, траекторыі, пляцоўкі.

Сістэма вышэйшай інжынернай адукацыі ўзнікла ў XVIII стагоддзі ў Францыі. Адным з першых ею скарыстаў Т. Касцюшка. Ен адначасова прайшоў адукацыю ў Парыжы ў вышэйшай політэхнічнай школе і Акадэміі мастацтваў па накірункам будаўніцтва ваенных умацаванняў, дарог, шлюзаў. Талент інжынера-сістэматэхніка ен рэалізаваў у ЗША пад час вайны. Па яго праекту была пабудавана сістэма ваеннай інфраструктуры, адным з элементау якой стала ваенная акадэмія ў Уэст-Пойнце. На радзіме Т. Касцюшка не змог рэалізавацца як інжынер з-за палітычных абставінаў. Ен узначальваў паўстанцкае войска, якое прайграла А. Сувораву. Жыцце ен вымушаны быў правесці за мяжой.

У XIX стагоддзі моладзь з Беларусі стала атрымліваць інжынерную адукацыю ў сталіцы Расійскай імперыі. Попыт на інжынераў быў абумоўлены будаўніцтвам чыгунак, фабрыкаў, заводаў, развіццем гарадской гаспадаркі. Адным з першых інжынераў Беларусі,

што звярнуўся да філасофскай творчасці, стаў А. Паўлоўскі. Ен працаваў у Віцебску інжынерам чыгуначнікам. Ен напісаў творы аб ролі тэхнікі ў сацыялізацыі жанчын, аб узаемаадносінах тэхнікі і рэлігіі.

У канцы XIX стагоддзя вызначылася трансфармацыя ў метадалогіі канструктурскай дзейнасці. Распрацоўкам сталі папярэднічаць навуковыя даследаванні, з якіх у якасці прыкладных рашэнняу вынікалі абгрунтаванні тэарэтычных пошукаў. На Беларусі падобны мадэль навукова-даследчай і вопытна-канструктарскай дзейнасці апрабіраваў Я. Наркевіч-Едка (1848-1905). Ен займаўся комплексам прыкладных праблемаў, звязаных з медыцынай, сельскай гаспадаркай, метэрыалогіяй. На ўзроўні навуковых даследаванняў яго цікавіла геафізіка і хімія атмасферных працэсаў. Дыгностыка захворванняў падштурхнула яго да неабходнасці візуалізацыі жывых арганізмаў. Ен стаў вынаходнікам электраграфіі. Праблемы сельскай гаспадаркі, звязаныя з навальніцамі і маланкамі падштурхнулі яго да распрацоўкі маланкаадводаў. Тэрытарыяльная аддаленасць камунікантаў падштурхнула яго да інжынернага рашэння ў форме бяздротавай перадачы электрамагнітных сігналаў. На жаль Я. Наркевіч-Едка ня быў мэнеджэрам. Яму хапіла вопыту і сродкаў толькі на адкрыцце ў сваім памесці станцый назірання і электраграфічнай, электрабіялагічнай, хімічнай лабараторый.

У першай палове XX стагоддзя тэрыторыя Беларусі аказалася ў эпіцэнтры сусветных войнаў, рэвалюцый, наступлення польскай арміі, нацысцкай нямецкай акупацыі, сталінскіх рэпрэсіяў. Таленавітыя даследчыкі-інжынеры пакідалі краіну. Адны гэта рабілі каб быць у цэнтрах асноуных рэвалюцыйных падзеяў. Гэта было характэрна для А. Багданава (1873-1928) і С. Яноўскай (1896-1966). Другія, як П. Сухі (1895-1975), Я. Зяльдовіч (1914-1987), Л. Чыжэўскі (1897-1964) іммкнуліся атрымаць адукацыю і працаваць у навуковых цэнтрах і канструктарскіх бюро Ленінграда і Масквы. Б. Кіт (1910-2018) накірункам адукацыі абраў Віленскі і Мюнхенскі ўніверсітэты. Як спецыяліст па ракетнаму паліву ен рэалізаваўся ў ЗША.

А. Багданаў праводзіў даследаванні блізкія тэматыцы сучаснай кібернэтыкі. Яго займала тэорыя самаарганізацыі сістэмаў на выснове інфармацыі. У сярэдзіне XX стагоддзя Н. Вінер апісаў кібернэтыку і на гэтай выснове хутка развіўся прыкладны накірунак

тэхнічнай кібернэтыкі. Адным з асноўных элементаў якой сталі кампутары і інфармацыйныя тэхналогіі.

С. Яноўская на выснове заняццяў філасофіяй матэматыкі прыйшла да высновы аб інжынернай важнасці матэматычнай логікі. Працуючы ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце яна спрыяла перакладу і выданню навуковых прац прадстаўнікоў аналітычнай філасофіі, распрацаваўшых парадыгму штучнага інтэлекту і сфармуляваўшых крытэрыі тэсціравання кампутаравай праграмы на статус штучнага інтэлекту. Яна спрыяла абароне ў МДУ дысертацый па тэхнічнай кібернэтыцы. Створаная ею кафедра матэматычнай логікі адыграла важную ролю ў станауленні савецкай школы тэхнічнай кібернэтыкі і дазволіла забяспечыць ваенна-прамысловыя распрацоўкі СССР інфармацыйнымі тэхналогіямі.

Л. Чыжэускі стаў распрацоушчыкам каэвалюцыйнай філасофіі гістарычных працэсаў. Асноунай адзінкай гэтай філасофіі з'яўляецца цыкл, які вызначаецца рэгулярнымі перыядамі электрамагнітнай актыўнасці на Сонцы. Ен роўны адзінаццаці гадам. Прырода дынамічных працэсаў на Сонцы вызначае адметнасці біялагічных і сацыяльных працэсаў на Зямлі. Асноўныя прынцыпы тэорыі былі сфармуляваны ў дакладзе ў 1915 годзе. У 1918 годзе была абаронена дысертацыя. Аднак падобная філасофія не магла існаваць паралельна з афіцыйнай філасофіяй марксізму-ленінізму. Таму навуковец рашыў яе аргументаваць навуковымі даследаваннямі і тэхнічнымі рашэннямі. У ходзе біялагічных даследаванняў ен знайшоў бактэрыі, якія рэагуюць на сонечную актыўнасць і могуць папярэджваць аб перыядзе высокай сонечнай актыўнасці ў выглядзе магнітных бураў у атмасферы Зямлі. Ужо як інжынер-канструктар Л. Чыжэўскі рашыў распрацаваць спецыяльны генератар адмоўных аэраіенаў для падтрымання і ўмацавання імуннай сістэмы людзей схільных да сардэчна-сасудзістых захворванняў, паколькі яны знаходзяцця пад час сонечных бураў у зоне высокай рызыкі. Прыбор (лямпа Чыжэўскага) быў створаны на выснове тэзісу аб тым, што адмоўна зараджаны кісларод аказвае аздараўленчае дзеянне на арганізм. Асабліва гэта важна для людзей, якія шмат часў праводзяць у закрытых памяшканнях і пад зямлей. Даследаванні і распрацоўкі Л. Чыжэўскага атрымалі высокае прызнанне з Новым Ерку ў 1939 годзе на сусветным форуме біяфізікаў. Аднак гэтае прызнанне не дапагло вучонаму пазбегнуць рэпрэсіяў.

П. Сухі стаў выдатным савецкім авіяканструктарам. Ен нарадзіўся ў Глыбокім. Доўгі час жыў і працаваў у Гомелі. Яго цікавіла ракетная аэрадынаміка звышхуткіх самалетаў. Яму ўдалося выпрацаваць алгарытм разлікаў, які дазволіў яму стварыць пяцьдзесят тыпаў ваенных самалетаў пад агульнай назвай СУ. Гэта знішчальнікі, штурмавікі. Самалеты серыі СУ забяспечвалі амаль палову ўсіх тыпаў самалетаў ваенна-паветраных сілаў СССР. Вялікую ролю яны адыгрываюць у сучасных ваенна-касмічных войсках Расійскай Федэрацыі.

Я. Зяльдовіч стаў адным з самых вядомых прадстаунікоў савецкай школы тэхнічнай фізікі і астрафізікі. Ен займаўся фізікай гарэння, выбуху, дэтанацыі. У 1939 годзе ажыццявіў разлік кінэтыкі ланцуговай рэакцыі дзялення ўрана ў водным растворы. Адзін са стваральнікаў атамнай (1949), вадароднай (1953) бомбаў.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны к шасцідзесятым гадам зфарміравалася існуючая да цяперашняга часу структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі Беларусі. Падрыхтоўка тэхнічных спецыялістаў, інжынерных кадраў для прадпрыемстваў, праектных арганізацыяў, канструктарскіх бюро, навуковае забеспячэнне канструктарскіх распрацовак стала адной з важных задач навучальных устаноў, такіх як Беларускі політэхнічны інстытут. На базе кафедраў узніклі навуковыя школы забеспячэння канструктарскай дзейнасці ў галіне транспарту. У даследаваннях удзельнічалі Ю. Атаманаў, В. Аутушка, .У. Байкоў, М. Богдан, М. Болбас, С. Бялоў, Э. Гайнуддзінаў, А. Грышкевіч, В. Гуськоў, Р. Івуць, М. Піліпук, В. Пахабаў, А. Рукцяшэль, А. Салагуб, А. Скойбеда, В. Цярэшка, У. Ярашэвіч.

Навукова-даследчае забеспячэнне машынабудаўнічай дзейнасці з улікам металургічнай вытворчасці ажыццявілі І. Бабук, Л. Багінскі, Я. Бельскі, Г. Бяляеў, А. Вавілаў, Л. Варашнін, У. Дзямідаў, А. Галушка, С. Гурын, Э. Дзячко, А. Дудзяк, Л. Ісаевіч, Г. Ждановіч, В. Кавалеўскі, А. Камароў, В. Камароў, М. Канэ, У. Калешка, А. Качаргін, Д. Кукуй, І. Купрыянаў, А. Лазаранкаў, Я. Ложачнікаў, Ж. Мрочак, А. Прысевак, А. Роман, М. Сачко, В. Сідарэнка, М. Сіткевіч, А. Слуцкі, М. Спірыдонаў, А. Сцепаненка,Р. Тофпянец, У. Трыбушэўскі, І. Трусава І. Філонаў, Я. Фельдштэйн, Дз. Худакормаў, У. Цімашпольскі, У. Яцкевіч.

Сістэмныя даследаванні ў вобласці механікі працэсаў трэння, зносу, зносастойкасці прывялі да фарміравання беларускай школы

трыбафатыкі. Асноўную ролю ў яе станаўленні адыгралі даследаванні і распрацоўкі Л. Сасноўскага. Ен пачаў з даследаванняў тэхнічных праблемаў трэння дэталяу і вузлоў. Для гэтага яму спатрэбіўся міждысцыплінарны падыход. Ен ажыццявіў канвергенцыю класічнай механікі з тэрмадынамікай. Вынікам даследаванняў стала новая рэдакцыя матэрыялаведання. Яна заснавана на практычным вопыце стварэння сталістага чыгуну з якасцямі, адпавядаючымі эканамічнай мэтазгоднасці выкарыстання ў чыгуначным будаўніцтве.

Даследаванне працэсаў трэння, зносу, зносастойкасці ажыццяўляецца Л. Сасноўскім на выснове катэгарыяльных структураў дыялектыкі і кібернэтыкі. Філасофскі змест распрацаванай метадалогіі даследаванняў у тэхнічных навуках прааналізаваны А. Лойка.

Фарміраванне праблематыкі штучнага інтэлекту і інтэграцыя яе ў інжынерную дзейнасць стала вынікам дзейнасці А. Багданава (Маліноўскага) і С. Яноўскай. А. Багданаў распрацаваў метадалагічныя падыходы да распрацоўкі кібернэтыкі. Твор называецца «Тэкталогія». С. Яноўская займалася праблемамі матэматычнай логікі. Яна актыўна падтрымлівала пад час працы ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце кандыдацкія і доктарскія працы па кібернэтыцы. Дзякуючы ей у СССР на рускай мове былі выдадзены працы заснавальнікаў праблематыкі штучнага інтэлекту.

У шасцідзесятых гадах XX стагоддзя назіраўся рост інтарэсу да праблематыкі штучнага інтэлекту. У Беларусі гэтымі пытаннямі актыўна займаўся М. Жукаў. Прадметам яго даследаванняу стала інфармацыя, свядомасць, матэматыка, матэматычная логіка. А. Карлюк напісаў працу прысвечаную праблематыцы штучнага інтэлекту. М. Крукоўскі звязаў кібернэтыку, логіку, эстэтыку ў адзіную праблематыку даследавання кагніцыі.

М. Рожын ажыццявіў даследаванне эвалюцыі кагнітыўных канцэптуальных схемаў свядомасці чалавека на прыкладзе эвалюцыі англамоунай эпістэмалогіі. Ен паказаў выключную ролю філасофіі І. Канта ў фарміраванні семантычнага коду еўрапейскай культуры. В. Мартынаў гэты код актуалізаваў на метадалагічнай выснове сінтэзу лінгвістыкі і матэматычнай логікі. Ен распрацаваў універсальны семантычны код, які забяспечвае не толькі прадстаўленне ведаў, але і іх генерацыю на выснове дэдукцыі ў аксіяматычнай мадыфікацыі. Фарміруюцца алгарытмы, утрымліва-

ючыя семантычную класіфікацыю намінатыўных адзінак. Гэта дае магчымасць кампутаравай праграме прымаць рашэнні ў адпаведнасці з атрымліваемай ею інфармацыі. Выпрацавана метадалагогія ўніверсальнай тэорыі вылічання сэнсау. Тэорыя прадпісвае праграме кваліфікаваць глаголы – «акцыі», каб перадаць змены, эвалюцыю. За выснову бярэцца структура – суб'ект, акцыя, аб'ект.

Непасрэдна праблемамі інфарматыкі і кіравання вучоныя Беларусі займаліся ў інстытуце тэхнічнай кібернэтыкі АН БССР. Сярод спецыялістаў вылучыўся С. Абламейка. Прадметам яго навуковых інтарэсаў стала апрацоўка здымкаў. Пасля распаду СССР даследаванні ў галіне інфарматыкі сканцэнтраваліся ў аб'яднаным інстытуце праблем інфарматыкі НАН Беларусі. На ўзроўні двубаковай каапераціі навукоўцаў Беларусі і Расіі ў форме саюзнай праграмы СКІФ створаны і ўведзены ў эксплуатацыю звышкампутар. Працягам сумеснай праграмы стаў кластэр. Ен уключае ўзаемадзеянне з касмічнай галіной Беларусі. Гэтая галіна атрымала развіцце, дзякуючы актыунаму ўдзелу беларусаў у касмічных праграмах СССР, а цяпер і Расійскай Федэрацыі.

У атрадзе касманаўтаў Расіі есць ураджэнцы Беларусі. Касмічныя тэхналогіі інтэграваныя з дасягненнямі кібернэтыкі дазволілі Беларусі дасягнуць высокага ўзроўню і якасці аказання інфармацыйных паслуг. На арбіту Зямлі выведзены штучны спадарожнік. У выніку Беларусь стала карыстаццыа хутка растучым рынкам масс-медыйных паслуг на выснове заключэння камерцыйных кантрактаў з карыстальнікамі інфармацыі.

Рэалізуецца традыцыя беларускага касмізму, у інжынерных вытокаў якой стаяў К. Семяновіч. Распрацаваныя ім эскізы парахавых ракет дачакаліся ўвасаблення ў дзейнасці сучасных беларускіх інжынерау. Ваенна-прамысловы комплекс Беларусі ажыццявіў праект ракеты сярэдняга дзеяння пад назвай «Паланэз». У выніку каляземная касмічная прастора стала часткай адзінага інфармацыйна-тэхнічнага комплексу. Цэнтры кіравання знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі. Яны спалучаюць розныя задачы, што адлюстроўваюцца ў дзейнасці Парку высокіх тэхналогіяў і ў дзейнасці навучальных устаноў, акцэнтаваных на падрыхтоўцы спецыялістаў для сектару інфармацыйных паслуг. Гэта БДУ, БДУІ, БНТУ.

У адукацыйных установах склаліся навукова-педагагічныя калектывы кафедрау інфарматыкі. На вядучую ролю выйшаў Беларускі дзяржауны ўніверсітэт інфарматыкі, які сумесна з Паркам вы-

сокіх тэхналогіяу пры актыўным удзеле рэзідэнтаў парку стварыў лабараторную кампутаравую базу падрыхтоўкі спецыялістаў для эканомікі інфармацыйных паслуг. Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт спецыялізуецца на прыкладных аспектах канвергенцыі інфармыйных тэхналогіяў з дзеючымі тэхналагічнымі працэсамі ў прамысловасці, а таксама на аўтаматызацыі энергетычнага, транспартнага, камунальнага, лагістычнага комплексаў. Тэхнічныя накірункі прадстауляюць В. Кавалеўскі (аптымальнае кіраванне ў тэхнічных сістэмах, матэматычнае мадэляванне задач кіравання), А. Прыгожы (матэматычнае і праграмнае забеспячэнне ЭВМ, комплексаў, сістэм, сетак, аўтаматызаванага праектавання і штучнага інтэлекту), Р. Фурунжыеў (лічбавае кіраванне), В. Цвяткоў (камп ютэрызацыя інжынернага праектавання).

Дыгіталізацыя набыла шырокі спектр укаранення. Не стаў выключэннем гандаль, банкаўскі і медыйны сектар. На механізмы электроннага дэкларавання перайшло міністэрства падаткаў і мытныя структуры. Электронным стаў дакументазварот.

Перспектывы інфарматызацыі грамадства разглядаюцца на філасофскім узроўні з улікам трансгуманізму. Прагназуецца пераход эвалюцыі чалавека на гібрыдную аснову з усе больш растучай роляй кампутаравых праграмаў і робатаў. Гэты пераход звязваецца з чацвертай прамысловай рэвалюцыяй. Яна прыйшла на змену трэцяй прамысловай рэвалюцыі, даушай пачатак інфарматызацыі грамадства, эканомікі, навуковай, канструктарскай дзейнасці. Яе пачатак у саракавых гадах XX стагоддзя распрацоўкай кібернэтыкі абвясціў Н. Вінер.

Чацвертая прамысловая рэвалюцыя прадоўжыць тэндэнцыю выцяснення з рабочых месцаў людзей. Дзяржаўным уладам прыйдзецца адпаведна гэтым скарачэнням рэалізоўваць сацыяльныя праграмы новых працоўных месцаў. Асаблівая роля адводзіцца інстытуту прадпрымальніцтва. З ім звязваюцца магчымасці развіцця сектару паслуг, пераходу людзей у сферу турызму, рэкламнай дзейнасці, кансалтынгу, інжынірынгу, сектар карпаратыуных паслуг. На рынку інжынернай дзейнасці вырасце вартасць праектнай, канструктарскай, тэхналагічнай кампаненты з улікам прафесійных кампетэнцый у галінах аўтаматызацыі і робататэхнікі. Важную ролю адыгрываць кампутаравае дызайн-праектаванне і імітацыйнае мадэляванне. У інжынернай дзейнасці выкарыстоуваецца цэлая сістэма

спецыялізаваных кампутаравых праграмаў з функцыямі праектавання, рашэння творчых задачаў, кіравання і кантролю.

Тэхнагенная катастрофа на Чарнобыльскай АЭС паставіла на нейкі час пад сумнеў перспектывы выкарыстання патэнцыялу ядзерных даследаванняў у мірных мэтах. Пачаліся пошукі шляхоў звязаных з мадэрнізацыяй ужо існуючай энергетычнай сістэмы, аснову якой фарміруюць цеплавыя электрычныя станцыі. На базе Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэту зфарміравалася школа даследчыкаў, якая цесна супрацоўнічае з інстытутам цепламасаабмену НАН Беларусі, БДУ. Сярод іх В. Анішчанка, У. Бубноў, Р. Есьман, Г. Жыхар, М. Караткевіч, Г. Кулакоў, Ю. Малевіч, Ю. Мулеў, А. Несянчук, У. Новаш, Р. Паспелаў, Т. Паспелава, Ф. Раманюк, К. Сцепанчук, М. Стралюк, В. Федзін, Б. Фіраго.

Пошукі эфектыунага выкарыстання альтэрнатыуных крыніцаў энергіі вядуцца на кафедры ЮНЭСКА, якая функцыянуе ў складзе БНТУ. Накірунак узначальвае В. Баштавы. У сувязі з будаўніцтвам Беларускай АЭС адноўлена падрыхтоўка ў БДУ і БНТУ спецыялістаў для атамных станцыяў. Беларускія энергетыкі актыўна ўзаемадзейнічаюць з МАГАТЭ, паколькі пытанні бяспекі і экалогіі адыгрываюць важную ролю пры рэалізацыі праектаў у галіне энэргетыкі. Беларусь з’яўляецца актыўнай удзельніцай міжнароднай праграмы па ўстойліваму развіццю. Канцэпцыя гэтай праграмы была распрацавана ў 1992 годзе ў Рыя-дэ-Жанейра (Бразілія) пад час канферэнцыі ЮНЭСКА. У свеце гэтай канцэпцыі важную ролю адыгрывае інжынерная экалогія. Яна займаецца пытаннямі распрацоўкі тэхналогій безадыходнай вытворчасці, утылізацыі, рэкультывацыі, шматразовага выкарыстання матэрыялаў і энергіі, ачысткі, рэцыклінгу. Гэта пытанні актуальныя для горнай інжынерыі, камунальнай гаспадаркі, сельскагаспадарчай вытворчасці, хімічнай прамысловасці, архітэктуры горада.

Узмацненне гуманітарнай кампаненты ў інжынернай дзейнасці абумоўлена тэхнізацыяй сектару медыцынскіх паслуг. У аперацыйных на выснове канвергенцыі лазэрных і кампутаравых тэхналогіяў выкарыстоўваюцца комплексы аператыўнай хірургічнай дапамогі, дыягностыкі, кантролю за пасляаперацыйным перыядам аднаўлення арганізму. Распрацаваны і пастаянна мадэрнізуюцца прыстасаванні для інвалідаў. Выкарыстоўваюцца тэхналогіі электроннай рэгістрацыі, электроннай кансультацыі, аператыўнага выкліку хуткай дапамогі. Высокім узроўнем інжынернай

кампаненты характэрызуецца стаматалагічны сектар і сектар касметычнай хірургіі. З медыцынскімі тэхналогіямі звязана спартыўная інжынерыя, якая закладвае ў канструктарскія рашэнні фактар максімальнай бяспекі карыстальнікаў трэнажораў. На гэта арыентавана інжынерыя спартыуна-забаўляльных культурных аб'ектаў. Пытанні бяспекі востра стаяць перад інжынерыяй гандлева-забаўляльных цэнтраў.

Міністэрства надзвычайных сітуацыяў сканцэнтравала ў сваей структуры інжынерную кампаненту звязаную з робататэхнікай, спецыяльнай тэхнікай маніторынгу і мінімізацыі наступстваў катастрофаў, аварый, прыродных з'яў.

### *3.6. Філасофія гуманізму і сацыяльныя тэхналогіі гістарычнай памяці*

Якія б задачы грамадства не вырашала яно абапіраецца на рэсурсы гістарычнай памяці. Гэтыя рэсурсы дазволілі Беларусі пад час распаду СССР захаваць прамысловасць, агарарную вытворчасць, сістэму адукацыі, сацыяльныя праграмы. Была забяспечана перайм альнасць працы беларускага народу, чалавечага капіталу. Створаныя папярэднімі пакаленнямі беларусаў інфраструктура і камунікацыі сталі прадметам мадэрнізацыі.

Асаблівы накірунак палітыкі гістарычнай памяці беларускай дзяржавы складае філасофія гуманізму ў выглядзе памяці аб мільенах загінуўшых грамадзян Беларусі пад час Вялікай Айчыннай вайны. Акупацыя краіны нямецкімі войскамі суправаджалася масавым знішчэннем насельніцтва згодна расавай тэорыі непаўнацэннасці народаў Усходняй Еўропы. У ліку спаленых весак не толькі Хатынь, але і тысячы яе сясцер па трагічнаму лесу. Шмат людзей, у тым ліку дзяцей было знішчана ў канцэнтрацыйных лагерах. Мемарыяльныя комплексы нагадваюць аб вялікай трагедыі. На тэрыторыі Беларусі створаны комплексы мужнасці салдатаў, афіцэраў Савецкай Арміі і партызанаў. Аб мужнасці нагадваюць назвы вуліцаў, плошчаў. Дзень Незалежнасці Беларусі прымеркаваны да Дня вызвалення сталіцы і большай часткі краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Сумесныя даследаванні беларускіх і расійскіх філосафаў з удзелам кафедры філасофскіх вучэнняў БНТУ дазволілі актуалізаваць такі рэсурс сумеснай гістарычнай памяці народаў як сямейны фатаграфічны альбом. Фотаздымкі захоўваюць візуальную сямейную

памяць аб трыдцатых-саракавых гадах ХХ стагоддзя. Фотаздымкі сталі асноўнай кампанентай візуальнай сямейнай памяці аб загінуўшых членах сям'і, аб памерлых ветэранах.

У структуру сацыяльных тэхналогіяў гістарычнай памяці важная роля належыць дзейнасці спецыяльных пошукавых атрадаў Беларусі і Расіі. Яны вывучаюць асаблівасці ваеннага адзення розных арміяў каб у палявых умовах хутка распазнаваць па артэфактам знаходак прыналежнасць загінуушых да пэўнага гістарычнага часу. Пасля апазнання астанкі загінуўшых воінаў перазахоўваюцца з удзелам грамадскасці, блізкіх людзей, мясцовых жыхароў. У гэтых мерапрыемствах удзельнічае Беларуская праваслауная царква ў структуры якой ваенныя храмы і вайсковыя могілкі заўседы адыгрывалі важную ролю. Яшчэ адным накірункам пошукавай дзейнасці сталі архівы.

У структуры гістарычнай памяці важную ролю адыгрывае культурная спадчына і звязаная з ею палітыка беларускай дзяржавы ў галіне культуры. За адносна кароткі час, нягледзячы на значныя траты ў галіне экалогіі, абумоўленыя тэхнагеннай катастрофай на Чарнобыльскай АЭС, незалежная Беларусь уклала значныя сродкі ў аднаўленне палацавага комплексу ў Нясвіжы, замкавых – у Міры, Лідзе. Рэканструяваны Аугустоўскі канал. У сталічным мегаполісе адноўлена цэнтральная гістарычная тэрыторыя, якая стала прасторай культуры і турызму. Архітэктары БНТУ актыўна ўдзельнічаюць у рэалізацыі дзяржаўных праграм рэканструкцыі помнікаў культуры.

Вяртанне да хрысціянскіх каштоўнасцей стварыла архітэктарам магчымасць рэалізацыі прафесійных здольнасцей у новай для іх сферы. Адноўлены праваслаўныя храмы, касцелы. Пабудаваны новыя храмы. Дзяржава падтрымлівае царкву і касцел з улікам таго, што яны ўзялі на сябе важную задачу сацыяльнай працы, духоўнага выхавання, захавання традыцый.

У сферы мастацкай культуры аб'ектамі рэканструкцыі сталі амаль усе тэатральныя будынкі. Дастаткова нагадаць аб будынку тэатру оперы і балету. Узведзены ўнікальны сцэнічны комплекс у Віцебску для правядзення штогадовага фестывалю. Дзякуючы агратурызму набыла вартасць драўляная архітэктура малой радзімы, прадстаўленая вескамі.

Дзякуючы падтрымцы дзяржавы рэалізаваны праекты па накірунку беларускага касцюма (слуцкія паясы), рэканструкцыі

тэкстау эпохі Сярэдневечча, у тым ліку Бібліі. Гэта рарытэтныя выданні, якія дзякуючы сучасным тэхналогіям сталі даступнымі для масавага чытача.

Гістарычная памяць адлюстроўвае спартыўныя дасягненні Беларусі. Дзякуючы гэтаму сучасная беларуская дзяржава стварыла ўсе ўмовы не толькі для падрыхтоўкі спарцменаў, але і пабудавала ўнікальную спартыуна-масавую інфраструктуру. Гэта спартыўныя манежы, комплексы, стадыены. Беларусь набыла вопыт правядзення міжнародных спаборніцтваў. На спартыуна-тэхнічным факультэце БНТУ рыхтуюць спецыялістаў, здольных забяспечваць спартыўна - тэхнічную базу аздараўленчых цэнтраў.

Яшчэ адным накірункам гістарычнай памяці стала здароўе беларускага народу. Захоўваць яго прыходзіцца ва ўмовах пастаянных пагроз ваенных канфліктау і наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Беларуская дзяржава вымушана была акцэнтаваць праблему дэмаграфічнай бяспекі краіны. З гэтай мэтай у медыцыну прыйшлі ўнікальныя тэхналогіі дыягностыкі, хірургічнага ўмяшальніцтва. Генная інжынерыя стала элементам не толькі ратавання жыцця за кошт донарскіх органау, але і біятэхналагічных падыходаў канструктарскай накіраванасці. Мае месца канвергенцыя традыцыйнай і сацыяльнай інжынерыі. У гэтай сувязі актыўна абмяркоўваюцца пытанні біяэтыкі (В. Мішаткіна, Э. Фонатава). Дзяржава спрыяе дэмаграфічнай палітыцы сацыяльнай падтрымкай сям’і.

### *3.7. Філасофія чалавечай цялеснасці: метадалогія фізічнага выхавання і спартыўна-тэхнічнай дзейнасці*

Відавочны змены ў сацыяльным становішчы фізічнай культуры і спорту. Фізічнач культура стала элементам паўсядзеннага жыцця, вольнага часу. Гэтаму спрыяе гарадская інфраструктура рэкрэацыйных, аздараўленчых цэнтраў, сістэма арганізацыі спартыўных святаў, спартыўныя камунікацыі. Пасіўная прысутнасць на стадыенах змянілася актыўным вобразам жыцця. Гэтаму спрыяе тэхнічная база трэнажораў, пракату лыжаў, канькоў, ровараў, ролікаў.

Спорт стаў інтэграваны з парадыгмай чалавечай цялеснасці. Гэтая парадыгма разглядае чалавека ў цэласнасці спартыўных фізічных магчымасцяў чалавека з псіхалагічнымі, духоўна-валявымі, камунікатыўнымі фактарамі спорту як сацыяльнага дзеяння, утрымліваючага кансалідуючую, патрыятычную кампаненту

гордасці за краіну, за яе прадстаунікоў у спорце. На важнасць разгляду чалавечай цялеснасці ў катэгорыях філасофскай антрапалогіі ўказвае Т. Буйко.

Эпоха Адраджэння павярнула еўрапейскае грамадства да чалавека, да яго цялеснасці. Вяртаннем да антычнай філасофіі адбыўся паварот да медыцыны чалавечага цела. Абстрактнае эстэтычнае захапленне прыгажосцю чалавечага цела паступова дапаўнялася асэнсаваннем здароўя чалавека ў катэгорыях сацыяльнай філасофіі. Эпідэміі, што знішчалі насельніцтва гарадоў стымулявалі даследаванне сувязі чалавека з навакольным асяроддзем, экалогіяй, паўсядзенным вобразам жыцця. Медыцынскія навукі зрабілі значны прарыў у ахове чалавека ад рызыкаў эпідэмій. Даследавалася псіхіка чалавека. На пачатку XX стагоддзя была адноўлена традыцыя алімпійскага руху. Яна павінна была спрыяць дамінанце спартыўнай канкурэнцыі над практыкай канкурэнцыі ў выглядзе войнаў.

Спорт у СССР разглядаўся як элемент патрыятычнай падрыхтоўкі абаронцаў Айчыны. Было створана спартыуна-тэхнічнае таварыства, якое ўключала масавы ахоп дзяцей і дарослых на ўзроўні здачы нарматываў фізічнай культуры. Важная роля адводзілася спартыуна-тэхнічнай творчасці. Была створана база суполак тэхнічнай творчасці. Медыцыне адводзілася ключавая роля ў маніторынгу стану здароўя насельніцтва. Праводзілася масавая вакцынацыя насельніцтва. Была створана сістэма медыцынскіх установ, у тым ліку, даследчай накіраванасці.

Па меры росту матэрыяльных рэсурсаў тэхнагеннай цывілізацыі, пераходу яе на ўзровень грамадства ўсеагульнага карыстання расла роля сферы паслуг. Актуальнай стала сфера арганізацыі масавых мерапрыемстваў. Адной з такіх сфераў стаў спорт. На пачатку XXI стагоддзя ва ўмовах чарговай спробы вярнуць сусветную супольнасць да часоў халоднай вайны чэмпіянат свету па футболу 2018 года паказаў, што спартыўная дыпламатыя з’яўляецца адной з самых эфектыуных дыпламатый. Рэспубліка Беларусь, пры непасрэдным удзеле Прэзідэнта дзяржавы, стала адной з краін гэтай дыпламатыі. На фоне вялікіх матэрыяльных стратаў, абумоўленых аварыяй на Чарнобыльскай АЭС, Беларусь не толькі захавалася спартыўную інфраструктуру, але і стварыла новую, адпавядаючую міжнародным стандартам алімпійскага камітэту. Гэта дазволіла праводзіць спаборніцтвы на высокім міжнародным узроўні. Пра-

фесійныя якасці дэманструе айчынны спартыўны мэнэджмент і маркетынг.

Медыцына інтэгравана ў спартыўна-аздараўленчую палітыку Рэспублікі Беларусь. Акрамя спорту яна курыруе адпачынак насельніцтва, ажыццяўляе прафілактыку захворванняў, аказвае дапамогу ў нялегкай барацьбе з цяжкімі захворваннямі. Мадэрнізаваны і пабудаваны ўнікальныя комплексы па профілю анкалагічных захворванняў. Санаторыі Беларусі сталі адной з галін турызму. Аздараўленча-лячэбныя функцыі яны спалучаюць з функцыямі міжкультурнага дыялогу, азнаямлення жыхароў свету з краінай азераў, лясоў, сялянскага быту.

Філасофія фармулюе асноўныя пазіцыі парадыгмы чалавечай цялеснасці, якія дэталююццца метадалогіяй навуковага пазнання фізічнай культуры і метадалогіяй пазнання спорту і аптымізацыі кіравання ім. Распрацавана метадалогія даследаванняў у галінах фізічнай культуры і спорту. Тэхналагічны аспект метадалогіі заснаваны на лабараторных даследваннях з выкарыстаннем спецыяльнага абсталявання, прыбораў. Важную ролю адыгрывае метадалогія дыягностыкі функцыянальнага стану спарцмена і таго, хто ідзе ў спартыўную залу дзеля рэкрэацыі, спартыўнай эстэтыкі, павышэння фізічных паказчыкаў цела.

Распрацаваны метады трэніровачнай, трэнерскай, спаборніцкай дзейнасці. Яны ўключаюць аналіз, эргаміку, матэматычнае мадэляванне, фізіялагічныя і біяхімічныя метады тэсціравання. Хімічны аналіз дазваляе кантраляваць пытанні спаборніцкай этыкі. Выяўляюцца прэпараты, якія даюць перавагу спарцмену ў вонкава аднолькавых умовах спаборніцтваў. Створана міжнародная сетка антыдопінгавага кантролю, у якую ўваходзяць нацыянальныя лабараторыі з адпаведным статусам. У выпадку выяўлення парушэнняў спартыўнай этыкі справы спарцменаў разглядаюцца алімпійскім камітэтам на выснове заключэнняў антыдопінгавых структураў.

Важную ролю пры разглядзе допінгавых пытанняў адыгрывае спартыўны арбітраж, які кіруецца пытаннямі прававой аховы годнасці спарцменаў і трэнераў. На важнасць аспекту спартыўнай годнасці ў сувязі з паняццем спартыўнага лідарства звяртае ўвагу М. Рысюкевіч. Спартыўны лідар у каманднай гульні адыгрывае ключавую ролю. Распрацавана класіфікацыя спарцменаў лідараў. Гэта лідар для сябе, лідар каманды, грамадскі спартыўны лідар. А. Мядзведзь, М. Мірны, Д. Домрачава даюць прыклад грамадскага

спартыўнага лідара, паколькі з імі звязана ўстойлівая асацыяцыя з поспехамі беларускага спорту, яго пазнавальнасцю ў свеце.

Лідара вылучае прафесіяналізм, патрыятызм, аптымізм, крэатыў, сіла волі, рашучасць. Лідэры спарцмены фарміруюцца ў прасторы спартыўнай школы пры непасрэдным удзеле трэнера лідэра. У Беларусі існуюць спартыуныя школы, якія валодаюць унікальнымі методыкамі падрыхтоўкі спарцменаў алімпійскага ўзроўню, пошуку патэнцыяльных лідэраў індывідуальнай і каманднай гульні. Выкарыстоўваецца метадалогія навуковага абгрунтавання стандартаў і праграм падрыхтоўкі спарцменаў.

Камерцыйныя інтарэсы ў спорце настолькі вялікія, што яны парадзілі феномен карупцыі спартыўных чыноўнікаў, лабіраванне інтарэсаў. Актуальнай стала тэма судзейскай этыкі, паколькі яна ўплывае на вынікі спаборніцтваў, асабліва калі спаборнічаюць спарцмены з фізічнымі абмежаваннямі. Этыка спарцмена не абмяжоўваецца допінгавымі пытаннямі. Яна прысутнічае на спартыўнай пляцоўцы. Такі ж спектр этыкі дзейнічае ў адносінах да трэнера.

Асобую праблему стварыла культура паводзінаў на стадыенах пад час футболу. На гэтыя паводзіны аказваюць уплыў радыкальныя рухі, а таксама псіхалогія натоўпу. Доўгі час праваахоўныя структуры не бачылі паміж імі сувязі. Праведзены аналіз паказаў, што патрэбны механізмы мінімізацыі рызыкаў у месцах масавага збору людзей. Прадметам даследаванняў С. Масленчанкі сталі субкультуры і контркультуры моладзі, як найбольш актыўнай сацыяльнай групы.

У Беларусі ўдалося пазбегнуць негатыунай ролі фактару натоўпу на стадыенах. Па факту аналізу рызык на стадыенах была распрацавана метадалогія адказнасці спартыўных клубаў не толькі за каманды, але і за групы падтрымкі гэтых камандаў. Праваахоўны органы і спецыяльныя структуры бяспекі распрацавалі мерапрыемствы маніторынгу рызык у месцах масавага накаплення людзей. Важную ролю адагрываюць мабільныя групы спартыўнай медыцыны, якія аказваюць першую дапамогу спарцменам і тым, хто яе патрабуе.

Поспех у спартыуных спаборніцтвах залежыць ад тэхнічнай спартыунай базы. Гэтыя задачы ўскладзены на спартыуна-тэхнічны факультэт Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэту. Распрацоўкі вядуцца з улікам медыцынскіх нормаў, адметнасцей ар-

ганізму чалавека. Увага надаецца тэхнічнаму забеспячэнню трэніровачнага працэсу. У выніку інжынерная канструктарская кампанента стала важнай складаючай спартыуна-аздараўленчага кластэра БНТУ. Такі ж цэнтр падрыхтоукі спартыўных кадраў існуе ва ўніверсітэце фізічнай культуры і спорту. Там рэалізуецца мадэль падрыхтоўкі трэнераў алімпійскага рэзерву. Надаецца ўвага падрыхтоўцы настаўнікау фізкультуры.

Пад увагу бярэцца гендэрны аспект і праблема трансфармацыі мускуліннасці. Звярнулі ўвагу на тое, што было вядома і раней. Жаночы арганізм матываваны да паўнацэннага і больш працяглага жыцця фактарам нараджэння дзяцей і адказансці за іх здароўе і сацыялізацыю. Гэты фактар робіць жаночы арганізм устойлівым да ўнутраных крызісаў. Мужчынскі арганізм ва ўмовах урбанізацыі, кампутарызацыі аказаўся па за межамі тых фактараў, што вызначалі яго мужнасць. Рызыкі стварылі алкагалізм, наркатрафік, схільнасць да экстрэмальнага авантурызму, пасіуны вобраз жыцця, маларухомасць. На алімпійскіх спаборніцтвах жаночая беларуская каманда дэманструе паказчыкі ў медальным заліку. Мужчыны такімі паказчыкамі менш радуюць.

Гендэрныя фактары ўлічваюцца ў тэорыі фізічнай падрыхтоўкі чалавека, у тым ліку спарцменаў. Пачатак гэтай працы звязаны са спартыўнай адапталогіяй. Яна базіруецца на спартыунай фізіялогіі. Выкарыстоўваюцца мадэлі мышцаў, сардэчнага рытму, нярвовай актыўнасці пад час нагрузак. Не адмяняецца вартасць агульнай тэорыі здароўя чалавека (валеялогіі). Нагрузкі могуць ствараць рызыкі здароўя. Прафесійны спорт – гэта перыяд калі арганізм і псіхіка чалавека знаходзяцца ў пастаянным напружанні.

Аздараўленчыя мерапрыемствы на ўзроуні фізічнай культуры патрабуюць таксама кантролю. Здаровы лад жыцця з’яўляецца штодзеннай філасофіяй, якая дэтэрмінуе набор дзеянняў, форм адпачынку і камунікацыяў. Гэта сістэма каштоўнасцей, якая дае перспетыву не толькі арганізму чалавека, але і яго цялеснасці.

### *3.8 Філасофія і метадалогія кагнітыўных навук*

Адным з накірункаў сучаснай канструктарскай інжынерыі штучнага інтэлекту стала імітацыйнае мадэляванне працэсаў, што маюць месца ў мозгу чалавека. Гэтыя даследаванні павінны спрыяць распрацоўцы кампутаравых праграмаў, якія будуць весці сябе падобна паўсядзеннаму вобразу жыцця сучаснага чалавека з улікам ка-

мунікатыўных сувязей з другімі людзьмі і сацыяльным асяроддзем. Рашэнне гэтай задачы дазволіць робатам узяць на сябе розныя функцыі паўсядзеннага жыцця людзей з улікам іх прафесійнай дзейнасці. Пад уплывам пастаянна мяняючыхся сітуацыяу камунікацыі кампутаравыя праграмы вымушаны мець рэсурс мабільнай самаадукацыі каб дасягнуць адэкватнай рэакцыі на візуальнае інфармацыйнае ўздзеянне. Усюды ўваходзіць здольнасць распазнавання інфармацыі і вобразаў, аперажальны ўлік адметнасцяў удзельнікаў камунікацыі. Гэта значыць, што кампутаравая праграма павінна мець не толькі аналаг ключавых словаў для пабудовы тэкстаў, але і разумовую выснову катэгарызацыі інфармацыі ў тэрмінах прававой, маральна-этычнай, тэхнічнай, ментальнай нормы. Праблему стварае лакальнасць ментальнай нормы. Адна і тая ж норма можа мець моўныя і візуальныя культурныя мадыфікацыі. Нормы могуць утрымліваць розныя колькасныя параметры. Кампутаравая праграма можа сутыкнуцца з дэвіантнымі паводзінамі людзей, якія не адпавядаюць прынятым у грамадстве нормам.

Паусядзенныя формы свядомасці чалавека абазначаюцца як кагніцыя. Яны ўключаюць маніпуляцыі з ведамі, інфармацыяй з улікам ментальных адметнасцей, характэрных для свядомасці чалавека. Псіхалогія і логіка цесна звязаны з прагматыкай. Сінтэз дае паняцце таго, як людзі думаюць і як мова ўплывае на змест думання і яго дэманстрацыю. Механізмы сацыяльнай адаптацыі, грамадскай думкі, жыццевай стратэгіі і тактыкі, камунікацыі ствараюць феномен нормы, які абазначаецца як фрэйм, шаблон, алгарытм, інварыянт.

Кагнітыўная парадыгма атрымала дысцыплінарную мадыфікацыю ў выглядзе кагнітыўнай псіхалогіі, антрапалогіі, кампутаралогіі, кагнітыўнай лінгвістыкі, нейрафіласофіі, нейрамаркетынгу. Кагнітыўная лінгвістыка вывучае ментальныя адметнасці разумення чалавекам інфармацыі і яе прадстаўлення ў выглядзе ключавых словаў і сказаў – тэксту ў форме вербальнай і пісьмовай мовы. Бяруцца пад ўвагу адметнасці пабудовы вобразаў. Кагнітывістыка вывучае стылістыку пабудовы тэкстаў у адпаведнасці з выпрацаванымі сацыяльным асяроддзем схемамі камунікацыі. Пры гэтым прыходзіцца ўлічваць фактар кагнітыўнай інтэрпрэтацыі. Ен мадэлюецца як кагнітыўнае вылічэнне сэнсу думкі. Мадэліраванню спрыяе адметнасць чалавека не толькі ўспрымаць інфармацыю, але і актыўна яе сістэматызаваць на выснове катэга-

рыяльных светапоглядавых структураў (паттэрнаў). Гэтыя структуры фільтруюць інфармацыю. Яе вартасць падае, калі яна не адпавядае жыццевым мэтам індывіда. Напрыклад паттэрн прафесійнай дамінанты растауляе ў свядомасці студэнта вучэбныя дысцыпліны па іх практыкаарыентаванай вартасці.

Асноўным рэсурсам апрацоўкі інфармацыі з'яўляецца катэгарызаваны вопыт. Прадукт апрацоўкі інфармацыі прадстаўляецца сродкамі мовы. Кагнітыўная лінгвістыка даследуе свядомасць і мысленне ў формах мовы. Чалавек атрымлівае інфармацыю па розным каналам. Кагнітыўную лінгвістыку цікавяць толькі тыя, што звязаны з мовай. Акрамя функцыі атрымання інфармацыі мова выконвае функцыю прадстаўлення ведаў з улікам ментальных адметнасцей і працэсаў. Ментальнасць трансфармуе інфармацыю і стварае феномен яе трапеічнасці.

Кагнітыўная лінгвістыка даследуе адметнасці ўспрыняцця чалавекам інфармацыі, яе катэгарызацыі, класіфікацыі, акумуляцыі ведаў і іх выкарыстання чалавекам у працэсах дзейнасці і камунікацыі. Ментальнасць абумовіла фарміраванне ў структуры кагнітыунай лінгвістыкі псіхалінгвістыкі, этналінгвістыкі, сацыялінгвістыкі, лінгвакультуралогіі.

Кагнітыўная лінгвістыка распрацавала тэрміналагічны апарат аператыўных адзінак памяці чалавека. Фрэймы абазначаюць стэрэатыпныя сітуацыі, сцэнарыі, якія фарміруюць структуру вопыту. Канцэпты адлюстроўваюць сукупнасць сэнсаў, ахопліваемых словам. Гештальты адлюстроўваюць даразумовыя вобразы навакольнага асяроддзя. Вопыт на гэтай выснове фарміруе накіраванасць чалавека на інфармацыю (інтэнцыянальнасць).

Ментальнасць стварае групавыя і індывідуальныя адметнасці камунікацыі. У гэтай сітуацыі важную ролю адыгрывае інтэрпрэтацыя. Яна адлюстроўвае рэсурсы дыяпазону талерантнасці. Адным і тым жа словам могуць абазначацца розныя канцэпты канцэптуальнай схемы. Менавіта гэтая абставіна стала адной з прычын даследавання мовы ў антрапалагічным і пазнавальным кантэкстах.

Пазнавальная дзейнасць забяспечвае чалавека інфармацыяй, неабходнай для адаптацыі да сацыяльнага асяроддзя, для дасягнення канкрэтных мэтаў. Канцэпты ствараюць рацыянальную аснову камунікацыі. Калі асоба валодае канцэптуальным апаратам яна інтэгравана ў выпрацаваныя грамадствам катэгорыі і класы. Есць катэгорыя канцэптаў у форме ўніверсаліяў культуры (прастора, час,

лічба). Макраканцэпты адлюстроўваюць тапаніміку біясферы, напрыклад, стыхіі. Базавыя канцэпты свядомасці фарміруюць сістэму каштоўнасных каардынатаў (Радзіма, дом). Мікраканцэпты адлюстроўваюць аспекты паўсядзеннага спалучэння працы, адпачынку, свята.

На фарміраванне метадалогіі кагнітыунай лінгвістыкі ўплыў аказала інжынерная навука штучнага інтэлекту. За выснову ўзята падабенства кампутара і чалавека пры апрацоўцы інфармацыі. Мае месца пакрокавая апрацоўка інфармацыі. З тэорыі інфармацыі ўзяты канцэпты інфармацыі і структуры ведаў, апрацоўкі інфармацыі і захавання яе ў памяці, рэпрэзентацыі інфармацыі ў свядомасці чалавека і формах мовы. З філасофіі ўзяты пытанні аб тым, як чалавек пазнае, якія звесткі становяцца ведамі, як фарміруюцца ментальныя прасторы. У выніку выпрацавана фундаментальная тэза аб мысленні як маніпуляванні фрэймамі, планамі, сцэнарыямі, мадэлямі, канцэптамі.

Падобнай пазіцыі прытрымліваецца кагнітыўная псіхалогія. Згодна гэтай навукі ключавой здольнасцю мозгу чалавека з'яўляецца ўменне класіфікацыі і катэгарызацыі прадметаў і з'яў жыцця. Катэгорыі маюць мадыфікацыю ментальных канцэптаў, фарміруючых доўгатэрміновую памяць. Вылучаны накірунак інтэлектуальных задачаў распазнавання вобразаў, разумення тэксту, прадстаўлення, захавання, пошуку, апрацоўкі інфармацыі і алгарытмаў.

